Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 СТУДЗЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР № 17 (28381)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Карціну Шышкіна знайшлі ў Ждановічах**

СТАР. 4

Сямейная газета



**Звярніце ўвагу на чалавека!**



**Цікавыя факты з гісторыі пошты**

СТАР. 9

# ПРЭМ'ЕРА НА ЛЁДЗЕ



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю:**

*«У мінулым годзе Камітэтам дзяржкантролю праведзены праверкі ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у выніку чаго ўдалося стабілізаваць сітуацыю на рынку ЖКП. Гэтая работа працягнецца і сёлета ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы. Мы павінны трымаць руку на пульсе. Не ўсе праблемы вырашаны ў ЖКГ. Павышэнне тарыфаў на паслугі ЖКГ на $5 у год павінна азначаць, што для канкрэтнага чалавека гэтае павышэнне і складае азначаную суму, а, скажам, не $10 і больш. Вось чаго мы не павінны дапусціць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.01.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9286 | ▼ |
| Еўра | 2,0676 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0708 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

17017>

9 771990 763008

■ Ёсць праблема

## НА ЛАНЦУЖКУ

### Чаму гараджане, якія трымаюць сабак, парушаюць закон?

**Ларыса падабрала калматага дварняка, якога назвала Манюняй, на аўтастаянцы каля супермаркета «Гіпа». Проста ўбачыла яго, і ўздрыгнула сэрца. Жанчына элементарна пашкадавала сабаку, ды і чужых дзяцей, на вачах якіх таго магла ў любы момант раздушыць чыясьці машына. Пакідаць у сябе не планавала, але нікуды ўладкаваць не атрымалася — ну, не выкідваць жа зноў бедную жывёліну на вуліцу! Так і засталася Манюня ў цёплай кватэры, стаўшы паўнапраўным членам сям'і. Але, як толькі сабака пасяліўся ў доме, аказалася, што Ларыса стала парушальніцай закона...**

«Два разы на дзень, раніцай і ўвечары, я выводжу Манюню на прагулку, — расказвае Ларыса. — Бяру з сабой шуфлік і пакет, усё як належыць. Выгульваць сабаку вяду ў размешчаны непадалёк лесапарк Мядзведжына. Так, там стаяць таблічкі: выгул сабак забаронены. Але куды яшчэ весці жывёліну? Ёсць пляцоўка для выгулу, але яна абсалютна непрыдатная для гэтых мэт, там усё паламана! Яна не агароджана, а знаходзіцца, між іншым, побач з дзіцячай пляцоўкай. Невядома, дзе яна пачынаецца і дзе заканчваецца, — па якім перыметры там выгульваць сабаку. Ды і, каб патрапіць туды, трэба ехаць на грамадскім транспарце некалькі прыпынкаў. А ў сабакі свае патрэбы, ён цярпець не будзе...»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Сітуацыя, да болю знаёмая практычна кожнаму гараджаніну, які мае сабаку... І правакуе нямала канфліктаў. У спрэчкі з Ларысай і іншымі сабачнікамі, што выгульваюць сваіх гадаванцаў у лесапарку, нярэдка ўступаюць аматары прагулак і прабежак. Яно і зразумела, усе ведаюць, як на бегуна звычайна рэагуюць сабакі. А калі жывёла яшчэ без ланцужка... Даходзіла да таго, што асобныя аматары спорту здымалі ўсё на відэа і пагражалі міліцыяй.

СТАР. 3

■ Сітуацыя

## НА ЗАЙЗДРАСЦЬ АСТАПУ БЭНДЭРУ,

### або Узаконены прыватны рэкет

**Мэта любой арганізацыі, у тым ліку і камерцыйнай, — атрыманне прыбытку. І нічога дрэннага ў гэтым няма. Але ж іншая справа, якімі метадамі яна дасягаецца....**

Работнікі гандлю Пухавіцкага раёна пачалі скардзіцца на частыя праверкі крам старшыні раённай арганізацыі абароны правоў спажыўцоў Васілю Валасюку. Маўляў, дакуль твае людзі будуць нас шантажыраваць? Васіль Міхайлавіч тлумачыў, што яго арганізацыя па заканадаўстве можа праводзіць праверкі толькі па афіцыйнай заяве пакупніка. Але апошнім часам такіх зваротаў не было. Разам з тым яго зацікавіла гэтая сітуацыя, і ён пачаў сваё расследаванне. Высветлілася, што кантралёры — прадстаўнікі прыватных фірмаў, накшталт «Спажывецкі нагляд», «Спажывецкая падтрымка», «Спажывецкая ініцыятыва». Менавіта вытворнае ад слова «спажывец» і ўвяло ў зман гандляроў.

І хоць гэтыя арганізацыі афіцыйна зарэгістраваныя, іх метады і паўнамоцтвы рэвізораў выклікаюць пытанні: 300 праверак з пачатку гэтага года толькі ў адным Пухавіцкім раёне. Ці не занадта? Вядома, сачыць за тэрмінам прыдатнасці прадуктаў, патрабаваць дакументы, якія пацвярджаюць якасць, законам не забаронена. Права на гэта ёсць у кожнага пакупніка. У чым жа асаблівасць працы зарэгістраваных народных рэвізораў?

— Яны заходзяць у краму і амаль што з парога заяўляюць: мы будзем вас правяраць. Вось так проста, без прадастаўлення дакументаў. Мы ў шоку, — кажа **прадавец адной з пухавіцкіх крам Аліна ЛІЧЭ.**

Мэта візіту змагароў за якасны тавар — далёка не толькі праверка гандлёвых кропак на наяўнасць пратэрмінаванага тавару. Сутнасць перш за ўсё ў атрыманні прыбытку.

СТАР. 4

■ Парламенцкі дзённік

# ЗАКАНАТВОРЧАСЦЬ, АНАЛІЗ ПРАБЛЕМ І МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

## Чым будуць займацца дэпутаты сёлета

**Галоўнай падзеяй, безумоўна, стане правядзенне 26-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ, але цікавым мерапрыемствам з'яўляюцца і парламенцкія слуханні. Сёлета яны пройдуць двойчы: падчас вясновай сесіі слуханне будзе прысвечана барацьбе з наркотыкамі, падчас восеньскай — нацыянальнай сістэме адукацыі. Учора ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу абмеркавалі планы на бягучы год.**

**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу**, у сваім выступленні падкрэсліў, што важную ролю ў павышэнні якасці заканадаўчай дзейнасці выконвае маніторынг заканадаўства.

— Звярстаны даволі напружаны план міжнароднага супрацоўніцтва, — дадаў спікер Палаты прадстаўнікоў. — Ужо ў пачатку года будзе вельмі інтэнсіўны абмен візітамі на высокім парламенцкім узроўні. Гаворка ідзе пра сустрэчы з кіраўніцтвам парламентаў Казахстана, Кітая, Кыргызстана, Пакістана, Польшчы, Чэхіі.

У пачатку ліпеня наша краіна ператворыцца ў адну з галоўных палітычных пляцовак свету ў сувязі з правядзеннем у Мінску сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

— Шэраг задач па падрыхтоўцы сесіі ўжо вырашаны, — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка. — Вызначана тэма і звярстаны праект праграмы, акрэслены асноўныя контуры галоўных мерапрыемстваў. На зімовым пасяджэнні ПА АБСЕ 23—24 лютага пройдзе прэзентацыя Беларусі ў якасці краіны — гаспадыні летняй сесіі.

Што да падрыхтоўкі законапраектаў, то зараз у ніжняй палаце на разглядзе знаходзіцца 36 такіх дакументаў. «У першым чытанні на другой сесіі мы разгледзім 17 законапраектаў, у другім — 16. І будзе дэкрэт кіраўніка дзяржавы», — расказаў журналістам **Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў.**

Паводле яго слоў, вялікі блок законапраектаў рэгулюе эканамічныя адносіны. «Найбольш важная задача ў краіне — паправіць эканоміку, таму што мы апошнія два гады, як кажуць эканамісты, дастаткова сур'ёзна праселі. Безумоўна, нам трэба вярнуцца на траекторыю росту, што непасрэдна звязана з павышэннем дабрабыту насельніцтва. Задача кіраўніком дзяржавы пастаўлена — у 2017 годзе выйсці на ўзровень зарплаты $500 у эквіваленце», — сказаў Баляслаў Піргштук.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Урад

# ЗАНАДТА РАСПІЯРЫЛІ

**Намеснік прэм'ер-міністра Васіль ЖАРКО пракаментаваў выпадкі анафілактычнага шоку пасля ўвядзення «Цэфтрыаксону».**

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што ў краіне выкарыстоўваецца больш за 5 мільёнаў ампул гэтага прэпарата. Столькі ж адпраўляецца на экспарт. Тых 20—25 рэакцый на прэпарат, якія былі адзначаны ў 2016 годзе, не з'яўляюцца чымсьці ўнікальным. «Гэтыя выпадкі (што адбыліся ў 2017 годзе) занадта распіярылі. Нельга насельніцтва запалохваць. Міністэрства аховы здароўя прыняло ўсе меры: пачынаючы з таго, што парэнтэральнае ўвядзенне павінна быць толькі ў стацыянарах, у прысутнасці медработніка», — сказаў намеснік прэм'ер-міністра. На амбулаторным этапе перавагу аддаюць таблецпіраванай форме прыёму антыбіётыкаў.

Міністэрства аховы здароўя прыпыніла выкарыстанне серый антыбіётыка «Цэфтрыаксон», пры ўвядзенні якога былі зарэгістраваны рэакцыі ў выглядзе анафілактычнага шоку. Зараз правяраецца якасць прэпарата ў адпаведнасці з заканадаўствам. У Міністэрстве аховы здароўя створана адпаведная рабочая камісія. Алергічныя рэакцыі былі, ёсць і будуць, сказаў віцэ-прэм'ер. У анатацыі любога лекавага сродку пазначаны пабочныя эфекты. Іх не так шмат, іншая справа, што трэба быць гатовымі да аказання дапамогі грамадзянам пры іх узнікненні. Самае галоўнае — не страціць хворага, упэўнены Васіль Жарко. Адпаведная работа праведзена ва ўсёй сістэме Міністэрства аховы здароўя. Кожны медработнік на любым узроўні робіць усё, каб выратаваць жыццё, пераканаыы ён.

Намеснік прэм'ер-міністра ў чарговы раз нагадаў, што прыём антыбіётыкаў павінен быць прызначаны лекарам, неабходна пазбягаць самалячэння.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Грошы

# «Па пяцьсот»

## атрымлівае кожны сёмы работнік

Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, удзельная вага работнікаў з заробкам вышэй за тысячу рублёў складае 13,2 працэнта. Больш за 2000 рублёў мае толькі 1,8 працэнта спецыялістаў і рабочых. Да 300 рублёў у месяц атрымлівае 14,5 працэнта супрацоўнікаў.

Разам з тым намінальная налічаная заработная плата беларусаў у снежні склала ў сярэднім амаль 802 рублі (прыкладна на 12 працэнтаў больш, чым у лістападзе). А сярэднестатыстычны бюджэтнік атрымліваў 608 рублёў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Соцыум

# Задача па заробку павінна быць выканана

**Пра гэта заявіла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля КАЧАНАВА падчас сустрэчы з калектывам Слуцкага цукроварафінаднага камбіната. У сталіцы ўзровень сярэдняй заработнай платы ў $500 ужо дасягнуты. У цэлым па краіне ў снежні 2016 года сярэдняя зарплата склала 801 рубель.**



Фота БЕЛТА.

— Заработная плата ў сярэднім па краіне павінна быць $500. Гэтая задача, пастаўленая кіраўніком дзяржавы, павінна выконвацца беспярэчна. І сёння гэта задача не толькі для ўрада, міністэрстваў і ведамстваў, але і для кожнага кіраўніка кожнай арганізацыі, — адзначыла Наталля Качанава.

Іншай тэмай сустрэчы стала работа прадпрыемстваў у Год навукі. Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця на 2016—2020 гады, якая будзе зацверджана ў найбліжэйшы час, вызначыць прыярытэтныя кірункі развіцця навукі, а таксама паставіць задачы па засваенні новых тэхналогій у розных галінах эканомікі. Асаблівая ўвага пры гэтым будзе нададзена прымяненню інавацый у вытворчасці.

— Зазначаем, што гэты год будзе пераломным у рабоце навуковых арганізацый, перш за ўсё Нацыянальнай акадэміі навук. Бо інавацыйнае развіццё, якое пазначана прыярытэтным для Беларусі, немагчыма без сучасных навукова-тэхнічных распрацовак, — адзначыла Наталля Качанава.

Айчынныя вучоныя ўжо дамагліся вышынь у сферы касмічных і інфармацыйных тэхналогій, машынабудаванні, медыцыне. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта адзначыла развіццё фармацэўтычнай галіны. Доля нашых прэпаратаў на айчынным фармрынку павялічваецца, з'яўляюцца новыя беларускія лякарствы. Гэта не толькі аналагі імпартных, але і арыгінальныя распрацоўкі. Напрыклад, прэпарат для лячэння раку крыві. Наталля Качанава адзначыла, што важна, каб падобных унікальных распрацовак было больш і ў іншых навуковых сферах.

Яшчэ адзін прыярытэт — пашырэнне ўзаемадзеяння навучальных устаноў з прадпрыемствамі. Гэта дае магчымасць яшчэ ў ВНУ набыць працоўныя навыкі ў абранай прафесіі. Асаблівую ўвагу Наталля Качанава ўдзяліла пытанням развіцця навукі ў вышэйшых навучальных установах.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Прафтэхшкола

# Новыя магчымасці

**«У сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі трэба выкарыстоўваць новыя магчымасці шматканальнага фінансавання», — заявіў у Магілёве на пасяджэнні рэспубліканскага Савета дырэктараў устаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.**

У развіцці пазабюджэтнай дзейнасці ўстаноў прафесійнай адукацыі ў сучасных умовах з'явіліся новыя магчымасці і задачы. Гэта і навучанне новым спецыяльнасцям дарослых людзей, і павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў. Патрэба ў такой падрыхтоўцы на рынку працы расце, адкрываючы новыя магчымасці для ўстаноў адукацыі, перш за ўсё праз арганізацыю дадатковай адукацыі дарослых.

**На думку першага намесніка міністра, сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі працуе даволі эфектыўна па развіцці пазабюджэтнай дзейнасці.** У краіне ёсць навучальныя ўстановы, дзе больш за палову бюджэту складаюць даходы, атрыманыя ад пазабюджэтнай дзейнасці. Яны накіроўваюцца на развіццё і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальных устаноў, дазваляюць пашыраць спектр платных адукацыйных паслуг, асвойваць новыя віды вытворча-гаспадарчай і іншай дзейнасці.

Пэўныя перспектывы для развіцця пазабюджэтнай дзейнасці ёсць і ў арганізацыі шостага школьнага дня. Тут ужо прасочваецца нядрэнная дынаміка. Каля 45 тысяч школьнікаў задзейнічаны ў суботу ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Вадзім Богуш падкрэсліў: «Ні адна прафесійная навучальная ўстанова ў суботу не павінна быць закрытай. У нас дастаткова магчымасцяў, каб такую работу арганізаваць. Формы дзейнасці самыя разнастайныя: гэта і сустрэчы па інтарэсах, і гурткі. Прычым, функцыянаванне гурткоў можна наладзіць у тым ліку на платнай аснове».

— Уменне кіраўнікоў знаходзіць дадатковыя сродкі фінансавання важнае, але пры гэтым на другі план не павінна адыходзіць ажыццяўленне непасрэдна адукацыйнага працэсу, — дадаў Вадзім Богуш.— Не варта забываць, што прафесійна-тэхнічная навучальная ўстанова выконваюць яшчэ і вельмі важную адукацыйную і сацыяльную функцыю. Гэта іх асноўнае прызначэнне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# Вялікі патэнцыял

## Гэтымі днямі Беларусь і В'етнам адзначаюць 25-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін

**У Мінску ўрачыстая цырымонія, прысвечаная даце, прайшла ў Доме дружбы. Тут сабраліся актывісты таварыства Беларусь—В'етнам, прадстаўнікі беларускага ўрада, члены парламента, дыпламаты.**

Пасол В'етнама ў Беларусі Ле Ань зачытаў прысутным віншаванне кіраўніка яго дзяржавы з нагоды юбілейнай даты ў двухбаковых дыпламатычных адносінах. У сваю чаргу, міністр прамысловасці Віталь Воўк зачытаў віншаванне Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Абодва прэзідэнты выказвалі ўпэўненасць у тым, што нашы краіны будуць і надалей развіваць узаемавыгаднае супрацоўніцтва, бо В'етнам і Беларусь звязаны паміж сабой моцным сяброўствам двух народаў, краіны каардынуюць і падтрымліваюць адна адну на міжнароднай арэне.

Спадар Ле Ань, іншыя выступоўцы падкрэслівалі, што паступова гандлёва-эканамічныя адносіны паміж Беларуссю і В'етнамам набываюць устойлівую тэндэнцыю росту. Сёлета пастаўлена амбіцыйная задача — давесці тавараабарот паміж дзвюма краінамі да 500 млн долараў ЗША. Эканамічны патэнцыял краін, пакупніцкая здольнасць В'етнама (за апошнія 10 гадоў краіна ў пяць разоў павялічыла імпарт (з 3 да 14 млрд долараў ЗША) дазваляе яе вырашыць. І, трэба думаць, што 500 мільёнаў — не мяжа ва ўзаемным гандлі.

Новыя магчымасці адкрыла падпісанне пагаднення аб зоне свабоднага гандлю паміж В'етнамам і краінамі ЕАЭС. Дакумент прадугледжвае зніжэнне або адмену мытных пошлін на шэраг тавараў, паляпшэнне ўмоў для інвестыцый, трансграничнай гандлю таварамі і паслугамі. І не толькі з В'етнамам. Але і з краінамі Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН), членам якой з'яўляецца В'етнам. У Асацыяцыю ўваходзяць краіны з насельніцтвам амаль 500 мільёнаў чалавек. Пагадненне дазваляе праз В'етнам бяспошлінна выходзіць на іх велізарны рынак.

Падчас урачыстага мерапрыемства пасол Ле Ань уручыў в'етнамскі ордэн Дружбы экс-паслу Беларусі ў В'етнаме Валерыю Садоху — пяць апошніх гадоў менавіта Валерый Яўгенавіч узначальваў наша дыппрадстаўніцтва ў В'етнаме. У многім дзякуючы яго намаганням беларуска-в'етнамскія адносіны ў розных сферах выйшлі на якасна новы ўзровень. Плённая праца дыпламата не засталася незаўважанай кіраўніцтвам В'етнама. Яго Прэзідэнт Чан Дай Куанг прыняў рашэнне ўзнагародзіць пасла ордэнам Дружбы.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## НА СУВЯЗІ — КІРАЎНІКІ РЭГІЁНАЎ

Як і раней па суботах, на сувязі з насельніцтвам — Мінскі гарадскі і абласныя выканаўчыя камітэты. Час працы застаецца нязменным — звярнуцца з просьбай або прапановай наўпрост да прадстаўніка ўлады можна з 9 гадзін раніцы і да поўдня. Прамыя тэлефонныя лініі ў краіне сталі рэгулярнымі ў пачатку 2015 года. З таго часу магчымасцю вырашыць праблемныя пытанні аператыўна і без лішняй папяровай валакіты скарысталіся многія беларусы.

**28 студзеня на званкі будуць адказваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні САКОЎСКІ Віктар Яўгенавіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПРЫВАЛАЎ Уладзімір Аляксандравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні БУБЕНЧЫК Алена Аляксандраўна (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
старшыня Савета дэпутатаў ПАНАСЮК Васіль Васілевіч (80172224444).

■ Прарыўныя інавацыі

# ПАКАЗАЦЬ ВЫНІКІ І РАЗВІВАЦЬ ІНФРАСТРУКТУРУ

## Якія задачы стаяць перад вучонымі сёлета?

**Дні беларускай навукі пройдуць у Маскве перад адкрыццём Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Пра гэта напярэдадні прафесійнага свята расказаў старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр ШУМІЛІН. Паводле яго слоў, сам форум таксама будзе прысвечаны інавацыйнаму навукова-тэхналагічнаму супрацоўніцтву вучоных дзвюх краін. Ужо цяпер прапрацоўваецца пытанне аб прапанове кіраўнікам дзяржаў на зацвярджэнне як мінімум трох новых саюзных праграм. Хутчэй за ўсё, імі стануць праекты ў сферы космасу, біятэхналогій і іншых перспектыўных кірункаў. Акрамя гэтага, у чэрвені ў амерыканскім Маямі ўпершыню пройдзе нацыянальная выстава навуковых дасягненняў Беларусі.**

— Што датычыцца нашых планаў на 2017 год, то ў першую чаргу гэта развіццё інавацыйнай інфраструктуры, — сказаў старшыня ДКНТ. — Яшчэ летась мы адкрылі новы навукова-тэхналагічны парк на базе Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама тры цэнтры трансферу тэхналогій у Віцебску, Гродне і Магілёве. Такім чынам мы імкнёмся прыцягнуць да навуковай дзейнасці нашы рэгіёны, каб ва ўсіх была магчымасць рэалізоўваць свае інавацыйныя праекты. Падтрымліваем таксама маладзёжныя праекты. Сёлета конкурс «100 ідэй для Беларусі» будзе фактычна інтэграваны ў Рэспубліканскі конкурс інавацыйных распрацовак, што дапаможа падтрымаць найлепшыя праекты, прадстаўленыя на ім.

Над развіццём інавацыйнай інфраструктуры сёлета будзе працаваць і Міністэрства адукацыі. Паводле слоў **першага намесніка міністра адукацыі Вадзіма БОГУША,** асаблівую ўвагу ведамства будзе надаваць развіццю ўніверсітэцкіх тэхнапаркаў. На гэтых пляцоўках моладзь зможа рэалізоўваць свае ідэі і арганізоўваць вытворчасць. Яшчэ адной задачай стане падтрымка маладых даследчыкаў і прыцягненне іх да навуковай дзейнасці. Ужо цяпер ва ўніверсітэтах функцыянуе больш за 200 навукова-даследчых студэнцкіх лабараторый, якія займаюцца даследаваннямі ў розных кірунках: ад гуманітарнай сферы і юрыспрудэнцыі да робататэхнікі і IT. Што датычыцца фінансавага заахвочвання, то ў 2017 годзе Міністэрства адукацыі плануе прыцягнуць дадатковыя сродкі і выдзеліць не менш за 100 грантаў для падтрымкі студэнтаў, аспірантаў і дактарантаў.

— Перад намі стаіць задача яшчэ больш умацаваць навуковую сферу, сканцэнтраваць рэсурсы на прыярытэтных кірунках даследаванняў і прапанаваць эканоміцы цэлы комплекс прарыўных інавацыйных распрацовак, — адзначыў **старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Мяркуецца, што вызначальнымі для свету стануць некалькі кірункаў: «воблачныя» тэхналогіі, аўтаматызацыя інтэлектуальнай працы, робататэхніка, самакіравальныя тэхнічныя комплексы (у тым ліку аўтамабілі), геноміка, найноўшыя накапляльнікі энергіі, трохмерны друк і кампазіцыйныя матэрыялы. Падкрэслю, што над усімі гэтымі тэмамі паглыблена працуе беларуская навука, а вынікі работы не саступаюць вядучым сусветным.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by* ■

■ За падзеяй

# Жыццё — як раман

## Мікалай ЧАРГІНЕЦ на сустрэчы з чытачамі расказаў пра свае лёс і кнігі

**З самага пачатку творчага шляху ён вырашыў, што будзе пісаць толькі пра тое, што перажыў сам. На яго долю выпала мноства выпрабаванняў, ён шмат друкаваўся ў прэсе, потым звярнуўся да буйных літаратурных жанраў. Сёлета старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец рыхтуецца адзначыць свой 80-гадовы юбілей. На яго рахунку больш як паўсотні кніг, высокія пасады і званне генерала. Але з чытачамі гутарыць заўсёды адкрыта і даверліва.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Таму і на сустрэчы, што прайшла ўчора ў магазіне «КнігаПоліс» ААТ «Белкніга», ён не пасаромеўся шчыра расказаць гісторыю свайго жыцця.

— Мы вырашылі распачаць год са спаткання з незвычайным аўтарам, — адзначыў падчас імпрэзы **дырэктар «Белкнігі» Аляксандр ВАШКЕВІЧ.** — Калі разгледзець ланцужок падрыхтоўкі кнігі, то на першай прыступцы знаходзіцца аўтар, а кнігарні ўжо завяршаюць яе шлях да чытача.

Героямі кніг Мікалая Чаргінца сталі людзі, якіх ён ведаў асабіста, з якімі пражыў суровыя гады і прайшоў мноства выпрабаванняў.

**Алена ПАШКЕВІЧ** ■

# НА ЛАНЦУЖКУ



Мадлен, прынцэса Швецыі, прыбірае за сваім сабакам.

### Ніхто не абаронены

Яшчэ адзін балючы момант тычыцца таго, што сабачнікі абавязаныя прыбіраць пасля сваіх гадаванцаў. У горадзе гэта цалкам нармальная мера. Уся Еўропа жыве па такіх правілах. Калі чалавек не выконвае гэтага прадпісання, то павінен быць пакараны. Але кім? Хто будзе гэта кантраляваць? Ніхто! Гэта нідзе не прапісана.

Калі побач раптам акажацца міліцыянер, то пры вялікай вашай настойлівасці ён можа скласці на парушальніка пратакол. І ўсё! На гэтым справа заглухне. Яна можа зрушыцца з мёртвага пункта хіба што тады, калі вы звернецеся ў суд. Але хто пойдзе падаваць заяву ў суд з такой нагоды? А між тым любая маці, прыходзячы ў дзіцячую паліклініку, бачыць маляўнічы плакат аб тым, што ў сабачых адходах могуць знаходзіцца паразіты, небяспечныя для здароўя...

Але вернемся да выгулу нашых чацвераногіх сяброў. Куды пайсці з сабакам? «Няма куды, — кажа Ларыса. — Вакол дома нельга — гэта прыдамавая тэрыторыя, на якой забаронена выгульваць жывёл. Пляцоўка далёка, не абсталяваная, ды і па ідэі яна патрэбна для занятკаў з сабакам, а для прагулак не падыходзіць. Паспрабуйце самі гуляць дзень пры дні па перыметры клеткі...».

Атрымліваецца, ніхто з нас — ні сабачнікі, ні тыя, хто скардзіцца на іх, — не абароненыя ў належнай меры.

### Патрэбны закон, які будзе працаваць

Многія з існуючых цяпер забарон для сабачнікаў не працуюць, таму што яны, па-першае, не забяспечаны належнай інфраструктурай і, па-другое, ніхто не сочыць за іх выкананнем. Нам патрэбен закон, у якім будзе выразна прапісана, дзе, у якіх умовах і якіх жывёл можна ўтрымліваць... І каб ён рэальна працаваў.

— Такі законапраект цяпер распрацоўваецца, — сцвярджае **старшыня Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Юрый ДАРАГАКУПЕЦ.** — Разлічваем прыняць яго ў першым чытанні гэтай вясной. У красавіку 2016 года было праведзена яго грамадскае абмеркаванне... Усяго за гэты час паступіла больш за тысячу прапаноў ад грамадзян.

Цяпер дзейнічаюць правілы ўтрымання свойскіх жывёл. У іх агаворана, што выгульваць сабак неабходна ў спецыяльна адведзеных месцах. Адміністрацыі раёнаў павінны дакладна вызначыць месцы выгулу сабак. У новым законапраекце гэта будзе прадугледжана. Таксама будзе прадугледжана чыпіраванне асабліва небяспечных парод. Лічу, што нашы людзі на цяперашні момант не гатовыя да паўсюднага чыпіравання свойскіх жывёл. Калі мы будзем прымушаць гэта рабіць, палова сабак і катоў апынецца на вуліцы. Іх выганяць, і бяздомных жывёл стане яшчэ больш...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

### У абаронцаў жывёл ёсць прапановы

**Старшыня праўлення дабрачыннага аб'яднання «Заашанс» Вольга КАРПАВА,** якая ўваходзіла ў рабочую групу па распрацоўцы закона аб абыходжанні з жывёламі, кажа: «Мы прапаноўвалі ўвесці павышаны падатак на нестэрылізаваных гадаванцаў, каб скараціць колькасць бяздомных жывёл. Так прынята ў большасці краін. Калі ваш гадаванец нестэрылізаваны, значыць, вы або атрымліваеце нейкі прыбытак ад яго, або проста ствараеце пагрозу мясцовому бюджэту, які аддае грошы на адлоў бяздомных, нікому не патрэбных жывёл. Так што такі крок здаецца разумным і рацыянальным. Аднак Міністэрства па падатках і зборах не падтрымала такую норму. Хоць у нас сёння велізарная праблема з бяздомнымі жывёламі. Іх адлоўліваюць і жорстка забіваюць нярэдка на вачах у дзяцей.

У нас наогул можна забіць жывёлу, і ў абсалютнай большасці выпадкаў вам нічога за гэта не будзе. І ў нашым грамадстве, аказваецца, нямала жывадзёраў. Мне даводзілася бачыць жывёл, у якіх была здзёртая скура...

Мы таксама прапаноўвалі рэгістрацыю з дапамогай чыпіравання, каб мець магчымасць ідэнтыфікаваць кожную жывёліну. Думаю, кожны ўладальнік у стане «адшкадаваць» адзін раз 10 долараў у эквіваленце на чып для свайго гадаванца, які будзе выкарыстоўвацца на працягу ўсяго жыцця жывёлы. Гэта не такія вялікія траты. І ад дзяржавы чыпіраванне не запатрабуе ніякіх капіталаўкладанняў — трэба будзе толькі стварыць сервер і вылучыць адну працоўную адзінку на ўсю краіну — чалавека, які будзе гэтым займацца.

На Захадзе ўсе жывёлы чыпіраваныя і ў большасці сваёй стэрылізаваныя. У гэтым выпадку чалавек не зможа выкінуць свайго гадаванца на вуліцу — з дапамогай чыпа яго імгненна «вылічаць» і ён атрымае велізарны штраф.

### І сабачнікі падцягнуцца...

У Еўропе забарон, звязаных з жывёламі, мінімум. Там можна зайсці з сабакам нават у краму ці рэстаран, з ёю можна шпацыраваць па парку, прычым без намордніка... Іншая справа, што ўладальнік павінен сачыць за сваім гадаванцам, каб той не ствараў ніякіх нязручнасцяў навакольным людзям. І там уладальнікі сабак адказна ставяцца да іх выхавання. Яны разумеюць, што ў выпадку чаго заплацяць велізарны штраф, а потым яшчэ дадаткова за курсы дрэсіроўкі жывёл, якія іх абавязкова прымусяць прайсці.

У нас жа, нават калі мы прымем закон, — няма нікога, хто б сачыў за яго выкананнем. ЖКГ гэтым відавочна займацца не будзе. Гэта значыць, трэба, акрамя самога закона, прымаць дакументы, якія рэгламентавалі б выкананне.

**Нам патрэбен закон, у якім будзе выразна прапісана, дзе, у якіх умовах і якіх жывёл можна ўтрымліваць... І каб ён рэальна працаваў.**

Але калі закон будзе працаваць, то ўладальнікі сабак «падцягнуцца» пад яго выкананне. Вось у нас цяпер вельмі дысцыплінаваныя пешаходы, але так было не заўсёды. Калі сталі штрафаваць людзей, якія пераходзяць на чырвонае святло, то і з'явіліся тыя самыя законапаслухмяныя пешаходы, якія мы сёння. Тут тая ж сістэма. Калі дзяржава зверне ўвагу на праблемы сабачнікаў, пакажа сваю зацікаўленасць, то ў нас будуць дысцыплінаваныя ўладальнікі сабак. Ну, а калі будуць усё дзіцца абмежаванні ці забароны, але не з'явіцца рэальных умоў для іх выканання, то незадаволенасць будзе толькі расці. І грамадзяне вымушаны будуць штодня парушаць закон.

На працягу ўсёй гісторыі людзі жылі побач з жывёламі, і няма аніякіх прычын думаць, што цяпер яны адмовяцца ад гэтай звычкі. Многія сем'і заводзяць хатніх гадаванцаў, таму што хочуць, каб іх дзеці навучыліся дабрыні, клопату і міласэрнасці. А для кагосьці сабака або кошка можа стаць адзінай аддушынай, выратаваннем ад адзіноты. Чалавечая патрэба даваць і атрымліваць любоў і цеплыню невыкаранільная! Патрэбны толькі дакладныя правілы гульні, каб мы маглі ўтрымліваць сваіх свойскіх жывёл так, як гэта прынята ў цывілізаваных краінах.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

❍ ДАРЭЧЫ

## І аб падатку...

**Між іншым кожны гараджанін, які мае сабаку, павінен зарэгістраваць яе і аплаціць адпаведны падатак. Хоць павінен — яшчэ не значыць, што плаціць.**

Як заявіла нам **начальнік аддзела добраўпарадкавання, санітарнага стану і работы з насельніцтвам Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі Маргарыта ЯЗІНСКАЯ,** усяго ў сталіцы за мінулы 2016 год было выяўлена 299 незарэгістраваных сабак. Гэтая лічба грунтуецца на звестках з дзяржаўных ветэрынарных станцый, якія абавязаны паведамляць у органы ЖКГ аб усіх незарэгістраваных жывёлах, з якімі да іх звярнуліся ўладальнікі.

Але, думаецца, рэальныя лічбы незарэгістраваных жывёл нашмат большыя, бо многія ўладальнікі сабак звяртаюцца ў прыватныя ветклінікі, якія ніякіх даных нікуды не адпраўляюць.

Каб скласці хоць бы прыблізнае ўяўленне аб тым, колькі незарэгістраваных жывёл можа пражываць у сталіцы, мы ў рэдакцыі вырашылі правесці невялікі эксперымент. Для гэтага палічылі колькасць сабак у адным з пад'ездаў шматкватэрнага жылога дома, размешчанага ў Савецкім раёне сталіцы. Іх аказалася шэсць. Затым мы пацікавіліся ў старшага майстра ЖЭУ №1 Савецкага раёна, якому належыць гэты дом, Ірыны Кот, колькі сабак зарэгістравана ў гэтым пад'ездзе. Аказалася, усяго адзін!

Калі ўявіць, што ў сярэднестатыстычным пад'ездзе пражывае дзесьці пяць-шэсць незарэгістраваных сабак, і ў кожным доме, напрыклад, 6 такіх пад'ездаў, то акажацца, што ў адным толькі доме можа налічыць каля 30 няўлічаных жывёл. А цяпер уявім сабе, колькі дамоў у амаль двухмільённым горадзе...

«Большасць уладальнікаў жывёл не плацяць падаткі прынцыпова, хаваючы сваіх сабак, — упэўненая гераіня нашага артыкула Ларыса. — Але калі б яны бачылі, што грошы ідуць на стварэнне пляцовак для выгулу, людзі б плацілі гэты падатак. Таму што большасць уладальнікаў жывёл любяць сваіх гадаванцаў».

«Праблема ў тым, што падаткі, якія плацяць уладальнікі сабак, а дакладней не плацяць, не ідуць на жывёл, — кажа Вольга Карпава. — Яны паступаюць перш за ўсё на ўтрыманне «Фауны горада» — арганізацыі, якая займаецца адловам жывёл, іх ўтрыманнем і эўтаназіяй».

■ На слыху

# КАРЦІНА ШЫШКІНА Ў... ЖДАНОВІЦКІМ ГАРАЖЫ



І. Шышкін. «Лес. Елкі»

**Выкрадзенае з расійскага музея палатно знойдзена ў Беларусі**

**Супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Беларусі спынілі дзейнасць міжнароднага канала па пастаўцы какаіну, экстазі і гашышу. Пры затрыманні ў зламысніўкаў канфіскаваны буйная партыя наркотыкаў і карціна вядомага рускага мастака Шышкіна, паведамілі ў МУС.**

У канцы мінулага года аператыўнікі атрымалі інфармацыю аб групе асоб, якія арганізавалі пастаўку наркотыкаў і псіхатропаў з Расіі ў Беларусь. Праваахоўнікам стала вядома, што чакаецца пастаўка чарговай партыі наркотыкаў з Расіі і адначасова вяртанне ў Маскву нястаноўленай дарагой карціны, — расказалі ў МУС. Затрыманне адбылося, калі наркотык прыбыў у Беларусь і было вызначана яго месцазнаходжанне, а таксама месца сустрэчы кур'ераў, што маюць дачыненне да перапраўкі карціны. У гаражы, які арандаваў арганізатар крымінальнага бізнесу, 36-гадовы жыхар аграгарадка Ждановічы, было знойдзена і канфіскавана 552 таблеткі экстазі, амаль 250 грамаў какаіну і звыш 300 грамаў гашышу. У аўтамабілі кур'ераў аператыўнікі выявілі карціну з подпісам «І. Шышкін. 1897 г.». Выказаўшы здагадку, што гэта можа быць арыгінал, правервылі ўсе арыенціроўкі і накіравалі запыт у Інтэрпол. Падазрэнні пацвердзіліся. Карціна мастака І.І. Шышкіна «Лес. Елкі» (1897 год, палатно, алей, памер 60х82 см) была выкрадзена ў 2013 годзе невядомымі асобамі з Вязнікоўскага гісторыка-мастацкага музея ва Уладзімірскай вобласці Расійскай Федэрацыі.

Паводле папярэдняй інфармацыі, карціну «Лес. Елкі», якая да гэтага неаднаразова выстаўлялася на нелегальных інтэрнэт-аўкцыёнах, прывезлі ў Беларусь, каб паказаць патэнцыйнаму пакупніку з Еўропы, аднак бакі не сышліся ў цане і здзелка не адбылася. Літаральна на наступны дзень палатно павінны былі даставіць у Маскву і прадаць там грамадзяніну адной з краін ЕС за 100 тысяч еўра і 3 кілаграмы какаіну. Кошт гэтай карціны, паводле ацэнак спецыялістаў, на аўкцыёнах можа дасягаць двух мільёнаў долараў, але паколькі легальна збыць яе немагчыма, зламыснікі гатовыя былі прадаць твор за суму, нашмат ніжэйшую за рэальную. Карціна перададзена ў Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, спецыялісты якога папярэдне прызналі яе сапраўднасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# НА ЗАЙЗДРАСЦЬ АСТАПУ БЭНДЭРУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як толькі ў рукі кантралёраў трапляе няякасны тавар, у адрас прадаўцоў гучаць пагрозы: паведамім у санстанцыю.

— Санстанцыя, дарэчы, за парушэнні ўмоў захоўвання прадуктаў дае велізарныя штрафы: 800—1000 рублёў, — адзначыў Васіль Валасюк. — Тады падзеі разгортваюцца па адпрацаванай схеме. Рэвізоры патрабуюць пералічыць на рахунак арганізацыі 75 рублёў за курсы, якія яны прапануюць для прадаўцоў. І людзі пагаджаюцца, лепш адкупіцца такім чынам, чым нажыць непрыемнасці на сваю галаву. Вучоба, вядома, справа добраахвотная. Аднак кантралёры імкнуцца «зацікавіць» нязгодных плацiць за павышэнне кваліфікацыі.

— Дайшло да таго, што давялося выклікаць міліцыю, каб даказаць: я ў адэкватным стане на рабочым месцы. А пачалося ўсё з таго, што сказала ім: выклічу начальства з канторы, — кажа **загадчыца адной з крамаў Святлана ТОЎКАЧ.**

Па словах Васіля Валасюка, калі кіраўнік гандлёвага аб'екта адмаўляецца плаціць, то падключаецца цяжкая артылерыя — «правільныя» спажыўцы. Аказваецца, у камерцыйных структур на «службе» ёсць і такія. Яны прысутнічаюць падчас праверак і гатовы напісаць скаргу ў Кнігу заўваг і прапаноў або паведаміць пра нейкія негатыўныя факты ў санстанцыю.

Здараецца, што і самі народныя рэвізоры рыхтуюць сабе поле для праверак. У прыватнасці, прадаўцы магазіна «Еўраопт» у Міханавічах зафіксавалі на відэакамеру жанчыну, якая падкідвала на паліцу пратэрмінаваны сырок. Гэта былая работніца санстанцыі, прадаўцы ведаюць, дзе яна жыве, яе імя і прозвішча. Калі яе злавілі на месцы злачынства, то выклікалі міліцыю. У выніку яна атрымала штраф і больш не займаецца нячыстай справай.

Менавіта Васіль Міхайлавіч параіў работнікам гандлю здымаць народных кантралёраў на відэа, не паддавацца шантажу або тэлефанаваць яму.

Ён неадноўчы быў сведкам такіх праверак.

— Рэвізор расплацілася за прадукты, якія доўга выбірала. Дрожджы аказаліся ўсохлымі на 2 грамы, а ёгурт пратэрмінаваны. Па законе спажывец, які пранёс пакупку за касу, павінен запатрабаваць у касіра вярнуць грошы, калі лічыць, што прадукт сапсаваны. Пасля адмовы зрабіць гэта ён можа скардзіцца кіраўніку гандлёвай арганізацыі. Аднак кантралёры-прыватнікі адразу ідуць да кіраўніка гандлёвага аб'екта, — расказаў Васіль Міхайлавіч. — Акрамя таго, дырэктара або загадчыка крамы прымушаюць заключыць дагавор на аказанне паслугі як з фізічнай (а не юрыдычнай) асобай. Таксама парушэнне. Як і тое, што яны бяруць грошы за паслугу, якая яшчэ не аказана. Бо толькі тады, калі грошы паступаюць на рахунак кампаній, яны паведамляюць аб даце правядзення семінара. Гэта супярэчыць Закону аб абароне правоў спажыўцоў, разлік за паслугу павінен быць пасля яе прадастаўлення. Акрамя таго, парадак планавых і пазапланавых праверак строга рэгламентаваны Указам Прэзідэнта №510 «Аб удасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь». Падчас праверкі кантралёр павінен прад'явіць прадпісанне, зрабіць адпаведны запіс у кнізе ўліку праверак. Разам з тым тут пералічваюцца арганізацыі, якія маюць на гэта права. На сённяшні дзень, як стала вядома, зарэгістравана 35 камерцыйных арганізацый пад рознымі назвамі з выкарыстаннем вытворнага ад слова «спажывец», якія праводзяць маніторынг у гандлі. Толькі за апошні час Пухавіцкі раён наведалі 20 фірмаў, якія правялі 200 праверак без дакументальнага афармлення. А цяпер задумаемся, што такое маніторынг гандлёвых аб'ектаў? Гэта праверка, якая павінна праводзіцца пры наяўнасці скаргі спажыўца. Калі наводле выніку маніторынгу складзены акт або пратакол аб адміністрацыйным парушэнні, то магазін мае права звярнуцца ў адпаведныя інстанцыі альбо ў суд. Правяраючыя могуць даць прадпісанне аб ліквідацыі недахопаў на працягу 14 дзён. Патрабаванне не выканана — да кіраўніцтва прымяюцца адміністрацыйныя меры.

Толькі за перыяд з 1 чэрвеня па 1 верасня 2016 года такія арганізацыі заключылі 359 дагавораў з «Еўраоптам Мінск-2» і атрымалі 29 291 рубель. «З 13 па 16 снежня 2016-га, — адзначыў Васіль Міхайлавіч, — гандлёвыя аб'екты Мар'інай Горкі правяраў дырэктар аднаго з таварыстваў з абмежаванай адказнасцю. Апошні дагавор на правядзенне семінара значыцца пад нумарам 1289. Памнажаем на 75 рублёў і атрымліваем 96 675 рублёў. Ніхто не адмовіцца ад такіх грошай».

— 24 лістапада мяне па тэлефоне выклікалі ў магазін «Залатая рыбка» ў Мар'інай Горцы, — працягвае наш суразмоўца. — Мне паведамілі, што краму правярае нейкая незразумелая арганізацыя . Я параіў усе дзеянні здымаць на відэа. Калі прыехаў, папрасіў рэвізораў паказаць дакументы дырэктару магазіна, прад'явіць заяву ад спажыўца з прэтэнзіяй па якасці тавару, зрабіць запіс у кнізе праверак. На што дама-рэвізор адказала: «Мы вас закапаем, калі не будзеце аплачваць курсы перападрыхтоўкі».

Усе гэтыя факты, дакументы Васіль Міхайлавіч выклаў на прыёме грамадзян, які праводзіў у Мар'інай Горцы старшыня Мінаблвыканкама Сямён Шапіра. Кіраўнік вобласці назваў гэта ўзаконеным прыватным рэкетам і загадаў разабрацца з дзейнасцю такіх арганізацый: чым зарабляюць, чым жывуць. Ён распарадзіўся падрыхтаваць адпаведныя дакументы, інфармацыю, якую перадасць на разгляд кіраўніку дзяржавы.

Пасля таго як сітуацыя стала прадметам публікацый у сродках масавай інфармацыі, аналагічныя скаргі ад гандлёвых работнікаў сталі паступаць з іншых абласцей. У прыватнасці, з Гродзенскай і Віцебскай.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*


Остров чистоты

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Романтический бум в «Острове чистоты»!»

**1. Сведения об организаторе.**

Частное торговое унитарное предприятие «ЗападХимТорг» (Далее Организатор).

УНП 590828925. Зарегистрирован решением Гродненского облисполкома от 16.01.2008 г. №2-р. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей №590828925.

Местонахождение Организатора: ул. Комсомольская, д. 42А, к. 1, 231335, Гродненская область, Ивьевский район, д. Липнишки, Республика Беларусь.

Почтовый адрес: ул. Каховская, д. 70а, пом. 8, 220068, г. Минск.

**2. Наименование Рекламной игры.**

«Романтический бум в «Острове чистоты»!».

**3. Территория проведения.**

Дискаунтеры «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.

**4. Сроки проведения.**

01.02.2017 - 18.05.2017 (включая период розыгрыша и вручения призов).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель:

Смаль Арина Олеговна, ЧТУП «ЗападХимТорг», руководитель отдела маркетинга.

Члены комиссии:

1. Самусев Артем Сергеевич, ООО «ЗападХимИнвест», специалист по маркетингу.
2. Немкевич Екатерина Анатольевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», маркетолог.
3. Короткевич Анастасия Евгеньевна, ЧТУП «ЗападХимТорг», юрисконсульт.
4. Ширинова Ольга Францевна, ООО «Торговая компания Ромакс», начальник отдела ВЭД.

**6. Перечень продукции, участвующей в Игре.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж продукции ТМ «Черный жемчуг», «DOVE», «CAMAY», реализуемой в дискаунтерах «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

К участию в Рекламной игре не допускаются члены комиссии.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях родства.

Для участия в Игре необходимо в период с 1 февраля 2017 года по 31 марта 2017 года включительно:

1. Совершить покупку товаров продукции ТМ «Черный жемчуг», «DOVE», «CAMAY» на сумму более 10 (десять) белорусских рублей в одном чеке в сети дискаунтеров «Остров чистоты» на территории Республики Беларусь.
2. Заполнить анкету участника в магазине на кассе, указав:
• фамилию, имя, отчество;
• возраст (полных лет);
• город;
• телефон для связи с указанием кода города либо кода мобильного оператора;
• почтовый адрес, индекс;
3. Приложить копию чека к анкете.
4. Вернуть заполненную анкету кассиру магазина.

К участию в Розыгрыше не допускаются лица, не указавшие свои ФИО, возраст, город, телефон для связи с указанием кодов, почтовый адрес и индекс.

Заполняя анкету Организатора, участники подтверждают факт ознакомления и полное согласие с правилами проведения данной Рекламной игры.

Участнику необходимо сохранить оригинал кассового чека вплоть до окончания Рекламной игры.

Анкеты, не соответствующие правилам данной Рекламной игры, в Рекламной игре не участвуют.

Организатор не несет ответственности за несвоевременное или некорректное предоставление информации, запрашиваемой в анкете, или отсутствие оригинала кассового чека при получении приза.

Определение участников Рекламной игры, соответствующих настоящим Правилам, производится по каждой заполненной анкете с высланной копией чека.

В случае если одно физическое лицо совершило несколько покупок, соответствующих настоящим Правилам, физическое лицо фиксируется в качестве участника Игры соответствующее количество раз, каждый раз заполняя анкету участника.

**8. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.**

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 15274,65 (Пятнадцать тысяч двести семьдесят четыре) рубля 65 копеек с НДС и включает следующие призы:

| № п/п | Наименование | Кол-во, шт. | Цена за ед., бел. руб. с НДС | Всего, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Кофемашина электрическая т.м. PHILIPS SAECO. Кофемашина 2100 EASYCAP 8654/59 и денежное вознаграждение | 5 | 885 | 4425 |
| | | 5 | 115,65 | 578,25 |
| 2 | Велосипед дорожный для взрослых Aist Jazz 1.0 и денежное вознаграждение | 10 | 210 | 2100 |
| | | 10 | 14,79 | 147,90 |
| 3 | Самокат Sundays SA-401-2 черный с оранжевым и денежное вознаграждение | 5 | 132,22 | 661,10 |
| | | 5 | 3,17 | 15,85 |
| 4 | Самокат Sundays SA-401-1 белый с оранжевым и денежное вознаграждение | 5 | 132,22 | 661,10 |
| | | 5 | 3,17 | 15,85 |
| 5 | Кухонный комбайн Bosch MUM 4406 и денежное вознаграждение | 20 | 270 | 5400 |
| | | 20 | 23,76 | 475,20 |
| 6 | Подарочный набор Черный жемчуг «Гармония» (Мицеллярная вода Черный жемчуг для лица, век и губ 200 мл + Гель для душа «Романтик» Camay 250 мл) | 100 | 7,944 | 794,40 |

**9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**

Розыгрыш призов состоится 18 апреля 2017 года в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Сторожовская, 15, комната переговоров.

**9.1. Порядок проведения розыгрыша.**

Для проведения розыгрыша используется лототрон и анкеты участников.

За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

Определение выигрышных номеров получателей призов происходит путем случайного вытаскивания анкет из лототрона.

Призовой фонд разыгрывается в обратной последовательности, указанной в п. 8.

**10. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.**

Участники-победители, выигравшие призы, будут уведомлены о выигрыше посредством почты и телефонного звонка до 24 апреля 2017 года включительно.

Победители могут получить призы при предъявлении паспорта (вида на жительство и т.п. документов, подтверждающих личность победителя и/или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности) и оригинала кассового чека на покупку товаров, по предварительной договоренности в офисе Организатора по адресу: г. Минск, ул. Каховская, 70а, пом. 8, с 25 апреля по 18 мая 2017 г. с 10.00 до 16.00 в рабочие дни.

Организатор самостоятельно исчисляет и удерживает из суммы денежной части призов сумму подоходного налога победителя в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

В случае отказа победителя от получения приза или неполучения приза в установленные сроки и в установленном порядке (например, утеря или отсутствие оригинала кассового чека при получении приза), победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускается.

Участники Игры, претендующие на получение призов, обязуются: заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, предоставить Организатору необходимые сведения. В случае невыполнения указанного условия Организатор имеет право отказать в выдаче призов.

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором и связанные с получением приза.

Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе на радио, телевидении, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения данной Рекламной игры.

Все права, в т. ч. исключительные имущественные права на такие интервью и результаты съемки, будут принадлежать Организатору.

**11. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.**

Настоящие правила подлежат опубликованию в газете «Звезда» до начала Рекламной игры.

Результаты подлежат опубликованию в газете «Звезда» до 24.04.2017 года.

**12. Общие условия Рекламной игры.**

Принимая участие в Рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.

Налогообложение призов производится в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону «горячей линии» (8017) 335-07-06 с 10:00 до 17:00 в рабочие дни, а также на сайте www.ostrov-chistoty.by.

Свидетельство №2916 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 13 января 2017 года Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.



# НЕ БУДЗЕМ ПРА КАХАННЕ ГАВАРЫЦЬ...

*— Форэст, ты ўжо выбраў, кім станеш, калі вырасцеш?*
*— А хіба я не буду самім сабой?*
**к/ф «Форэст Гамп».**

Днямі я вырашыла прагуляцца перад сном. Іду, любуюся на заснежаныя дрэвы, што зіхацяць пад святлом ліхтароў. Раптам цішыню парушыў гучны крык: «Та-а-аня, я цябе каха-а-а-ю!» Калі падышла бліжэй, убачыла хлопца з вялізным букетам руж у руках. Я пастаралася прайсці міма Танінага акна як мага хутчэй. Але тое напорыстае прызнанне ў каханні даносілася да маіх вушэй яшчэ некалькі хвілін.

Раніцай па дарозе на працу ўбачыла чырвоныя ружы... у сметніцы, непадалёк ад Танінага дома.

Сем гадоў таму пад маім акном таксама крычалі пра каханне. Але я, наіўная, верыла тым словам. І зноў і зноў разам з апраўданнямі прымала дзяжурныя ружы (якія ніколі не любіла) як выкуп за чарговае прабачэнне. Толькі потым зразумела, што каханне не церпіць тлумачэнняў. Яму патрэбныя ўчынкі.

На людзях ён — узорны муж. Мала таго, што высокі, прыгожы, з машынай, дык яшчэ і клапатлівы: і ручку падасць сваёй Светачцы, і дзверы прытрымае... Усе сяброўкі як адна ёй зайздросцілі. Зайздросцілі, бо не ведалі, што дома, калі ніхто не бачыць, яго быццам падмяняюць. Варта Светачцы затрымацца з працы на 5 хвілін ці загаварыцца на вуліцы з суседкай, то месца ў доме не знойдзеш. Прычым узорны муж крыкамі не абмяжоўваецца, можа і руку падняць... Што б яна ні рабіла — усё яго раздражняе. Даходзіць нават да камічнага: забараніў ёй правярыць нажом, ці зварылася бульба (лічыць, што трэба рабіць гэта відэльцам). Потым, вядома, каецца, тысячны раз кажа: «Як жа я цябе кахаю!» Але неўзабаве зноў паўтараецца тое ж самае.

Заўважыла, што ў многіх сем'ях людзі ўспрымаюць сваіх блізкіх як уласнасць, прагнуць «перакроіць» партнёра пад сябе (але той, хто хоча змяніць іншага, як правіла, сам нават і не думае мяняцца). Тым самым падмяняюць каханне эгаізмам.

Неяк мне адна «мудрая» знаёмая сказала: «Колькі ты будзеш перабіраць жаніхоў?! Выберы кагосьці больш-менш прыдатнага, а потым зменіш яго пад сябе». Я не хацела нікога змяняць, таму, напэўна, і выйшла замуж адноса позна па сучасных мерках.

Сёння я ўдзячна свайму мужу, што дазваляе мне заставацца сабой. Паважае мае жаданні і свабоду выбару. Гэта для мяне асноўная прыкмета сапраўднага кахання. А змяняць іншага чалавека, як паказвае жыццё, няўдзячная справа. Адзіны правільны шлях — мяняцца самой. І тады, магчыма, і чалавек, з якім звязалі свой лёс, таксама захоча стаць крыху лепшым.

— Марта, скажы мне што-небудзь на развітанне, — папрасіў той самы Мюнхгаўзен, узбіраючыся па лесвіцы ў неба. — Заўсёды знойдзецца што-небудзь важнае для такой хвіліны!

— Я буду чакаць цябе.

— Не тое!

— Я вельмі кахаю цябе.

— Не тое!

— Я буду верная табе.

— Не трэба!

— Яны паклалі сыры порах, Карл! Яны хочуць перашкодзіць табе!

— Вось. Дзякуй, дзякуй, Марта. Хай зайздросцяць. У каго яшчэ ёсць такая жанчына?

Марта ведае, што факел, які яна трымае ў руках, заб'е Мюнхгаўзена. Але калі порах не выбухне, гэта будзе для яго страшней за смерць. Марце нічога не застаецца, як прыняць 32 мая і адпусціць Карла. І яна адпускае. Бо кахае...

Але... Не будзем пра каханне гаварыць. Паслухаем, што скажа нам каханне...

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

Сямейная газета
Выпуск № 2 (69)

■ Рабі, як мы

# Жанчынам уваход забаронены!

## Гомельскія таты праводзяць вечары ў спартзалах... разам з дзеткамі


Фота Надзеі БУЖАН.

Бацькі сваім прыкладам паказваюць, што такое здаровы лад жыцця.

**Год таму ў гомельскай школе №45 запусцілі ўнікальны праект — «ТатаЗала». Два разы на тыдзень, у аўторак і суботу, бацькі з маленькімі дзецьмі могуць бясплатна наведваць увечары спартыўную залу і праводзіць час за сумеснымі гульнямі. Жанчынам уваход строга забаронены. Кажуць, спрабавалі іх запрашаць, але дзеці, як толькі бачаць мам, пачынаюць капрызіць. Дый атмасфера ўжо не тая. Таму, пакуль таты вучацца заплятаць коскі і гуляюць у даганялкі, мамы могуць дазволіць сабе гадзіну шопінгу, басейна ці проста цішыні.**

### Адаптацыя да садка

Школьныя мячы хутка разбіраюцца. З лавак і мяккіх матаў бацькі будуюць міні-пляцоўку, на якую тут жа выстройваецца чарга з маленькіх непасед. Усе дзеці пры справе: хтосьці вісіць на «шведскай сценцы», хтосьці бегае па зале за вялікім абручом.

— Ці не перажываю я за школьную маёмасць? Тут разносіць асабліва няма чаго! — усміхаецца дырэктар школы №45 Канстанцін Кіржанаў, які сёння таксама ў зале разам з двухгадовай дачушкай Дарынай.

Па словах Канстанціна Кіржанава, гэты праект не толькі нагадвае татам пра іх сацыяльную ролю, але і дапамагае дзецям (секцыя разлічана на ўзрост ад 1 да 5 гадоў) адаптавацца да садка і школы. Малеча прывыкае быць у калектыве, вучыцца мірыцца і дзяліцца цацкамі.

— А жонка мая ў гэты час, напэўна, адпачывае. Хаця, я думаю, у жанчыны дома заўсёды знойдзецца работа, — кажа дырэктар.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

■ Жыццёвая гісторыя

# «Я ЧАЛАВЕК. ЗВЯРНІЦЕ НА МЯНЕ ЎВАГУ!»

## Як маці дзвюх малалетніх дачок змагаецца з анкалогіяй, былым мужам і неразуменнем чыноўнікаў

**Для 34-гадовай Ніны Акуневіч шумныя бальнічныя калідоры і людзі ў белых халатах — звычайная справа: у медустановах жанчына праводзіць большую частку жыцця. Да сустрэчы яна падрыхтавалася грунтоўна, пра што сведчыла вялізная зялёная папка з дакументамі. На галаве Ніны цяжка не заўважыць парык — вынік дзясятка хіміятэрапій і дваццаці пяці апраменьванняў. Час ад часу на яе вочы наварочваюцца слёзы. Але Ніна не плача. Яна не мае права плакаць: наперадзе — нявызначанасць з лячэннем і зацяжныя перапіскі з дзяржструктурамі з патрабаваннем сацжылля і аліментаў ад бацькі дзяўчатак.**

### «Гэта мой варыянт — разведзены, дзяцей яму не трэба»

«Маладая змена, якая падае надзеі», — так пісалі пра Ніну ў «Вячэрнім Мінску» за 2000 год. Тады яшчэ дзяўчына не ведала, што пра тэатр давядзецца забыцца, як і пра вучобу ва ўніверсітэце.

— Першы дыягназ мне паставілі ў 19 гадоў, — пачынае споведзь Ніна. — У адзін цудоўны дзень я не здолела ўстаць з ложка. Зрабілі КТ (камп'ютарную тамаграфію) і ў прадсценні сэрца выявілі злаякасную пухліну. Пасля — аперацыя, даўжэзны курс лячэння з васьмі хіміятэрапій і шасці апраменьванняў. Спачатку я паступіла ў камерцыйны інстытут, а потым на падрыхтоўчае аддзяленне ў Акадэмію мастацтваў. Пасля хваробы стала прафнепрыгоднай. З акадэміі адлічылі, з інстытута адправілі ў адпачынак.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*


Фота Антаніны ХАТЭНКІ.

# «Я — ЧАЛАВЕК. ЗВЯРНІЦЕ НА МЯНЕ ЎВАГУ!»


Ніна АКУНЕВІЧ з дзецьмі.
Фота Антаніны ХАТЭНКІ.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

Тады я была 90-60-90. Гэта цяпер распаўнела на гарманальных прэпаратах. Былі прыгожыя доўгія валасы. Не магла выйсці з пад'езда, каб нехта не звярнуў увагі. Маладога чалавека, якога сапраўды кахала, я пакінула. Мне сказалі, што жыць засталося тры месяцы. Не хацелася яму жыццё ламаць. Памятаю, сяброўка, якая выводзіла мяне з дэпрэсіі пасля хваробы, пацягнула на дыскатэку. Мы праходзілі міма кафэ, і я сустрэлася вачыма з будучым мужам. Ён быў старэйшы за мяне на 17 гадоў. Я падумала: гэта «мой варыянт» — разведзены, дзяцей яму не трэба.

Нараджаць мне не дазвалялі пяць гадоў пасля хіміятэрапіі, але я зацяжарыла ўжо праз 11 месяцаў. Першыя роды былі вельмі складаныя, сэрца не спраўлялася. Але ў выніку атрымалася мая першая лялька з блакітнымі вачыма. Калі даведалася, што будзе другое дзіця, то прыняла рашэнне разысціся з мужам. Справа ў тым, што ён ніколі не зарабляў грошы. Калі ў яго штосьці з'яўлялася, то ўсё ішло на асабістыя патрэбы. Ён з Каўказа. Ездзіў на радзіму па 2-3 разы на год, нас ніколі з сабой не браў.

— Я пачала сябе дрэнна адчуваць пасля другіх родаў. Проста рак грудзей доўга развіваецца. Усе перажыванні за апошнія гады нагадалі сябе. У мінулым годзе выявілі трэцюю стадыю хваробы, з метастазамі.

Пасля разладу з мужам Ніна засталася з малечай на руках. Маладая мама па стане здароўя не магла ўладкавацца на працу, але знайшла выйсце — зарэгістравалася як індывідуальны прадпрымальнік і рамеснік.

— Мне ў галаву прыйшла думка — зарабляць тым, што ёсць. Я самавучка ў творчасці. Мне трэба прыстасаваць усё, каб не выкідваць, — тлумачыць жанчына. — Напрыклад, вербачкі раблю да вербніцы. Адна каштуе 12—15 рублёў. Ёсць нават нязменныя кліенты, якія едуць з іншага канца горада на Нямігу за таварам. З лютага 2015 года штомесячна прыходзіць пенсія па інваліднасці на малодшую дачку (140 рублёў). Я атрымліваю пенсію з красавіка 2016 года (160 рублёў). Вельмі дапамагаюць матуля, родныя, сябры, аднакласнікі. Дзякуючы ім я яшчэ не ўпала на калені.


Столь у пад'ездзе пакрылася іржой.

***Ала ДУБРОЎСКАЯ, кіраўнік аддзела матэрыяльна-бытавога забеспячэння ўпраўлення па працы, занятасці і сацабароне Мінскага райвыканкама**: «Я памятаю гэтую дзяўчыну. У мінулым годзе мы ёй назначылі штомесячную і адначасную адрасную грашовую дапамогу. Адрасную дапамогу мы аказваем у выпадку, калі чалавек па аб'ектыўных прычынах не выходзіць на бюджэт пражытковага мінімуму на кожнага члена сям'і. Акрамя адраснай дапамогі, Ніне Акуневіч выплачвалі ў верасні мінулага года грашовую дапамогу з Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Яна аказваецца пры наяўнасці складанай жыццёвай сітуацыі інвалідам і беспрацоўным пенсіянерам».*

## «Надакучыла атрымліваць «адпіскі»

З 2012 года Ніна звяртаецца ў дзяржструктуры з просьбай пазбавіць бацьку яе дзяцей бацькоўскіх правоў. І на гэта ёсць цвёрдыя падставы — запазычанасць па аліментах і ўхіленне ад выхавання дзяцей. У жанчыны нічога не атрымліваецца і дагэтуль.

— Спачатку ў аліментах на дачок па рашэнні суда было адмоўлена. Адсудзіла іх толькі два гады таму. Запазычанасць расце, а грошай няма. Малыя нават не ведаюць, як бацьку завуць. Ён ні разу да нас не прыйшоў. Калі падала на пазбаўленне бацькоўскіх правоў, сацпедагогі, псіхолагі, настаўнікі і міліцыянеры пачалі правяраць умовы пражывання дзетак. Адыходзяць усе са словамі «ў вас такія выдатныя ўмовы».

Першапачаткова пракуратура не падтрымала жанчыну ў справе пазбаўлення былога мужа бацькоўскіх правоў з той прычыны, што ён «хоча мець зносіны з дзецьмі і аказваць дапамогу ў іх выхаванні і ўтрыманні» (з заключэння пракуратуры Мінскага раёна ад 26.02.2014). Другі раз Ніна звярнулася ў пракуратуру з той жа просьбай у сакавіку 2016 года, калі пайшла запазычанасць па аліментах.

— Справа ў тым, што адбылася тэлефонная размова са спецыялістам з аддзела адукацыі райвыканкама, пасля якой прыйшоў недарэчны адказ. Тады ў мяне апусціліся рукі. Мне надакучыла марнаваць час на заявы і атрымліваць іх «адпіскі».

У адказе з райвыканкама (ад 05.04.2016), які атрымала Ніна пасля той тэлефоннай размовы, сказана: «Вам была прапанавана дапамога ў складанні іскавай заявы аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў, ад якой вы адмовіліся».

Сёння сітуацыя выглядае наступным чынам. Бацька дзяўчатак на працягу сямі гадоў не ўдзельнічаў у выхаванні і матэрыяльным забеспячэнні дзяцей. Згодна з арт. 80 Кодэкса РБ «Аб шлюбе і сям'і» бацькі «могуць быць пазбаўлены бацькоўскіх правоў у адносінах да непаўналетняга дзіцяці, калі будзе ўстаноўлена, што яны ўхіляюцца ад выхавання і ўтрымання дзіцяці». Чамусьці столькі гадоў намаганняў хворай жанчыны так і не прывялі да рашэння праблемы.

***Таццяна БЕЛАНОГ, афіцыйны прадстаўнік УСК па Мінскай вобласці**: «Крупскім раённым аддзелам Следчага камітэта расследуецца крымінальная справа па факце ўхілення ад утрымання дзяцей (ч. 1 ст. 174) у адносінах да грамадзяніна Расійскай Федэрацыі 1966 года нараджэння, які на момант узбуджэння крымінальнай справы меў від на жыхарства ў Крупскім раёне. У ходзе расследавання ўстаноўлена месцазнаходжанне фігуранта ў Расійскай Федэрацыі. Цяпер следствам накіравана міжнароднае даручэнне ў РФ для правядзення неабходных следчых дзеянняў з удзелам абвінавачанага, у тым ліку допыту».*

Нягледзячы на афіцыйныя даныя, якія прыведзены абзацам вышэй, на наступны дзень жанчына атрымала апавяшчэнне пра прыпыненне папярэдняга расследавання (ад 22.12.2016) у сувязі з тым, што «абвінавачаны схаваўся ад органаў крымінальнага пераследавання і яго месцазнаходжанне не выяўлена».

— Навошта я хачу пазбавіць яго бацькоўскіх правоў? Каб абараніць дзяцей. Ніхто не паглядзіць, што чалавек ні разу не павіншаваў малых з днём нараджэння, што ні капейкі не даў на харчаванне, адзенне і абутак для дзяўчатак. Калі са мною што-небудзь здарыцца, менавіта гэты грамадзянін будзе першасным апекуном.

## «Ніхто не ўцяпліў і па сёння...»

Аграгарадок Сеніца, дзе жыве Ніна з мамай і дзвюма дочкамі, знаходзіцца за два кіламетры ад кальцавой. 4-пакаёвую кватэру Ніна з маці набылі 13 гадоў таму. Трохпавярховы дом разлічаны на пяць сем'яў і пабудаваны ў 1974 годзе. Падысці да пад'езда, не прамачыўшы ногі, не атрымліваецца.

— Наш дом не першы год стаіць у вадзе: цякуць падземныя камунікацыі, каналізацыя, дах, — такімі словамі сустракае нас Ніна.

У кватэры да карэспандэнтаў падляцелі дзве дзяўчынкі ў валёнках і пачалі знаёміцца. «Ведаеце, я мару пра пернікавы домік! — дзеліцца малодшая. — А сястрычка хоча папугайчыка». Пакуль не ўбачыш на ўласныя вочы таўшчэзныя бальнічныя карткі дзяўчатак, не паверыш, што ў малечы сур'ёзныя праблемы са здароўем.

Праз дваццаць хвілін у мяне пачынаюць мерзнуць ногі. «Абагравальнік мы не выключаем, — расказвае Ніна пра ўмовы ў кватэры. — Акрамя холаду, заўсёды вільготнасць. Сцены прамярзаюць да такой ступені, што лёд відаць каля балконных дзвярэй. Вада можа гарачая ісці, а праз хвіліну зрабіцца халоднай. Увесь час змагаемся з цвіллю. За крэдытныя сродкі мы робім рамонт, але ўсё безвынікова. Мы нават не можам прадаць кватэру з-за такіх умоў».


**Гэта лекі, якія Ніна з дочкамі прымаюць штодзённа.**

Перапіску з ЖКГ Ніна вядзе з 2005 года. У самых першых актах спецыялісты заключаюць: «тэмпературны рэжым у памяшканні адпавядае санітарным нормам, сцены сухія, вільготнасці няма». Толькі ў 2012 годзе прадстаўнікі ЖКГ заўважаюць замаканне шпалер і вільготнасць сцен. У акце за 2015 год гаворыцца пра сляды цвілі на кухні і ў жылых памяшканнях.

— Я неаднаразова звярталася ў раённы камітэт, да пракурора, тэлефанавала на абласную гарачую лінію. Усе ведаюць, у якім стане знаходзіцца наш дом, але ніхто нічога не робіць. У 2009 годзе абяцалі нас уцяпліць, потым перанеслі на 2010. У выніку — ніхто не ўцяпліў па сёння!

## «Не памру, пакуль малечу не пастаўлю на ногі»

— Мы заўсёды хварэем, а чаму — не ведаю, — уздыхае старэйшая дзяўчынка. — Можа, таму што мы такія маленькія.

Прычына частых хвароб у дзяўчатак была афіцыйна пацверджана заключэннем навуковай экспертызы інстытута эксперыментальнай батанікі ад 18 лістапада 2016 года. Спецыялісты выявілі пяць відаў мікраскапічных грыбоў. «Наяўнасць вільгаці на столі і сценах стварае спрыяльныя ўмовы для развіцця цвілі, — так гаворыцца ў заключэнні. — Доўгае знаходжанне людзей у памяшканнях, якія змяшчаюць плесневыя грыбы, небяспечнае для здароўя, з'яўляецца фактарам рызыкі і можа суправаджацца ўзнікненнем алергіі, дэрматытаў, астмы, абвастрэннем хранічных захворванняў».

— Мы пераехалі ў гэтую кватэру, калі я была цяжарная старэйшай. Малодшую выношвала тут. Ёй астму паставілі, увесь час сядзім на прэпаратах. Бываюць перыяды, калі прыступы нават два разы на суткі. Малую накіравалі на кансультацыю ў дзіцячую анкалогію. У старэйшай дзяўчынкі алергія.

Сёння мацярынскае сэрца не на месцы: кватэра, дзе яна жыве з двума малалетнімі дзецьмі і мамай-пенсіянеркай, уяўляе пагрозу іх жыццю і здароўю. Магчымасці з'ехаць у іншае месца ў сям'і няма. З 2012 года Ніна стаіць на чарзе на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання. Сёння яна пад 32 нумарам.

У снежні 2016 года Ніна трапіла на прыём да намесніка міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі з просьбай аб дапамозе.

— Калі ласка, зразумейце маё становішча. Я не ўвайшла ў стан рэмісіі пасля захворвання. Я не ведаю, што будзе заўтра. Я адказная за дзетак. Надакучыла больш за дзесяць гадоў стукацца ва ўсе дзверы. Я проста хачу, каб мяне пачулі.

***Генадзь ТРУБІЛА, намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі**: «Гэтыя пытанні ў кампетэнцыі мясцовых выканаўчых органаў улады, над якімі стаіць Мінаблвыканкам. У сувязі з тым, што там пытанні не вырашаюцца, мы падключымся да справы са спецыялістамі, якія могуць правесці дасканалае абследаванне і даць заключэнне аб тэхнічным стане жылога памяшкання. Па выніках заключэння будуць прынятыя меры аб ліквідацыі прычын, якія перашкаджаюць пражыванню грамадзян. Мы давядзём справу да лагічнага завяршэння».*

Пасля навагодніх свят Ніну папярэдзілі: едзе праверка ў складзе прадстаўнікоў райвыканкама, аблвыканкама і міністэрства. У выніку дабраліся да Сеніцы толькі спецыялісты з «ЖЭУ №7» і «Жилищника Минщины». Але з такімі праверкамі жыхары кватэры ўжо звыкліся. Тэмпературу падлогі правяраючыя не памералі, на балкон, які знаходзіцца ў аварыйным стане, ніхто не зазірнуў, акт на месцы складзены не быў. Галоўны інжынер «Жилищника Минщины» адмовіўся даваць журналісту каментарыі наконт 10-гадовых безвыніковых зваротаў жанчыны.

— Ведаеце, у 19 гадоў я магла скласці рукі і сказаць: шкадуйце мяне! Але я дала сабе такую ўстаноўку: не памру, пакуль малечу не пастаўлю на ногі, — тлумачыць Ніна.

Сёння жанчына бачыць адзінае выйсце — падаць заяву ў суд на ўстанаўленне прычын страты здароўя. Гэта справа не аднаго дня. А час ідзе... Дый ці ёсць сэнс варушыць справу, якая за дзесяць гадоў не скранулася з месца? Ці знойдзецца адказны за хваробы дзвюх малалетніх дзяўчатак? Хто зверне ўвагу на складаную жыццёвую сітуацыю звычайнага чалавека? ...Хворая матуля дваіх дзяцей спадзяецца толькі на цуд.

***P.S.** Дабрачынны рахунак Ніны Акуневіч у банку (беларускія рублі): транзітны рахунак 3819382106084, нумар дагавора 000008 у філіяле 614 — г. Мінск, вул. Карбышава, 13, к. 2; УНП: 600052608; МФА: 153001520.*

**Вераніка УЛАСЕВІЧ.**
*veronika.ulasevich@mail.ru*

# Жанчынам уваход забаронены!


Сумесныя забегі малечы вельмі падабаюцца.
Фота Надзеі БУЖАН.

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Любімая гульня дашкольнікаў — «Гусі-лебедзі». Эстафеты ў такім узросце ім яшчэ не надта цікавыя, затое забегі хлопчыкі і дзяўчаткі любяць. Самыя хітрыя стартуюць яшчэ на слове «ўвага», каб першымі аказацца ля праціleглай сцяны.

Сяргей Жакун і яго сын Ратмір на секцыі ўсяго другі раз. Малы ў захапленні! Яшчэ б: у свае пяць Ратмір — бадай, самы старэйшы з дзяцей — бясспрэчны пераможца на забегах. Тата, відаць, таксама задаволены:

— Сын пасля першага разу так салодка спаў... Галаву задурыў, усё пытаў, калі наступны раз у залу пойдзем. Ён у нас вельмі актыўны, канструктар па ўсёй кватэры раскідвае.

## «Жонка ў гэты час прымае ванну»

На лаўцы Генадзь Мураўёў, узброіўшыся расчоскай і рызінкамі, заплятае дачку.

— Ды вось жонка не паспявала, сказала, каб я Лізе хвосцікі зрабіў, — апраўдваецца.

Для Генадзя гэтыя дзявочыя прычоскі — як раз плюнуць. Ён тата пяці дачок. «А некалькі тыдняў таму яшчэ і сын нарадзіўся», — не хавае радасці шматдзетны бацька.

Генадзь увогуле мужчына ўнікальны: ён уваходзіць у той адзін працэнт татаў, якія пагадзіліся выйсці ў водпуск па доглядзе дзіцяці. «Я працую інжынерам у адной з фермерскіх гаспадарак Гомеля, а жонка — педыятр, загадчыца аддзялення ў паліклініцы. Яна ў два разы больш за мяне атрымлівае, таму з Лізай у дэкрэце быў я. З сынам таксама пайду ў водпуск».

Да праекта «ТатаЗала» Генадзь далучыўся з самага адкрыцця. Як і Максім Данішэўскі.

— Калі на першы занятак прыйшлі, Ваня ўсю гадзіну на руках прасядзеў, — згадвае ён. — А ўжо на другі раз асвоіўся, з дзецьмі бегаў. Думаю, з садком у нас праблем не будзе. Дома чуе слова «ТатаЗала» — адразу збірае мячы, кеды. Ваню тут вельмі падабаецца. Хаця мульцікі, вядома, ні на што не гатовы прамяняць.

Максім заўважае, што для яго важна фізічнае развіццё дзіцяці. Дома, натуральна, такія ўмовы, як у спартыўнай зале, не створыш. Мама ж Вані вольнаму часу ў сваім раскладзе толькі рада.

— Жонка ведае, што вечар аўторка і суботы — яе час. Можа з бацькамі сустрэцца, з сяброўкамі. Але звычайна яна ванну прымае.

## «ТатаЗалу» — у кожны горад

Цяпер у зале рэгулярна збіраецца 10—15 татаў з дзецьмі. А пачыналася ўсё з аднаго. Шматдзетны тата, настаўнік фізкультуры па першай адукацыі і старшыня савета бацькоўі горада Гомеля Сяргей Бычкоў шукаў, куды б падацца з малодшым сынам.

— Кубікі і машынкі кожны дзень надакучылі. Пахадзілі з Міронам па розных гуртках: усё нязручна, далёка і дорага. А школьная зала звычайна працуе да васьмі. Пачалі хадзіць сюды. Потым паразмаўлялі з дырэктарам, каб арганізаваць такую секцыю. Школа і бацькі павінны ўзаемадзейнічаць, — расказвае Сяргей Бычкоў.

Знайсці татаў, гатовых наведваць новую секцыю, аказалася не праблемай. Наадварот: ажыятаж быў такі, што часам у зале збіралася па 80—90 чалавек. Бацькі з'язджаліся з усяго горада.

**Пакуль таты вучацца заплятаць хвосцікі і гуляюць у даганялкі, мамы могуць дазволіць сабе гадзіну шопінгу, басейна ці проста цішыні.**

— Некаторыя прапаноўвалі: а давайце мы вам дзяцей пакінем, а потым праз паўтары гадзіны забяром? Вядома, ім адмаўлялі. Задума ж у тым, каб тата разам з малым больш часу праводзіў, сваім прыкладам паказваў здаровы лад жыцця. Для дзіцяці такія актыўныя заняткі, дарэчы, вельмі карысныя: чым большы ў яго арсенал рухаў, тым лепш ён развіваецца.

Пазней, каб месца хапіла ўсім, у Гомелі адкрылі яшчэ адну «ТатаЗалу» — у 29-й школе. Цяпер вядуць перамовы з дзвюма навучальнымі ўстановамі ў мікраёне Фестывальны.

— Я не сустракаў ніводнага дырэктара, які б сказаў «не», — прызнаецца Сяргей. — Праблема можа быць толькі ў тым, што зала распісана па гадзінах: танцы, трэніроўкі. Але можна ж штосьці пасунуць, ці на выхадных секцыю праводзіць.

**Некаторыя прапаноўвалі: а давайце мы вам дзяцей пакінем, а потым праз паўтары гадзіны забяром? Вядома, ім адмаўлялі. Задума ж у тым, каб тата разам з малым больш часу праводзіў.**

Бацькі ў сваю чаргу стараюцца нешта зрабіць для школы: акно памяняць, купіць фарбу для падлогі ці дадатковы інвентар.

Ідэяй ужо зацікавіліся ў іншых рэгіёнах (Сяргею пісалі з Магілёва, Віцебска, Мінска) і нават у Расіі (у кастрычніку зала адкрылася ў горадзе Зарэчнае Пензенскай вобласці). А на мінулым конкурсе сацыяльных праектаў Social Weekend ініцыятыва гомельскіх бацькоў і школы была прызнана найлепшай і атрымала гран-пры.

— Шукаем татаў-мадэратараў, якія б хацелі, каб такія залы былі побач з імі, і дырэктараў школ, адкрытых для гэтага. Мы можам дапамагчы і з аднаго, і з другога боку, — кажа Сяргей і дадае, што ў сакавіку яны плануюць правесці семінар для мадэратараў падобных груп.

На яго думку, мужчынам варта памятаць, што на іх ляжыць не толькі функцыя здабытчыка. «Тата — гэта галава сям'і, які адказвае за ўсё, што ў ёй адбываецца. І выхаванне дзяцей — яго неад'емная задача. Гэта бацька павінен прывесці дзіця ў грамадства».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
*Мінск — Гомель — Мінск.*


Для шматдзетнага таты Генадзя МУРАЎЁВА прычэсваць дачок — звычайная справа.

■ З уласнага досведу

# З ДАЧКОЙ... НА СПАТКАННЕ

## 10 парад бацьку дзяўчынкі

**«У мяне чатыры дачушкі, і мы штодзень кажам адно аднаму: «Я люблю цябе мацней, чым учора», — так пачынае сваю «шпаргалку» для бацькоў шматдзетны тата Джасцін Рыклефс. За гады свайго бацькоўства мужчына зразумеў: каб пабудаваць цёплыя адносіны з дачкой, трэба яе зразумець. Спіс парад, які ён склаў, спадзяёмся, дапаможа ў гэтым і іншым татам.**

**1. Не саромейцеся казаць «Я цябе люблю» шмат разоў**

Навучыцеся паказваць дачцэ сваю любоў. Яна мае патрэбу ў ёй больш, чым у грашах або падарунках. Ніхто на свеце не дасць дзяўчынцы такое пачуццё ўпэўненасці і абароненасці, як клапатлівы тата.

**2. Навучыцеся заплятаць коскі**

Лічыцца, што заплятаць коскі і завязваць хвосцікі — выключна жаночая справа, але тата павінен умець і гэта, на ўсялякі выпадак. Раптам вы з дачкой паедзеце ўдвaіх у адпачынак? Больш таго, псіхолагі лічаць, што тата павінен умець не толькі рабіць прычоскі, але і, калі спатрэбіцца, пафарбаваць дачцэ пазногці. Гэта пакажа ёй, што мужчына можа быць не толькі моцным, але і пяшчотным.

**3. Займайцеся з ёй спортам, гэта ўмацоўвае характар**

Рабіце з дачкой зарадку, бярыце з сабой на ранішнія прабежкі або на веласіпедныя прагулкі, навучыце адціскацца, гуляйце разам у спартыўныя гульні на паветры. Дзяўчынкі не павінны расці слабы. Спартыўная моц дапаможа прывіць моц душэўную і цвёрдасць характару.

**4. Калі вы дома, адключыце свой мабільны**

Вялікая памылка многіх бацькоў у тым, што, прыйшоўшы дадому, яны фактычна працягваюць адсутнічаць. Не адрываючыся ад мабільніка, адказваюць на лісты, пішуць у Твітары, чытаюць старонкі ў Фэйсбуку. А ў гэты час ваша маленькая дачка чакае, калі вы звернеце на яе ўвагу. Выключайце тэлефон адразу, пераступаючы парог дома. Удзяліце трохі часу той, якая чакала вас увесь дзень, пагуляйце з ёй, пачытайце ёй кніжку ці проста пасядзіце ўабдымку і падурэйце. Памятайце пра тое, што вельмі хутка дачка вырасце. І тады ты сам больш наўрад ці захоча бавіць час дома, дзе на яе не звяртаюць увагі.

**5. Хадзіце куды-небудзь удвaіх**

Хоць бы некалькі разоў на год запрашайце дачку на «спатканне» без мамы. Схадзіце разам у кіно, тэатр ці кнігарню. Такія сустрэчы пакажуць ёй, як мужчына павінен абыходзіцца з жанчынай. Адкрывайце перад дачушкай дзверы машыны, дапамагайце зняць і апрануць паліто, кажыце кампліменты, жартуйце. У канцы кожнага тыдня глядзіце разам цікавыя фільмы, а потым дзяліцеся сваімі ўражаннямі. Ці завядзіце традыцыю на нядзелі піць гарачы шакалад ва ўтульным кафэ. У выхадныя таксама можна адправіцца ў кароткі паход па цікавых месцах вашага горада. Не ленуйцеся прыдумляць такія падзеі, фатаграфуйце іх. Запаўняйце эмацыйную памяць вашай дачкі падзеямі, момантамі, праведзенымі разам з вамі.

**Вялікая памылка многіх бацькоў у тым, што, прыйшоўшы дадому, яны фактычна працягваюць адсутнічаць.**

**6. Будзьце побач на самых важных падзеях у яе жыцці**

Зразумела, што большасць татаў працуюць, занятыя сваёй кар'ерай і ў іх не так шмат вольнага часу. Але ўсё ж — старайцеся не прапускаць важных падзей у жыцці дачкі, ці гэта будзе канцэрт у музычнай школе, спартыўныя спаборніцтвы або выстава яе малюнкаў. І не стамляйцеся хваліць яе незалежна ад вынікаў. Нават калі ў гэты дзень вас запрашаюць на футбольны матч, вызначайце свае прыярытэты: матчы яшчэ паўтарацца, а дзяцінства вашай дачкі — не.

**7. Растлумачце ёй, што прывабная знешнасць — гэта яшчэ не ўсё**

Псіхолагі лічаць, што менавіта тата павінен растлумачыць дачцэ, што ўнутраная прыгажосць значна важнейшая за знешнюю, што менавіта ўнутраны змест дзяўчыны — яе характар, сардэчнасць — тое ядро, якое дазволіць знайсці ў жыцці правільны шлях. Гадавань дачку ў сучасным свеце гламурных стандартаў вельмі нялёгка. Але менавіта вы можаце ёй растлумачыць, што, каб спадабацца хлопцу, не трэба агаляць сваё цела.

**8. Не аддаляйцеся ад дачкі, калі яна становіцца падлеткам**

З 11 да 15 гадоў пачынаецца цяжкі ўзрост, калі ваша дачка зменіцца і знешне (стане менш прывабнай), і ўнутрана, стане непаслухмянай і грубаватай. Не аддаляйцеся ад яе ў гэты складаны перыяд, захоўвайце эмацыйную сувязь. Будзьце ў курсе яе праблем, інтарэсаў, заняткаў, бойфрэндаў і ўсяго іншага, каб яна магла звярнуцца да вас па любую дапамогу. Не смейцеся з яе, калі яна ўзяла вашу брытву, каб пагаліць ногі. Заўсёды стаўцеся да дачкі з любоўю і разуменнем, усё роўна, колькі ёй — 5 ці 15 гадоў.

**9. Ад вас залежыць, якога партнёра ў жыцці яна абярэ**

Ад вашых адносін да дачкі ў многім залежыць, якога мужа яна абярэ сабе ў будучыні. Калі вы добры бацька, яна будзе шукаць хлопца, падобнага на вас. У шчаслівых сем'ях маленькія дзяўчаткі часта кажуць: «Я вырасту і выйду замуж за тату». Гэта добры знак. Значыць, вы паводзіце сябе правільна.

**10. Яна бачыць, як вы ставіцеся да яе маці**

Гэта самая важная парада ў маім спісе. Вы можаце прытрымлівацца толькі яе, і поспех вашых адносін з дачкой забяспечаны. Яна простая: не стамляйцеся паказваць дзецям, што вы кахаеце іх маці і даражыце вашым шлюбам. Удзяльнічаючы ў дзіцячым жыцці, не забывайцеся пра ваша асабістае. Знаходзьце час, каб схадзіць удвaіх з жонкай у тэатр, рэстаран, запланўйце сумеснае кароткае падарожжа. Дзеці павінны разумець, што іх мама з'яўляецца для вас большым прыярытэтам, чым яны. Гэта карысна не толькі для ўмацавання адносін з жонкай, але і для фарміравання стаўлення да шлюбу вашых дзяцей.

Падрыхтавала
**Наталля МАЎЧАНАВА.**

■ Беларусікі

# ПРЫКЛАД ДЛЯ БРАЦІКА

На гэтым здымку брат і сястра — Соня і Павел Талмачаўцы. Жывуць яны ў Мінску, наведваюць дзіцячы садок.

Соня — выхаванка беларускамоўнай групы. Яна з радасцю вывучае родную мову, ведае ўжо шмат цудоўных мілагучных слоў. Вечарамі па тэлефоне экзаменуе дзядулю і бабулю, якія жывуць на Жлобіншчыне.

Соня вельмі любіць наведваць вёску, яна першая памочніца ў агародзе. Дапамагае садзіць і збіраць ураджай зялёнага гароху, кавуноў, кабачкоў, агуркоў. Яна шчырая беларусачка. Адным словам, ёсць з каго браць прыклад малодшаму брацiку!

***Шаноўныя мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымачкі вашых дзетак, унукаў, а можа, нават і праўнукаў (з невялічкім — 4-5 сказаў — апавядам) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб, зірнуўшы на фота, адразу ж можна было зразумець, што гэта беларусік. Арыгінальнасць і творчы падыход вітаюцца! Аднаго з герояў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз***



■ Нясумныя выхадныя

# ЗАЛЯТАЙ У ГОСЦІ, або Як знайсці крылатых сяброў



Птушкі ля кармушкі.

**Амаль штогод у Беларусь залятаюць новыя віды птушак. Мабыць, некаторыя з іх жывуць побач з вамі. Каб высветліць гэта — апранайцеся цяплей і выходзьце ўсёй сям'ёй на двор шукаць птушку шчасця.**

## СМАЧНА ЕСЦІ... БЕЗ ХЛЕБА

Першы і самы відавочны спосаб прывабіць птушак — зрабіць кармушку. Драўляная праслужыць не адзін год, але змайстраваць яе даволі складана. З пластмасавых бутэлек і ўпаковак ад соку ці малака можна зрабіць кармушку хвілін за 20 — дастаткова выразаць акенцы, каб птушкі маглі ўзяць корм. Мы павесілі абедзве — і вось вынік нашага эксперыменту: пярнатыя аддаюць перавагу «сталоўкам» з упакова ад соку. Калі вы павесіце кармушку з бутэлькі на галінцы — вецер будзе яе раскручваць, і дробным птушкам цяжэй сесці на яе.

Выпрацуйце звычку класці корм рэгулярна, напрыклад, выходзячы на працу, тады кожную раніцу вас будуць сустракаць некалькі шумных і нецярплівых вераб'ёў ды сінічак. Каб прыцягнуць больш птушак, лепш павесіць кармушку бліжэй да лесу. Так, на яе можа зляцецца да 25 відаў птушак. У топ-10 наведвальнікаў, акрамя сініц і вераб'ёў, уключаны зелянушкі, сарокі, гракі, каўкі, попаўзні і, вядома, галубы.

Чым жа іх карміць? Арнітолагі кажуць, што птушкам не рэкамендаваны хлеб: гэта нязвыклая для іх ежа, і яе ўжыванне дрэнна адбіваецца на здароўі. Лепш насыпаць у кармушку няпражаных несалёных семак, арахісу, насення льну, проса ці падвесіць несалёнае сала для сініц, попаўзняў і дзятлаў. А качак каля ракі можна падкарміць аўсянымі камячкамі: насыпаць на беражку, каб птушкі маглі размачыць іх і з'есці.

## ПАЗНАЦЬ БУРГАМІСТРА

Мы пайшлі шукаць птушак па Мінску. І вось пашчасціла — на Свіслачы побач з Палацам спорту сустрэлі бургамістра. Гэта такая вялікая чайка, якая з'яўляецца новым відам для Беларусі. Пазнаць яе даволі проста: яна адрозніваецца ад звычайных большым памерам і адсутнасцю чорных пер'яў.

Дарэчы, у сталіцы можна сустрэць кожны другі від пярнатых, якія былі заўважаны ў Беларусі. Напрыклад, голуба. Гэта птушка не такая звычайная. Першапачаткова яна з'явілася ў краінах Паўночнай Афрыкі і Міжземнамор'я. Гэта быў від скалістых галубоў. У эпоху вялікіх геаграфічных адкрыццяў і развіцця птушынай пошты яны распаўсюдзіліся па гарадах і ўтварылі новы від шызага голуба, якога мы ведаем цяпер.

**Арнітолагі кажуць, што птушкам не рэкамендаваны хлеб: гэта нязвыклая для іх ежа, і яе ўжыванне дрэнна адбіваецца на здароўі.**

Птушкі імкнуцца ў гарады і вёскі ў пошуках жытла і корму. Відавочна, яны прыстасаваліся да жыцця разам з чалавекам. Напрыклад, сыча-сіпеля, самую маленькую саву Еўропы, вы наўрад ці знойдзеце ў дзікай прыродзе. Дарэчы, многія, сустракаючыся з ім, лічаць, што гэта пакінутае птушаня.

Вядома, на пошукі птушкі шчасця можна адпраўляцца круглы год. Хутка прыйдзе вясна і з'явяцца яе «крылатыя падснежнікі» — ластаўкі. Прыляцяць яны і ў гарады. Ластаўкі навучыліся будаваць свае гнёзды пад падаконнікамі. Чайкі ж жывуць на дахах буйных прадпрыемстваў. Цікава, што, паводле слоў спецыяліста па прыродаахоўных пытаннях «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Сямёна Левага, вароны прыдумалі дзівосны спосаб разбіваць грэцкія арэхі. Яны кідаюць іх пад колы аўтамабіляў і забіраюць, калі загараецца чырвоны сігнал святлафору. А пеўчыя драздзы, якія ядуць смаўжоў, навучыліся разбіваць іх панцыр аб асфальт.



Бургамістр.

Калі вы хочаце сустрэць якую-небудзь незвычайную птушку, вось некалькі рэкамендацый. Вушастую саву можна ўбачыць у Парку 900-годдзя Мінска каля «Чыжоўка-Арэны». У раёне Цнянскага вадасховішча сталіцы, дзе шмат пустак, можна знайсці птушак, якія аддаюць перавагу адкрытым прасторам. Малы бугай жыве ў заказніку Лябяжы, на тэрыторыі Чыжоўскага вадасховішча і ў Лошыцкім парку. Звычайных пустэльгаў больш за ўсё ў Брэсце. У сталіцы ў маі — пачатку чэрвеня ладзяць велапрагулкі па пошуку салаўёў. Акрамя іх, у Мінску можна сустрэць чырвонакніжнага зімародка і чубатага жаваранка.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

## Шаль-трансформер

***Гэта трохвугольны шаль, які нескладанымі прыёмамі можна ператварыць у камізэльку, кофту, туніку і многае іншае. Усё будзе абмяжоўвацца толькі вашай фантазіяй!***

Шаль-трансформер можна звязаць любым узорам кручком або пруткамі, але па абодвух баках трэба пакінуць прарэзы для рук.

Варта загадзя вымераць размяшчэнне рукавоў для будучай камізэлькі. Яны павінны размяшчацца так, каб не псавалі ўзор. Краі можна абрабіць, стварыўшы дадатковы ўзор. Пасля завяршэння вязання да праймаў і па цэнтры шаля можна прышыць гузікі. Дзякуючы ім вы зможаце закрыць прарэзы для рук ці насіць яго як туніку, прышпіліўшы да цэнтральных гузікаў «рог».



## Бананавы тварожнік

***Спатрэбіцца:** 500 г тварагу, 5-6 бананаў, лепш пераспелых, 2 ст. л. мукі, 1 яйка.*

Тварог узбіць у блэндары або працерці праз сіта. Бананы таксама здрабніць або расціснуць відэльцам.



У тварожна-бананавую масу дадаць яйка і муку, замясіць цеста. Можна ўзяць крыху ваніліну для водару. Жменька разынак таксама будзе да месца.

Змазаць форму маслам, злёгку прысыпаць мукой, выкласці цеста ў форму і выпякаць 30 хвілін пры тэмпературы 180 градусаў.

Калі тварожнік падасца недастаткова салодкім, можна паліць яго карамеллю або згушчонкай, але лепш гэтага не рабіць: тонкі водар і далікатны смак бананаў можа знікнуць.

ВАРТА ВЕДАЦЬ

## Пра што можа расказаць наклейка

***Напэўна, вы хоць раз у жыцці заўважалі наклейкі на бананах ці іншай садавіне. Але ці задаваліся пытаннем, што ж яны азначаюць?***

**1.** Калі на іх чатырохзначны код, які пачынаецца нумарамі 3 ці 4, то гэта азначае, што прадукт быў вырашчаны па прынцыпе інтэнсіўнай сельскай гаспадаркі, з выкарыстаннем угнаенняў і пестыцыдаў.

**2.** Калі прадукт мае пяцізначны код, які пачынаецца з нумара 9, гэта азначае, што прадукт быў вырашчаны традыцыйным спосабам, як гэта рабілі на працягу тысяч гадоў. Цяпер такі спосаб называюць арганічным, гэта значыць, без прымянення пестыцыдаў і ўгнаенняў.





**3.** Калі прадукт мае пяцізначны код, які пачынаецца з нумара 8, то гэта азначае, што прадукт з'яўляецца генетычна мадыфікаваным або шырока вядомы як ГМА.

## Што можа цыбуля

• Цыбуля выдатна выдаляе нагар з каструль, патэльняў і рашотак-грыль! Каб пазбавіцца ад бруду, трэба нацерці посуд свежаразрэзанай цыбулінай. Затым добра прамыць яго вадой з мыйным сродкам. Сок цыбулі цудоўна нейтралізуе і пах гару!

• Сок цыбулі здольны выдаляць плямы поту з адзення! Нанясіце сок на пляму, а затым памыйце як звычайна. Жаўцізна знікне.

• Цыбуля дапаможа справіцца з забрудджаннямі і на паверхні абутку. Выводзіць нават плямы ад травы!

• Цыбуля з'яўляецца моцным сродкам ад камароў і мурашак. Наліце ў міску вады, кіньце туды разрэзаную на кольцы цыбуліну. Насякомыя будуць трымацца на адлегласці ад гэтага месца!

• Дзякуючы сваім антыбактэрыяльным уласцівасцям цыбуля дапаможа пры ўкусах насякомых і здыме раздражненне пры любых запаленнях на паверхні скуры.

• Вельмі добра дзейнічае адвар шалупіння цыбулі на скуру галавы: пазбаўляе ад перхаці, дадае валасам аб'ём, узмацняе іх рост. Рэкамендуецца апаласкваць валасы адварам пасля ўжывання звычайнага шампуню!

*ШЧАСЛІВЫ ТОЙ, У КІМ ДЗЯЦІНСТВА ЁСЦЬ (Памэла Трэверс, якая прыдумала Мэры Попінс).*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

■ Падарожжа ў мінулае

# НЕЗАМУЖНІЯ ТЭЛЕГРАФІСТКІ І СКРЫНІ ДЛЯ ЛІСТОЎ НА ТРАМВАЯХ

## Цікавыя факты з гісторыі беларускай пошты

**Як маглі пакараць пісьманосца, які згубіў паведамленне ў дарозе? Калі на работу на станцыі сувязі пачалі прымаць жанчын? Як выглядалі першыя паштовыя скрыні? Пра гэта можна даведацца ў гісторыка-інфармацыйным цэнтры «Белпошты».**

### Мужчынская прафесія

Да XIV стагоддзя пошту перавозілі ганцы. На гэту пасаду падбіраліся людзі вынослівыя і моцныя, бо на шляху падпільноўвала небяспека: звяры, разбойнікі. Ганцы заўсёды мелі ражок і молат ці стрэлы, каб абараніць сябе. Пісьманосцы таксама павінны былі ведаць мясцовасць і мець добрую памяць (найбольш важныя паведамленні не запісваліся, а перадаваліся вусна). Мець такіх «паштальёнаў» маглі толькі багатыя людзі.


Сургучныя пячаткі.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Ва ўсе часы да тых, хто перавозіў лісты, былі вельмі высокія патрабаванні. За правінкасці і дрэнныя навіны жорстка каралі. Цар Аляксей Раманаў ва ўказе 1671 года патрабаваў біць ямшчыкоў палкамі, каб лісты прыходзілі своечасова. А пры Пятры І паштальёну, які сказіў інфармацыю ці згубіў паведамленне, пагражаў смяротны прыгавор.

Цяпер штат пошты на 85 працэнтаў складаюць жанчыны. Але аж но да сярэдзіны XIX стагоддзя на гэтую службу прымалі выключна мужчын — адукаваных, якія ведалі геаграфію і некалькі моў. Форма шылася на сродкі саміх жа работнікаў і потым перадавалася ў спадчыну. Жанчын пачалі прымаць на работу, толькі калі з'явілася тэлеграфная сувязь (у Беларусі першыя тэлеграфныя станцыі былі пабудаваны ў 1859 годзе ў Мінску і Бабруйску). Першая дама ў сталічнай канторы была афармлена тэлеграфісткай у 1905-м. Да 1917 года на гэту пасаду бралі дзяўчат, старэйшых за 18 гадоў, удоў і тых, хто быў у шлюбе з чыноўнікамі паштова-тэлеграфнага ведамства (калі жонка хварэла, муж мусіў выконваць яе абавязкі). Жаночая праца аплачвалася горш за мужчынскую, але дамы імкнуліся захаваць свае месцы. Вядомы нават выпадак, калі тэлеграфістка, пасля таго як яе муж звольніўся з пошты, вырашыла аформіць развод, каб не згубіць работу.

— Гадавы заробак звычайнага паштальёна Мінскай канторы ў пачатку ХХ стагоддзя складаў 150 рублёў. А яго начальніка — у 10 разоў больш, — расказвае **супрацоўніца гісторыка-інфармацыйнага цэнтра «Белпошты» Таццяна ГУЗЯНКОВА**, якая праводзіць для нас экскурсію.

### Дастаўка карэтай і самалётам

Рэгулярная дзяржаўная служба дастаўкі пошты з'явілася на тэрыторыі нашай краіны ў 1649 годзе. Утрымлівалася яна на падатkі насельніцтва. Пасля таго як у 1667 годзе ў вёсцы Андрусава было заключана мірнае пагадненне паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай, асобным пунктам якога было развіццё паштовых зносін, стварылі першы паштовы тракт — па напрамку Масква—Вільня. Ён праходзіў праз такія гарады, як Магілёў, Мінск. Карэспандэнцыя адпраўлялася раз на тыдзень. З Масквы да Вільні лісты даходзілі за 21 дзень.

У тым жа 1667 годзе ў Мінску з'явіўся першы паштовы ям (прататып станцыі). У яго штаце былі тры ямшчыкі і адзін стараста. Тут можна было памяняць коней, пераначаваць. Пазней паштовыя ямы былі створаны ў Мсціславе, Магілёве, Барысаве, Смілавічах, Радашковічах, Маладзечне.

Па дарогах карэспандэнцыю развозілі калёсы і карэты. У пачатку XIX стагоддзя сталі выкарыстоўваць таксама дыліжансы. Сярэдняя хуткасць гэтых карэт складала 10 км/г. Дыліжанс ехаў і днём і ноччу і спыняўся ў тавернах толькі для яды і змены коней.

У 1917 годзе з'яўляюцца паштовыя вагоны. А ў 1932-м адкрылася першая беларуская паштовая авіялінія Мінск—Глуск—Парычы—Мозыр на самалёце У-2. Праз тры гады для рэгулярнай перавозкі лістоў сталі выкарыстоўваць паветраную лінію Мінск—Масква. У 1940 годзе пабудавалі аэрадромы ў Пінску, Вілейцы, Баранавічах і адкрылі новыя паштовыя авіялініі: Мінск—Баранавічы—Пінск—Брэст—Мінск і Мінск—Вілейка—Беласток—Мінск.

### Скрыні вагой да паўцэнтнера

Доўгі час лісты перасылаліся без канвертаў (у Расіі канверты з'явіліся ў 1845 годзе). Таму да зместу пісьмаў былі пэўныя патрабаванні: напрыклад, каб у тэксце не пісалі нецэнзурных слоў.

Першую ж марку ў Расіі выпусцілі ў 1857 годзе. На ёй быў намаляваны дзяржаўны герб і праставўляўся кошт паштовага збору.

— За канверт трэба было заплаціць адну капейку срэбра, за перасылку — 5 капеек. Атрымаць паштоўку ў той час было дарагім падарункам, — кажа Таццяна Аркадзеўна.

Паштовыя скрыні ў гарадах сталі ўстанаўліваць у 1850-х гадах. Спачатку яны былі драўлянымі, але іх часам падпальвалі, і лісты не захоўваліся. Таму вырашылі рабіць чыгунныя. Праўда, такія скрыні былі занадта масіўнымі: адна магла важыць да 49 кілаграмаў! Матэрыял у выніку замянілі на іншы метал. У 1910 годзе канструктар Павел Шабараў распрацаваў паштовую скрыню з доннымі дзверцамі, якія адкрываліся механічна, калі да іх прыкладалі спецыяльную скрыню. Гэта сістэма захавалася і па сёння.


Паштовыя штэмпелі.

Скрыні ўстанаўлівалі ў паштовых канторах, дробязных крамах. У Мінску быў час, калі іх вешалі нават на грамадскі транспарт — аўтобусы і трамваі. Пошту збіралі два разы на дзень. Пісьманосцам выдавалі чырвоныя пласцінкі: яны павінны былі пакласці іх у скрыні, калі даставалі адтуль карэспандэнцыю, і замест іх забраць сінія. Такім чынам ажыццяўляўся кантроль. Цяпер гэта робіць электронная сістэма сачэння.


Супрацоўніца гісторыка-інфармацыйнага цэнтра «Белпошты» Таццяна ГУЗЯНКОВА праводзіць экскурсію.

**Даведка**

**Гісторыка-інфармацыйны цэнтр «Белпошты» быў створаны па ініцыятыве работнікаў прадпрыемства ў 2005 годзе. Ён знаходзіцца ў Мінску на вуліцы Вакзальная, 22. Наведванне музея бясплатнае.**

### Ад арыфмометра да камп'ютара

У музеі пошты сабрана шмат цікавых экспанатаў. Напрыклад, форма паштальёнаў, у якой абслугоўвалі Алімпіяду-1980. Ці ўсе маркі, выпушчаныя ў краіне з 1992 года. І нават пісьмовыя скаргі на работу станцый Віцебскай губерні ў 1861 годзе, у прыватнасці, на страту карэспандэнцыі і дрэннае меню.

Наведвальнікі могуць азнаёміцца з тэхнікай, якая выкарыстоўвалася ў аддзяленнях у розныя часы. Арыфмометры, падсумоўваючыя апараты, маркіравальныя машыны... Касавы апарат «КІМ», на якім ішоў прыём падпіскі і тэлеграм. Таццяна Аркадзеўна, якая працуе на пошце больш за 40 гадоў, асабіста апрабавала кожную з гэтых машын.

— Што было самае складанае ў выкарыстанні? — задумваецца яна. — Напэўна, «Анега-3», электрамеханічная машына. Але мне падабалася ўсё новае, таму я з цікавасцю асвойвала любую тэхніку.

Супрацоўніца гісторыка-інфармацыйнага цэнтра паказвае нам таксама вынаходку работніка пошты — «заспакаяльнік вадкасці». Выглядае прыстасаванне як дзве перакрыжаваныя пласціны. Паштальёны, якія перавозілі карэспандэнцыю ў вагонах, ставілі гэтыя пласціны ў каструлю з супам, каб той не выліваўся пры руху.

Усяго ў музеі сабрана каля 5 тысяч экспанатаў (з іх 4 тысячы — гэта калекцыі паштовак, канвертаў, марак). Многае ляжыць у запасніках, таму экспазіцыя перыядычна абнаўляецца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Майстар-клас для насельніцтва

# «БЛІЖЭЙ ДА КЛІЕНТА»

**Акцыі пад такой назвай праводзяцца паштавікамі рэгулярна. Звычайна яны праходзяць у самы пік аплаты камунальных плацяжоў — з 15 па 25 чысло кожнага месяца. У гэтыя дні кліентаў вучаць карыстацца плацежна-даведачнымі тэрміналамі. І прыхільнікаў такога спосабу самаабслугоўвання становіцца ўсё больш.**

— Спачатку некаторыя нават і чуць не хочуць ні пра які тэрмінал. Кажуць, што ім прасцей аплачваць камунальныя паслугі праз касу. Але чалавек разумее перавагі самаабслугоўвання толькі пасля таго, як навучыцца, — кажа **намеснік начальніка Бабруйскага вузла паштовай сувязі Вольга ПЕТРАЖЫЦКАЯ.**

Пенсіянерка Валянціна Падзорава таксама спачатку ігнаравала тэрмінал. Але ўсё ж такі, як інжынер па спецыяльнасці, вырашыла, што трэба ісці ў нагу з часам і вучыцца. «Дзякуй, дзяўчаты дапамаглі. Я за імі паназірала, паўтарыла і зразумела, што так аплачваць нашмат прасцей. Цяпер і іншым раю карыстацца тэрміналамі. Нічога страшнага ў гэтым няма. Тым больш, што побач такія дасведчаныя інструктары», — кажа яна.

У 27-м паштовым аддзяленні па вуліцы Мінскай, 21 якраз выдача пенсій і каля акенца стаіць чалавек шэсць. Тым, хто прыйшоў выключна для таго, каб заплаціць за паслугі, давадзіцца чакаць. Але навошта траціць час дарма?

Інструктары Святлана Кісляк і Наталля Боскіна нясуць вахту непадалёк ад плацежна-даведачнага тэрмінала. Перыядычна яны запрашаюць кліентаў скарыстацца яго паслугамі і абяцаюць дапамагчы. Нехта пагаджаецца і ідзе следам.

— Больш да нас звяртаецца моладзь, а вось людзей сталага ўзросту часцей прыходзіцца ўгаворваць, — кажа Святлана. — Яны не адразу пагаджаюцца, але потым хутка ацэньваюць перавагі. Каму ахвота стаяць у чарзе? Вучобай прыходзіцца займацца рэгулярна, але ў дні акцый мы спецыяльна дзяжурым дзеля гэтага на зале.

Апошнім часам, калі з'явілася магчымасць аплачваць паслугі праз АРІП, карыстацца тэрміналам стала яшчэ больш выгадна. Робіце свой асабовы рахунак у сістэме АРІП і дадаяце ўсе неабходныя паслугі — тэлефон, вада, электраэнергія, ацяпленне і гэтак далей. Наступны раз уводзіце адзіны нумар — і адразу ж перад вачыма адкрываюцца ўсе захаваныя раней плацяжы. Не трэба выконваць лішнія аперацыі, нешта шукаць і зноў уводзіць свае звесткі.

Азат Ганчарэнка раней карыстаўся тэрміналам толькі для таго, каб пакласці грошы на тэлефон. Пасля майстар-класа Святланы навучыўся плаціць за «камуналку» і кабельнае тэлебачанне. Кажа, што цяпер толькі так будзе разлічвацца за паслугі. «Раней выстойваў чаргу ў касу, выбіраў час, калі людзей менш. Цяпер можна ў любы дзень падыходзіць. Дзякуй за навучанне. Здароўя вам паболей», — развітваецца мужчына.

Вольга Альфрэдаўна прызнаецца, што апошнім часам нават бываюць сітуацыі, калі да тэрмінала стаіць чарга з некалькіх чалавек, а каля акенца зусім нікога. Але ахвотных пераходзіць няма, народ хоча абслугоўвацца самастойна. Прычым, калі раней гэта была прэрагатыва моладзі, то цяпер далучылася шмат людзей паважанага ўзросту.

У сельскіх аддзяленнях сувязі тэрміналаў няма, але, як патлумачылі бабруйскія паштавікі, насельніцтва там няшмат, ёсць магчымасць хутка аплаціць паслугі праз касу. Няма неабходнасці ствараць альтэрнатыву і для кліентаў перасоўнай пошты: іх таксама адзінкі. У горадзе іншая справа — тут праз паштовыя аддзяленні за дзень абарочваецца не адна сотня людзей.


Святлана КІСЛЯК адукоўвае насельніцтва.

Трэба, каб для іх гэты працэс праходзіў як мага прасцей. Для карпаратыўных кліентаў, напрыклад, у Бабруйску прадугледжана асобная служба, дзе ім прапануецца цэлы пералік паслуг. Юрыдычныя асобы ўсё часцей карыстаюцца паштовым кур'ерам, які аператыўна дастаўляе іх карэспандэнцыю на ўчастак апрацоўкі. На цэнтральным аддзяленні, дзе народу больш, чым на астатніх, існуе асобны ўчастак для абслугоўвання фізічных асоб — так чалавеку прасцей адправіць ці атрымаць пасылку, іншае паштовае адпраўленне. А ў час пік патокі наведвальнікаў у гэтым аддзяленні нават рэгулююцца па відэасувязі.

— Начальнік адсочвае абстаноўку ў аперацыйных залах проста з рабочага кабінета, — удакладняе Вольга Петражыцкая. — На маніторы бачна, дзе чарга і які ўчастак трэба аператыўна разгрузіць. Выходзіць дадатковы работнік і бярэ на сябе абслугоўванне нейкай часткі кліентаў або зноў-такі прапануе дапамогу ў абслугоўванні праз тэрмінал.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## РАШЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА

# АБ СТАНЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Сяргеевай В.Г., суддзяў Бойка Т.С., Варановіча Т.В., Данілюка С.Я., Карповіч Н.А., Козыравай Л.Р., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П., разгледзеўшы ў судовым пасяджэнні пытанне аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2016 годзе, кіруючыся артыкуламі 22 і 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, артыкуламі 74, 79, 84, 161--163 Закона Рэспублікі Беларусь «О конституционном судопроизводстве»,

**ВЫРАШЫЎ:**

1. Прыняць Пасланне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2016 годзе» (дадаецца).

2. Апублікаваць Пасланне Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і палатам Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2016 годзе» ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі.

**Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П.П. МІКЛАШЭВІЧ.**

*№ Р-1084/2017*

**Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь**

**Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

**Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь**

Вяршэнства права аб'ядноўвае важнейшыя каштоўнасці цывілізаванага чалавецтва і выступае базавым прынцыпам міжнароднага права і нацыянальных канстытуцый, якім кіруюцца сучасныя дэмакратычныя дзяржавы.

Вяршэнства права азначае звязанасць дзяржавы правам, асноўнымі правамі і свабодамі чалавека і грамадзяніна. Як прынцып канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, вяршэнства права абавязвае дзяржаву, усе яе органы і службовых асоб дзейнічаць у межах Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства.

У адпаведнасці з прынцыпам вяршэнства права і нормамі дзеючага на канстытуцыйнай аснове выбарчага заканадаўства ў верасні 2016 года адбыліся выбары ў Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь. Народ як адзіная крыніца дзяржаўнай улады такім чынам упаўнаважыў новы склад Парламента выконваць канстытуцыйную функцыю — прымаць законы як нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць найбольш важныя грамадскія адносіны, накіраваныя на дасягненне канстытуцыйных мэт.

У сістэме прававых каштоўнасцей законы выступаюць эфектыўнай канстытуцыйна-прававой формай выяўлення, арганізацыі і абароны правоў і свабод. Пры гэтым з прынцыпу вяршэнства права вынікае абавязак прыняцця законаў з прававым зместам, гэта значыць прававых законаў, якія вызначаюць баланс свабоды, улады, канстытуцыйных каштоўнасцей на пачатках роўнасці і справядлівасці.

Вяршэнства права прадугледжвае прававую ахову Канстытуцыі, наяўнасць канстытуцыйнага кантролю, які забяспечвае несупярэчлівасць канстытуцыйным палажэнням заканатворчага працэсу і правапрымяняльнай дзейнасці. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь, рэалізуючы свае паўнамоцтвы, сцвярджае вяршэнства Канстытуцыі, канстытуцыйную законнасць, абараняе правы і свабоды чалавека і грамадзяніна праз канстытуцыйнае правасуддзе.

## I

Важнейшымі ўмовамі развіцця Рэспублікі Беларусь як прававой дзяржавы, эфектыўнага функцыянавання дзяржаўнай улады, забеспячэння і гарантавання правоў і свабод чалавека і грамадзяніна з'яўляюцца прытрымліванне і ўмацаванне канстытуцыйнай законнасці, якая праяўляецца перш за ўсё ў адпаведнасці законаў Канстытуцыі. На зацвярджэнне канстытуцыйнай законнасці накіравана дзейнасць Канстытуцыйнага Суда, які на падставе Канстытуцыі, Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў і Закона «О конституционном судопроизводстве» ажыццяўляе паўнамоцтва па праведзенні абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў, прынятых Нацыянальным сходам, да падпісання іх Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыйны Суд у 2016 годзе ў парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю праверыў канстытуцыйнасць 53 законаў, кіруючыся канстытуцыйным прынцыпам вяршэнства права, зыходзячы з неабходнасці паслядоўнай і эфектыўнай рэалізацыі канстытуцыйных каштоўнасцей, абароны правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Пры гэтым улічваліся абавязацельствы Рэспублікі Беларусь па выкананні міжнародна-прававых актаў, у тым ліку актаў, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза.

1. Згодна з Канстытуцыяй дзяржава абавязана прымаць усе даступныя ёй меры для стварэння ўнутранага і міжнароднага парадку, неабходнага для поўнага ажыццяўлення правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь, прадугледжаных Канстытуцыяй; законы выдаюцца на аснове і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй.

Зыходзячы з канстытуцыйных палажэнняў, Канстытуцыйны Суд праз выяўленне канстытуцыйна-прававога сэнсу норм законаў фармуляваў прававыя пазіцыі, канстатуючы, што заканадаўчая дзейнасць павінна грунтавацца на вяршэнстве права, важнейшымі састаўляючымі якога з'яўляюцца законнасць, прававая вызначанасць, забарона самавольства, доступ да правасуддзя ў незалежных і непрадузятых судах, захаванне правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, недыскрымінацыя і роўнасць усіх перад законам.

1.1. Аб прытрымліванні і рэалізацыі ў заканатворчым працэсе прынцыпу вяршэнства права і яго важнейшага элемента — доступнасці правасуддзя, якая выражаецца ў гарантаванні кожнаму права на судовую абарону кампетэнтным, незалежным і непрадузятым судом, канстатавана ў шэрагу рашэнняў Канстытуцыйнага Суда, вынесеных у парадку ажыццяўлення абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў.

Так, грунтуючыся на палажэннях артыкулаў 2, 6, 21, 60 і главы 6 «Суд» Канстытуцыі, а таксама палажэннях Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (артыкул 8) і Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (артыкул 14), Канстытуцыйны Суд пры праверцы канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в законы Республики Беларусь по вопросам судоустройства и судопроизводства» у рашэнні ад 14 снежня 2016 г. прыйшоў да вываду аб тым, што палажэнні артыкула 1 дадзенага Закона накіраваны на развіццё і забеспячэнне канстытуцыйнага права кожнага на судовую абарону сваіх правоў і свабод, а таксама вызначаных Канстытуцыяй у якасці гарантый кампетэнтнай, незалежнай і непрадузятай судовай абароны такіх прынцыпаў ажыццяўлення правасуддзя, як незалежнасць суддзяў і падпарадкаванне іх толькі закону; калегіяльны, а ў прадугледжаных законам выпадках — аднаасобны разгляд спраў суддзямі ў судах і адкрыты разбор спраў ва ўсіх судах; спаборнасць і роўнасць бакоў у працэсе; абавязковасць судовых пастаноў для ўсіх грамадзян і службовых асоб. Уносімыя артыкулам 1 Закона ў Кодэкс аб судаўладкаванні і статусе суддзяў змяненні і дапаўненні маюць на мэце далейшае стварэнне механізмаў рэалізацыі права кожнага на судовую абарону для больш эфектыўнай абароны правоў, свабод і законных інтарэсаў праз правасуддзе, якое адпавядае канстытуцыйна значным крытэрыям.

Пры ацэнцы канстытуцыйнасці новай рэдакцыі часткі чацвёртай артыкула 22 Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, што датычыцца ініцыятыўных зваротаў грамадзян, індывідуальных прадпрымальнікаў і арганізацый, якія накіроўваюцца ўпаўнаважаным органам для магчымага ўнясення ў Канстытуцыйны Суд прапаноў аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў, зроблены вывад аб тым, што ўстанаўліваемае прававое рэгуляванне ініцыятыўных зваротаў, якое азначае пераход ад абстрактнага да канкрэтнага канстытуцыйнага нармакантролю, накіравана на больш поўную рэалізацыю палажэння Канстытуцыі аб ажыццяўленні кантролю за канстытуцыйнасцю нарматыўных актаў у дзяржаве, ускладзенага на Канстытуцыйны Суд, на ўзмацненне ролі канстытуцыйнага кантролю ў абароне канстытуцыйных каштоўнасцей, забеспячэнні вяршэнства Канстытуцыі і яе непасрэднага дзеяння.

Канстытуцыйны Суд таксама ўказаў, што ўскосны доступ грамадзян да канстытуцыйнага правасуддзя прызнаны Еўрапейскай камісіяй за дэмакратыю праз права (Венецыянскай камісіяй) важным інструментам забеспячэння індывідуальных правоў чалавека на канстытуцыйным узроўні. Нягледзячы на залежнасць эфектыўнасці ўскоснага доступу ад здольнасці ўпаўнаважаных органаў выяўляць патэнцыяльна неканстытуцыйныя нарматыўныя акты і іх гатоўнасць звяртацца з заявай у канстытуцыйны суд або орган роўнай юрысдыкцыі, вартасцю ўскоснага доступу грамадзян з'яўляецца добры ўзровень інфармаванасці органаў, упаўнаважаных накіроўваць скаргі ў канстытуцыйны суд, і наяўнасць у іх неабходных юрыдычных навыкаў, якія дазваляюць сфармуляваць карэктны запыт (рашэнне Венецыянскай камісіі ад 17—18 снежня 2010 г.).

Пры ажыццяўленні папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці новай рэдакцыі артыкула 1 Закона Рэспублікі Беларусь «О противодействии экстремизму» ў рашэнні ад 12 красавіка 2016 г. Канстытуцыйны Суд адзначыў, што ўстанаўліваемы Законам судовы парадак прызнання матэрыялаў і арганізацый экстрэмісцкімі, які выключае аналагічныя паўнамоцтвы іншых дзяржаўных органаў і службовых асоб, з'яўляецца дадатковай гарантыяй абароны правоў і свабод чалавека, прадугледжанай артыкулам 60 Канстытуцыі, і адпавядае міжнародна-прававым стандартам у галіне адпраўлення правасуддзя (артыкулы 8 і 10 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, артыкул 14 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, артыкул 6 Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод), пры прытрымліванні якіх забяспечваюцца дэмакратычная практыка і законнасць.

У рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 6 ліпеня 2016 г., прынятым у выніку праверкі канстытуцыйнасці палажэнняў Закона Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Уголовно-исполнительный кодекс Республики Беларусь», указана, што ў развіццё норм Канстытуцыі аб праве кожнага на судовую абарону (частка першая артыкула 60) і аб устанаўленні прынцыпу вяршэнства права (частка першая артыкула 7), а таксама ў мэтах выканання шэрагу раней прынятых рашэнняў Канстытуцыйнага Суда ўдакладняецца парадак абскарджання ў суд рашэнняў аб прымяненні мер спагнання да асуджаных да арышту, пазбаўлення волі. Зыходзячы з таго, што парадак разгляду такіх скарг у судзе ўрэгуляваны Грамадзянскім працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь (далей — ГПК), у Законе вызначаецца адпаведная ўзаемасувязь заканадаўчых палажэнняў і тым самым устараняецца калізія з нормамі Крымінальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — КВК).

У шэрагу рашэнняў пры выяўленні канстытуцыйна-прававога сэнсу палажэнняў законаў Канстытуцыйны Суд зыходзіў з таго, што ў дзяржаве, якая грунтуецца на вяршэнстве права, значная роля адводзіцца забеспячэнню законнасці і правапарадку. Пры гэтым прынцып законнасці ў заканатворчым працэсе азначае вяршэнства закона над падзаконнымі прававымі актамі, а таксама неабходнасць строгага і няўхільнага выканання законаў усімі суб'ектамі права, у тым ліку органамі дзяржаўнай улады, службовымі і іншымі асобамі, якія ажыццяўляюць дзяржаўныя функцыі і абавязаны дзейнічаць у межах нададзеных ім правоў і ўскладзеных на іх абавязкаў, што ў канчатковым выніку спрыяе ўмацаванню канстытуцыйнага правапарадку.

Так, правяраючы канстытуцыйнасць норм Закона Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Уголовный кодекс Республики Беларусь, Кодекс Республики Беларусь об административных правонарушениях и Процессуально-исполнительный кодекс Республики Беларусь об административных правонарушениях», якія замацоўваюць парадак вядзення адміністрацыйнага працэсу па справах аб парушэннях патрабаванняў, якія змяшчаюцца ў тэхнічных рэгламентах Мытнага саюза і Еўразійскага эканамічнага саюза, Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 8 ліпеня 2016 г. указаў, што надзяленне вызначаемых Законам дзяржаўных органаў і службовых асоб паўнамоцтвамі па складанні пратаколаў і разглядзе спраў аб названых адміністрацыйных правапарушэннях адпавядае выконваемым гэтымі органамі задачам і функцыям, абавязку дзяржавы па стварэнні неабходных прававых умоў для выканання дадзеных патрабаванняў, што адпавядае канстытуцыйнаму палажэнню аб забеспячэнні Рэспублікай Беларусь законнасці і правапарадку.

У рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 13 кастрычніка 2016 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» адзначана, што пры замацаванні прынцыпаў выканаўчага вядзення заканадавец зыходзіў перш за ўсё з вяршэнства Канстытуцыі, валодаючай найвышэйшай юрыдычнай сілай, якая азначае, што законы, дэкрэты, указы і іншыя акты дзяржаўных органаў выдаюцца на аснове і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй. Так, ажыццяўленне выканаўчага вядзення на аснове прынцыпу законнасці, які прадугледжвае няўхільнае выкананне ўсімі органамі дзяржаўнай улады, службовымі асобамі, грамадзянамі і арганізацыямі патрабаванняў Канстытуцыі, законаў і іншых нарматыўных прававых актаў, вынікае з палажэнняў часткі першай артыкула 1, часткі другой артыкула 2, частак першай і другой артыкула 7 Канстытуцыі; прынцыпы раўнапраўя і добрасумленнасці бакоў выканаўчага вядзення, а таксама павагі гонару і годнасці грамадзяніна заснаваны на палажэннях артыкула 22, часткі першай артыкула 25, артыкулаў 28 і 53 Канстытуцыі.

Пры ажыццяўленні кантролю канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам декларирования доходов и имущества» былі ацэнены нормы Закона Рэспублікі Беларусь «О декларировании физическими лицами доходов и имущества по требованию налоговых органов», якія замацоўваюць кампетэнцыю Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па прававой рэгламентацыі шэрагу пытанняў у сферы дэкларавання. У рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 27 снежня 2016 г. канстатавана, што дадзеныя нормы грунтуюцца на адпаведных палажэннях артыкула 107 Канстытуцыі. Адначасова Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу на неабходнасць у працэсе рэалізацыі ўскладаемых на Савет Міністраў паўнамоцтваў ажыццяўляць прававое рэгуляванне такім чынам, каб не закраналіся правы фізічных асоб, што падлягаюць устанаўленню, карэкцыроўцы, адмене толькі на ўзроўні закона, з выкананнем патрабаванняў часткі першай артыкула 23 Канстытуцыі, якая дапускае магчымасць абмежавання правоў і свабод асобы толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, і ў канстытуцыйна значных інтарэсах, а таксама артыкула 28 Канстытуцыі, які замацоўвае права кожнага на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё.

Такім чынам, рэалізацыя прынцыпу вяршэнства права ў заканатворчым працэсе праз захаванне і развіццё канстытуцыйных каштоўнасцей, прынцыпаў і норм пры рэгуляванні грамадскіх адносін з'яўляецца галоўнай умовай забеспячэння вяршэнства Канстытуцыі, абароны канстытуцыйных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, зацвярджэння канстытуцыйнай законнасці.

1.2. Неад'емнай састаўляючай вяршэнства права ў заканатворчай дзейнасці з'яўляецца прынцып прававой вызначанасці, з улікам якога Канстытуцыйны Суд у шэрагу рашэнняў фармуляваў прававыя пазіцыі, накіраваныя на ўстараненне ў заканадаўчых актах калізій, прабелаў і прававой нявызначанасці, фарміраванне прававой сістэмы, дзе нарматыўныя прававыя акты знаходзяцца ва ўзаемасувязі, адпавядаюць адзін аднаму, забяспечваюць яснасць, дакладнасць і лагічная ўзгодненасць прававых норм. Няўхільнае выкананне заканадаўцам прынцыпу прававой вызначанасці спрыяе прававой бяспецы і прадказальнасці прававога рэгулявання, павышае гарантыі дзяржаўнай абароны канстытуцыйных правоў і свабод асобы, служыць важным інструментам падтрымання даверу грамадзян да дзяржаўнай улады і яе інстытутаў.

Правяраючы канстытуцыйнасць Закона Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам противодействия незаконному обороту наркотических средств, психотропных веществ, их прекурсоров и аналогов», у рашэнні ад 8 ліпеня 2016 г. Канстытуцыйны Суд указаў на прававую калізію асобных норм дадзенага Закона з палажэннямі Закона Рэспублікі Беларусь «Об информации, информатизации и защите информации». Так, згодна з правяраемым Законам парадак фарміравання і вядзення Адзінай сістэмы ўліку асоб, якія спажываюць наркатычныя сродкі, псіхатропныя рэчывы, іх аналагі (далей — Адзіная сістэма ўліку), устанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, парадак абмену звесткамі аб асобах, уключаных у гэту сістэму, — Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь, у той час як у адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 18 Закона «Об информации, информатизации и защите информации» парадак атрымання, перадачы, збору, апрацоўкі, назапашвання, захоўвання і прадастаўлення інфармацыі аб прыватным жыцці фізічнай асобы і персанальных даных, а таксама карыстання імі ўстанаўліваецца заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыйны Суд неаднаразова адзначаў, што звесткі, на падставе якіх можна ўстанавіць асобу чалавека, адносяцца да персанальных даных (інфармацыі абмежаванага доступу), якія патрабуюць у сувязі з іх характарам выканання працэдуры апрацоўкі або выкарыстання такіх даных, каб пазбегнуць парушэння права на недатыкальнасць прыватнага жыцця. Улічваючы, што Адзіная сістэма ўліку прадугледжвае наяўнасць у ёй звестак аб прыватным жыцці і персанальных даных, патрабаванне абароны якіх вынікае з часткі трэцяй артыкула 34 Канстытуцыі, у мэтах выканання канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права Канстытуцыйны Суд указаў заканадаўцу на неабходнасць устаранення выяўленай прававой калізіі і рэгламентавання пытанняў забеспячэння канфідэнцыяльнасці такой інфармацыі непасрэдна ў Законе Рэспублікі Беларусь «О наркотических средствах, психотропных веществах, их прекурсорах и аналогах» для ўзмацнення абароны канстытуцыйных правоў і законных інтарэсаў асоб, уключаных у Адзіную сістэму ўліку, папярэджання залішняга ўмяшання ў іх асабістае жыццё з боку дзяржавы і трэціх асоб.

Пры праверцы канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «Об оценке соответствия техническим требованиям и аккредитации органов по оценке соответствия» Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 13 кастрычніка 2016 г. ажыццявіў ацэнку норм, якія надаюць права адпаведным органам і службовым асобам пры правядзенні праверак у ходзе ажыццяўлення кантролю (нагляду) у межах сваёй кампетэнцыі ў выпадках выяўлення пэўных парушэнняў выносіць прадпісанні аб прыпыненні (забароне) дзейнасці правяраемых суб'ектаў, з улікам прававой пазіцыі, выказанай ім у рашэнні ад 25 мая 2016 г. «О правовом регулировании приостановления деятельности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей». Сутнасць прававой пазіцыі заключаецца ў тым, што прыпыненне дзейнасці ў залежнасці ад мэты і падстаў прымянення можа выступаць у якасці розных па сваёй прававой прыродзе мер адміністрацыйнага прававога прымусу.

## СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ У 2016 ГОДЗЕ

Пры гэтым адсутнасць у Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (далей таксама — КабАП) палажэнняў аб адказнасці за парушэнні заканадаўства, якая выражаецца ў адміністрацыйным прыпыненні дзейнасці як відзе адміністрацыйнага спагнання, а ў Працэсуальна-выканаўчым кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (далей таксама — ПВКабАП) — такой меры забеспячэння адміністрацыйнага працэсу, як часовая забарона дзейнасці, сведчыць аб наяўнасці прававой нявызначанасці заканадаўчага рэгулявання адпаведных адносін.

На неабходнасць устаранення прававой калізіі ўказана ў рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 27 снежня 2016 г., прынятым у выніку ажыццяўлення кантролю канстытуцыйнасці палажэнняў Закона Рэспублікі Беларусь «О внесении дополнений и изменений в некоторые законы Республики Беларусь». У рашэнні адзначана, што комплексны аналіз норм правяраемага Закона сведчыць аб тым, што, карэкціруючы прававое рэгуляванне сацыяльных ільгот па плаце за карыстанне асобнымі жыллёва-камунальнымі паслугамі, у тым ліку ўстанаўліваючы сацыяльную льготу па плаце за тэхнічнае абслугоўванне ліфта для Герояў Беларусі, Герояў Савецкага Саюза і Герояў Сацыялістычнай Працы, поўных кавалераў ордэнаў Айчыны, Славы, Працоўнай Славы, ветэранаў і асоб, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, заканадавец грунтаваўся на змяненнях у прававым рэгуляванні структуры платы за жыллёва-камунальныя паслугі, якія прадугледжаны іншымі прынятымі пазней заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, у прыватнасці Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2015 г. № 535 «О предоставлении жилищно-коммунальных услуг», але не знайшлі адлюстравання ў адпаведных палажэннях Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым у мэтах рэалізацыі канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права, прытрымлівання паўнаты, дакладнасці і ўзгодненасці норм аб правах і абавязках суб'ектаў жыллёвых адносін, больш поўнага забеспячэння яснасці і даступнасці для грамадзян заканадаўчых патрабаванняў, якія датычацца платы за жыллёва-камунальныя паслугі, зразумеласці зместу прадастаўляемых ім у гэтай галіне сацыяльных ільгот Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу заканадаўца на неабходнасць выключэння калізіі нарматыўных прававых актаў праз унясенне ў Жыллёвы кодэкс змяненняў, якія датычацца структуры платы за жыллёва-камунальныя паслугі.

Такім чынам, прававыя пазіцыі Канстытуцыйнага Суда аб неабходнасці ўстаранення ў правяраемых законах выяўленых прававых калізій, прабелаў і іншых дэфектаў прававога рэгулявання дазваляюць перадольваць канстытуцыйна-прававую нявызначанасць норм законаў без прызнання іх неканстытуцыйнымі і, значыць, спрыяюць фарміраванню правапрымяняльнай практыкі на канстытуцыйна-прававой аснове. Такая дзейнасць Канстытуцыйнага Суда накіравана на дасягненне эфектыўнага канстытуцыйна-прававога рэгулявання і ўмацаванне канстытуцыйнай законнасці.

1.3. У шэрагу рашэнняў Канстытуцыйны Суд фармуляваў прававыя пазіцыі, адрасаваныя правапрымяняльнікам, з мэтай недапушчэння неканстытуцыйнага прымянення асобных палажэнняў законаў, якое на практыцы можа прывесці да парушэння канстытуцыйных правоў, свабод і законных інтарэсаў чалавека і грамадзяніна.

Так, у рашэнні ад 12 красавіка 2016 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О внесении дополнений и изменений в некоторые законы Республики Беларусь» пры ацэнцы канстытуцыйнасці нормы Закона «О противодействии экстремизму», што ўстанаўлівае судовы парадак прызнання матэрыялаў і арганізацый экстрэмісцкімі, Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу судоў агульнай юрысдыкцыі на неабходнасць забеспячэння вяршэнства права і канстытуцыйных палажэнняў, якія гарантуюць асноўныя правы і свабоды грамадзян, пры прыняцці ўказаных рашэнняў, а таксама пры разглядзе канкрэтных крымінальных спраў аб злачынствах экстрэмісцкай накіраванасці. Пры гэтым Канстытуцыйны Суд зыходзіў з таго, што крытыка якіх-небудзь дзеянняў прадстаўнікоў дзяржаўнай улады або іншых службовых асоб з'яўляецца неад'емным атрыбутам дэмакратычнай дзяржавы, паколькі гэта неабходна для забеспячэння адкрытасці дзяржаўных органаў, павышэння эфектыўнасці іх работы і якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва, у сувязі з чым такая крытыка сама па сабе не павінна разглядацца як праяўленне экстрэмізму, калі яна не пераходзіць мяжу, што аддзяляе гарантуемую кожнаму свабоду меркаванняў, перакананняў і іх свабоднае выяўленне (частка першая артыкула 33 Канстытуцыі) ад учынення проціпраўных дзеянняў, прадугледжаных прававаемым Законам.

Грунтуючыся на прынцыпах і нормах Канстытуцыі, у прыватнасці артыкуле 28 Канстытуцыі, згодна з якім кожны мае права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё, у тым ліку ад замаху на тайну яго карэспандэнцыі, тэлефонных і іншых паведамленняў, на яго гонар і годнасць, у адзінстве з часткай трэцяй артыкула 34 Канстытуцыі, якая замацоўвае, што карыстанне інфармацыяй можа быць абмежавана заканадаўствам у мэтах абароны гонару, годнасці, асабістага і сямейнага жыцця грамадзян і поўнага ажыццяўлення імі сваіх правоў, Канстытуцыйны Суд сфармуляваў шэраг прававых пазіцый, накіраваных на абарону персанальных даных і іншай інфармацыі аб фізічнай асобе.

Так, у рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 14 снежня 2016 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О внесении изменений и дополнений в законы Республики Беларусь по вопросам судоустройства и судопроизводства» дадзена ацэнка канстытуцыйнасці норм аб паўнамоцтвах суддзі на доступ, у тым ліку аддалены, да інфармацыйных сістэм дзяржаўных органаў і іншых арганізацый, якія змяшчаюць персанальныя даныя, на атрыманне бязвыплатна без пісьмовай згоды фізічных асоб ад дзяржаўных органаў, іншых арганізацый звестак з інфармацыйных сістэм, якія змяшчаюць персанальныя даныя, па пісьмовым запыце або на падставе пагаднення аб прадастаўленні персанальных даных, заключанага Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусь з уласнікам (уладальнікам) інфармацыйнага рэсурсу, а таксама паўнамоцтвах выканаўчага камітэта пасля папярэдняга адбору кандыдатаў у народныя засядацелі запытваць і атрымліваць ва ўстаноўленым парадку на бязвыплатнай аснове ад дзяржаўных органаў і іншых арганізацый без пісьмовай згоды грамадзян звесткі з інфармацыйных сістэм, якія змяшчаюць персанальныя даныя, даныя аб родзе занятКаў і іншыя звесткі аб кандыдатах у народныя засядацелі, па пісьмовым запыце або на падставе пагаднення аб прадастаўленні персанальных даных, заключанага з уласнікам (уладальнікам) інфармацыйнага рэсурсу (сістэмы). У названым рашэнні ўказана, што, дазваляючы трэцім асобам карыстацца персанальнымі данымі ў адпаведных выпадках незалежна ад згоды ўладальніка гэтых даных, заканадавец абмяжоўвае права дадзенай асобы ў рамках канстытуцыйнага права на абарону яе асабістага жыцця па сваім меркаванні распараджацца і (або) прадастаўляць такую інфармацыю, дазваляць або абмяжоўваць доступ да яе, вызначаць парадак і ўмовы такога доступу. Канстытуцыйны Суд лічыць, што прадугледжваемыя Законам выпадкі карыстання персанальнымі данымі трэцімі асобамі без высвятлення волі ўладальніка такіх даных адпавядаюць канстытуцыйным палажэнням, паколькі вызначаны законам у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, абароны правоў і свабод іншых асоб, суразмерныя такім інтарэсам і абгрунтаваныя. Пры гэтым Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу правапрымяняльнікаў на тое, што для абароны грамадзяніна ад неапраўданага адвольнага ўмяшання ў яго асабістае жыццё рэалізацыя паўнамоцтваў па доступе, уключаючы аддалены, да інфармацыйных сістэм, якія змяшчаюць персанальныя даныя, без пісьмовай згоды фізічных асоб магчыма толькі ў выпадках, прадугледжаных законам, павінна мець правамерныя мэты і быць неабходнай для іх дасягнення.

Аналагічныя вывады, якія датычацца абароны персанальных даных і іншай інфармацыі аб фізічнай асобе, сфармуляваны Канстытуцыйным Судом у адрас правапрымяняльнікаў і ў іншых рашэннях пры ацэнцы канстытуцыйнасці норм, якія рэгулююць падобныя грамадскія адносіны (рашэнні ад 2 чэрвеня 2016 г. № Р-1037, ад 6 ліпеня 2016 г. № Р-1050, ад 8 ліпеня 2016 г. № Р-1057 і ад 27 снежня 2016 г. № Р-1078).

У выніку ажыццяўлення кантролю канстытуцыйнасці дапаўненняў і змяненняў, што ўносяцца ў Закон Рэспублікі Беларусь «Об основах системы профилактики безнадзорности и правонарушений несовершеннолетних», у рашэнні ад 29 снежня 2016 г. Канстытуцыйны Суд выказаў прававую пазіцыю, згодна з якой з улікам асаблівай важнасці захавання правоў і законных інтарэсаў непаўналетніх, асаблівасцей іх інтэлектуальнага, духоўна-маральнага і псіхафізіялагічнага развіцця, абвостранага пачуцця незалежнасці і ўспрымання любой несправядлівасці пры рэалізацыі палажэнняў Закона, што прадугледжваюць магчымасць правядзення асабістага надгляду і надгляду рэчаў названых асоб, у кожным канкрэтным выпадку неабходна прытрымлівацца вызначаемай заканадаўцам мэты такіх надглядаў, а менавіта выяўлення і адабрання прадметаў і рэчываў, забароненых да захоўвання і выкарыстання ў адпаведных спецыяльных установах, у тым ліку здольных прычыніць шкоду здароўю; прытрымлівання асобамі, якія праводзяць надгляды, канстытуцыйных гарантый забеспячэння годнасці асобы і недапушчэння зневажаючага яе годнасць абыходжання, а таксама абароны ад замаху на годнасць (часткі першая і трэцяя артыкула 25, артыкул 28 Канстытуцыі).

Пры праверцы канстытуцыйнасці палажэнняў артыкулаў 65—67 Закона Рэспублікі Беларусь «О предоставлении иностранным гражданам и лицам без гражданства статуса беженца, дополнительной защиты, убежища и временной защиты в Республике Беларусь» у рашэнні ад 11 ліпеня 2016 г. Канстытуцыйны Суд адзначыў, што ў адпаведнасці з Заключэннем Выканаўчага камітэта УВКБ ААН па міжнароднай абароне № 96 (LIV) 2003 года любая высылка павінна ажыццяўляцца гуманна, з захаваннем правоў чалавека, а галоўным меркаваннем у гэтым выпадку павінны быць найлепшыя інтарэсы дзяцей. Зыходзячы з міжнародна-прававых стандартаў, якія патрабуюць захавання правоў дзяцей на асаблівую абарону і дапамогу, Канстытуцыйны Суд указаў, што пры прыняцці ў адносінах да іншаземцаў, на ўтрыманні якіх знаходзяцца дзеці, рашэнняў аб страце або ануляванні статусу бежанца або дадатковай абароны, а таксама страты або пазбаўлення сховішча правапрымяняльніку неабходна кіравацца таксама прынцыпам забеспячэння найлепшых інтарэсаў дзіцяці.

Такім чынам, грунтуючыся на прынцыпах і нормах Канстытуцыі, неабходнасці гарантавання дзяржавай правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, улічваючы, што Канстытуцыя надае заканадаўцу поўныя дыскрэцыйныя паўнамоцтвы па рэгуляванні грамадскіх адносін, Канстытуцыйны Суд у мэтах павышэння эфектыўнасці заканадаўчага рэгулявання выкладаў прававыя пазіцыі, накіраваныя на забеспячэнне вяршэнства права і вяршэнства Канстытуцыі. Прававыя пазіцыі, адрасаваныя правапрымяняльнікам, фармуляваліся перш за ўсё для таго, каб суб'екты праваадносін пры выкананні законаў не скажалі выяўлены ў рашэннях Канстытуцыйнага Суда канстытуцыйна-прававы сэнс норм закона, не дапускалі падмены адной канстытуцыйнай каштоўнасці другой або іх прымяншэння.

2. Выкананне і абарона канстытуцыйных правоў, свабод і законных інтарэсаў чалавека і грамадзяніна з'яўляюцца адным з галоўных элементаў прынцыпу вяршэнства права ў прававой дэмакратычнай дзяржаве, а таксама паказчыкам стану канстытуцыйнай законнасці і правапарадку ў грамадстве і дзяржаве. У той ж час заканадавец, зыходзячы са сваіх канстытуцыйных паўнамоцтваў, мае права ўстанаўліваць абмежаванні і забароны, кіруючыся пры гэтым прынцыпам прапарцыянальнасці, з улікам якога Канстытуцыйны Суд ацэньвае канстытуцыйнасць такога заканадаўчага рэгулявання. Пры праверцы ўводзімых заканадаўцам абмежаванняў у адносінах да асобных правоў і свабод у рашэннях Канстытуцыйнага Суда фармуляваліся прававыя пазіцыі, у тым ліку ў адрас правапрымяняльнікаў, з мэтай усведамлення канстытуцыйна-прававога сэнсу ўстанаўліваемых абмежаванняў, забеспячэння належнага балансу паміж канстытуцыйнымі правамі і свабодамі асобы і інтарэсамі дзяржавы і грамадства.

Так, Канстытуцыйным Судом дадзена ацэнка канстытуцыйнасці дапаўнення, уносімага ў артыкул 13 Закона Рэспублікі Беларусь «О борьбе с терроризмом», згодна з якім асобы, якія праводзяць контртэрарыстычную аперацыю, маюць права ўваходзіць беспярэшкодна, пры неабходнасці з пашкоджаннем замыкаючых прылад і іншых прадметаў, у любы час сутак у жыллё або іншыя законныя ўладанні грамадзян, у памяшканні і (або) іншыя аб'екты дзяржаўных органаў і іншых арганізацый і аглядаць іх пры праследаванні асоб, якія падазраюцца ва ўчыненні акта тэрарызму, стварэнні тэрарыстычнай арганізацыі, незаконнага ўзброенага фарміравання, кіраўніцтве імі або ўдзеле ў іх дзейнасці з далейшым паведамленнем аб гэтым пракурору на працягу 24 гадзін. У рашэнні ад 21 чэрвеня 2016 г. Канстытуцыйны Суд адзначыў, што правядзенне названых мерапрыемстваў звязана з умяшаннем у асабістае жыццё грамадзян і ў поўнай меры абмяжоўвае прадугледжаныя Канстытуцыяй правы на абарону ад незаконнага ўмяшання ў асабістае жыццё (артыкул 28) і на недатыкальнасць жылля і іншых законных уладанняў (артыкул 29). Разам з тым, па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, такое абмежаванне з'яўляецца аб'ектыўна абумоўленым і вымушаным сродкам, неабходным для дасягнення сацыяльна апраўданай мэты барацьбы з тэрарызмам, паколькі ў адпаведнасці з часткай першай артыкула 23 Канстытуцыі яно дапушчальна ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб. Аднач Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу правапрымяняльнікаў на неабходнасць няўхільнага выканання патрабаванняў разумнай суразмернасці дапушчальных і апраўданых абмежаванняў правоў і свабод асобы мэтам абароны канстытуцыйных асноў бяспекі грамадства і дзяржавы шляхам дасягнення балансу абараняемых каштоўнасцей.

Правяраючы канстытуцыйнасць змяненняў і дапаўненняў, якія ўносяцца ў КВК, Канстытуцыйны Суд, улічваючы канстытуцыйныя паўнамоцтвы заканадаўца, у рашэнні ад 6 ліпеня 2016 г. канстатаваў, што прававое рэгуляванне, накіраванае на прыцягненне асуджаных ва ўстаноўленым законам парадку да абавязковай працы, не можа разглядацца як адвольнае ўскладанне на іх дадатковых абавязкаў, паколькі назначэнне судом асуджанаму пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі абумоўлівае неабходнасць і магчымасць выкарыстоўваць у сілу закона ў якасці аднаго з асноўных сродкаў выпраўлення асуджаных іх прыцягненне да калектыўна карыснай працы. У сувязі з гэтым прадугледжваемыя ў заканадаўчым парадку патрабаванні, абавязкі і забароны аб'ектыўна апраўданыя, абгрунтаваныя, адпавядаюць канстытуцыйна значным мэтам, часткі першай артыкула 23 Канстытуцыі. Пры гэтым Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу правапрымяняльнікаў на неабходнасць пры рэалізацыі палажэнняў правяраемага Закона, якія вызначаюць парадак і ўмовы выканання і адбывання асуджанымі пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці, зыходзіць з таго, што асновай прававога статусу такіх асоб з'яўляецца агульны прававы статус асобы, замацаваны ў раздзеле II Канстытуцыі, за выключэннямі, неабходнымі для дасягнення мэт крымінальнага пакарання з улікам гарантый абароны правоў, свабод і законных інтарэсаў асуджаных, устаноўленых законам умоў прымянення ў адносінах да іх пакарання і іншых мер крымінальнай адказнасці, гарантый сацыяльнай справядлівасці, іх сацыяльнай, прававой і іншай абароненасці.

Такім чынам, пры ажыццяўленні кантролю за канстытуцыйнасцю заканадаўчых палажэнняў аб абмежаваннях і забаронах Канстытуцыйны Суд грунтуецца на сфармуляваных раней і не губляючых актуальнасці прававых пазіцыях, згодна з якімі ўвядзенне абмежаванняў і забарон для выканання дзяржавай сваіх канстытуцыйных функцый і абавязкаў не павінна ажыццяўляцца заканадаўцам адвольна, быць несправядлівым і неабгрунтаваным. Выкананне прынцыпу прапарцыянальнасці пры ўстанаўленні абмежаванняў і забарон дазваляе дасягнуць балансу паміж канстытуцыйнымі правамі і свабодамі асобы і публічнымі інтарэсамі дзяржавы і грамадства. Заканадавец абавязаны таксама ўлічваць, што любыя абмежаванні канстытуцыйных правоў і свабод павінны не толькі быць юрыдычна дапушчальнымі, але і адпавядаць патрабаванням справядлівасці і суразмернасці канстытуцыйна прызнаваемым мэтам такіх абмежаванняў, гэта значыць зыходзячы з вяршэнства Канстытуцыі і з прытрымліваннем прынцыпу вяршэнства права, які мае значэнне ўніверсальнай каштоўнасці, на якой базіруюцца гарантыі правоў і свабод асобы.

3. У Канстытуцыі ўстанаўліваецца, што Рэспубліка Беларусь валодае вяршэнствам і паўнатой улады на сваёй тэрыторыі, самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку; у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права можа на добраахвотнай аснове ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні і выходзіць з іх.

З улікам узятых Рэспублікай Беларусь міжнародных абавязацельстваў працягваецца працэс гарманізацыі нацыянальнага заканадаўства ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза (далей таксама — ЕАЭС), што прадугледжвае ўнясенне адпаведных змяненняў і дапаўненняў у заканадаўства Рэспублікі Беларусь. Пры ацэнцы канстытуцыйнасці такіх змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыйны Суд, грунтуючыся на прынцыпах і нормах Канстытуцыі, у шэрагу рашэнняў фармуляваў прававыя пазіцыі ў адрас заканадаўца і правапрымяняльнікаў з улікам суадносін міжнароднага і нацыянальнага права.

Так, пры праверцы канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «О карантине и защите растений» у рашэнні ад 6 ліпеня 2016 г. Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу на норму, якая ўстанаўлівае, што калі іншае не прадугледжана міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, то ўвоз у Рэспубліку Беларусь падкарантыннай прадукцыі з высокай фітасанітарнай рызыкай дапускаецца пры наяўнасці фітасанітарнага сертыфіката на такую прадукцыю. Канстытуцыйны Суд лічыць, што заканадаўчае патрабаванне аб наяўнасці пры ўвозе ў Рэспубліку Беларусь падкарантыннай прадукцыі з высокай фітасанітарнай рызыкай адпаведнага сертыфіката накіравана на забеспячэнне гарантый рэалізацыі правоў грамадзян на ахову здароўя і спрыяльнае навакольнае асяроддзе (частка першая артыкула 45 і частка першая артыкула 46 Канстытуцыі), а таксама на выкананне канстытуцыйнага абавязку дзяржавы прымаць адпаведныя меры па ахове навакольнага асяроддзя, які вынікае з часткі другой артыкула 46 Канстытуцыі.

Канстытуцыйны Суд праверыў канстытуцыйнасць змяненняў і дапаўненняў, якія ўносяцца ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь і КабАП, што прадугледжваюць адпаведна крымінальную адказнасць за парушэнне санітарна-эпідэміялагічных, гігіенічных патрабаванняў і працэдур, устаноўленых тэхнічным рэгламентамі Мытнага саюза, ЕАЭС, ці санітарных норм і правіл, гігіенічных нарматываў, якое выклікала па неасцярожнасці захворванні або атручэнні людзей, і адміністрацыйную адказнасць за аналагічныя дзеянні, якія не выклікалі названых вынікаў, а таксама адміністрацыйную адказнасць за парушэнне патрабаванняў такіх тэхнічных рэгламентаў. У рашэнні ад 8 ліпеня 2016 г. Канстытуцыйны Суд прыйшоў да вываду аб тым, што прадугледжваемае прававое рэгуляванне абумоўлена неабходнасцю далейшага развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі і прызначана дапамагаць вырашэнню агульных задач, якія стаяць перад дзяржавамі — членамі дадзенага міждзяржаўнага ўтварэння, па ўстойлівым эканамічным развіцці, усебаковай мадэрнізацыі і ўзмацненні канкурэнтаздольнасці нацыянальных эканомік у рамках глабальнай эканомікі. Зыходзячы з актуальнасці пытанняў суадносін нацыянальнага і наднацыянальнага права, Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу заканадаўца на неабходнасць пры далейшым удасканаленні нарматыўна-прававога рэгулявання адпаведных адносін улічваць таксама права ЕАЭС, забяспечваючы адзінства прынцыпаў і падыходаў да гарманізацыі і ўніфікацыі заканадаўства.

*(Заканчэнне на 12–13-й стар.)*

## РАШЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА

# АБ СТАНЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 10—11-й стар.)*

У ходзе праверкі канстытуцыйнасці змяненняў, якія ўносяцца ў артыкулы 10 і 15 Закона «О наркотических средствах, психотропных веществах, их прекурсорах и аналогах», у рашэнні ад 8 ліпеня 2016 г. Канстытуцыйны Суд адзначыў, што прававое рэгуляванне адносін, звязаных з названымі аб'ектамі, на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца не толькі нацыянальным заканадаўствам, але і прававымі актамі, якія складаюць нарматыўную прававую базу ЕАЭС. Такое прававое рэгуляванне грунтуецца на норме часткі другой артыкула 8 Канстытуцыі, згодна з якой Рэспубліка Беларусь у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права можа на добраахвотнай аснове ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні і выходзіць з іх. Канстытуцыйны Суд таксама канстатаваў, што парадак увозу на мытную тэрыторыю ЕАЭС і вывазу з яго мытнай тэрыторыі наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсораў, парадак перамяшчэння і перавозкі дадзеных сродкаў прадугледжваюцца ў шэрагу міжнародна-прававых актаў, абавязковых для прымянення Рэспублікай Беларусь. Удзел Беларусі ў ЕАЭС абумоўлівае неабходнасць выпрацоўкі на заканадаўчым узроўні і ў правапрымяняльнай практыцы адзіных падыходаў.

У рашэнні ад 13 кастрычніка 2016 г., вынесеным у выніку праверкі канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «Об оценке соответствия техническим требованиям и аккредитации органов по оценке соответствия», адзначана, што тэхнічныя рэгламенты ЕАЭС, рашэнні пастаянна дзеючага органа — Еўразійскай эканамічнай камісіі, прынятыя ў рамках яе паўнамоцтваў, прызнаюцца ў Рэспубліцы Беларусь актамі, якія рэгулююць адносіны ў галіне ацэнкі адпаведнасці тэхнічным патрабаванням тэхнічных рэгламентаў ЕАЭС. Разам з тым з улікам вяршэнства Канстытуцыі і палажэння прэамбулы Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, якое прадугледжвае неабходнасць безумоўнага прытрымлівання ўсімі яго бакамі прынцыпу вяршэнства канстытуцыйных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, Канстытуцыйны Суд лічыць, што ўстанаўліваемы названым Законам прыярытэт права ЕАЭС у рэгуляванні адпаведных адносін не павінен прыводзіць да парушэння правоў і свабод грамадзян, гарантаваных Канстытуцыяй.

Пры выпрацоўцы прававых пазіцый, звязаных з гарманізацыяй і ўніфікацыяй нацыянальнага і наднацыянальнага заканадаўства, Канстытуцыйны Суд зыходзіць з вяршэнства Канстытуцыі, неабходнасці забеспячэння вяршэнства права на нацыянальным і міжнародным узроўнях, прызнання дзяржавай агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права, недапушчэння зніжэння гарантаванасці і абароны канстытуцыйных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна.

## II

Канстытуцыйны Суд у адпаведнасці з часткай чацвёртай артыкула 116 Канстытуцыі і часткай першай артыкула 22 Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў па прапановах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Палаты прадстаўнікоў, Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь дае заключэнні аб канстытуцыйнасці нарматыўных актаў у парадку ажыццяўлення наступнага канстытуцыйнага кантролю.

У 2016 годзе ўпаўнаважаныя суб'екты з прапановамі аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў у Канстытуцыйны Суд не звярталіся. Гэта сведчыць аб тым, што ў цяперашні час органы дзяржаўнай улады ўсіх узроўняў у ходзе падрыхтоўкі і прыняцця законаў знаходзяць канструктыўныя рашэнні па ўрэгуляванні грамадскіх адносін пры няўхільным выкананні канстытуцыйных прадпісанняў.

У адпаведнасці з часткай чацвёртай артыкула 22 Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў грамадзяне, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, арганізацыі маюць права звярнацца з ініцыятывай аб унясенні прапаноў, разгляд якіх падведамны Канстытуцыйнаму Суду, да органаў, якія валодаюць правам унясення ў Канстытуцыйны Суд такіх прапаноў.

У 2016 годзе ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Палату прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Савет Міністраў паступілі 72 ініцыятыўныя звароты. У зваротах ставіліся пытанні аб неадпаведнасці, па меркаванні заяўнікаў, Канстытуцыі асобных палажэнняў нарматыўных прававых актаў, якія маглі б стаць прадметам разгляду ў Канстытуцыйным Судзе. Аднак прапаноў, заснаваных на ініцыятыўных зваротах, ад упаўнаважаных суб'ектаў у Канстытуцыйны Суд не паступала.

У мэтах павышэння дзейснасці ўскоснага доступу да канстытуцыйнага правасуддзя Законам Рэспублікі Беларусь ад 22 снежня 2016 года «О внесении изменений и дополнений в законы Республики Беларусь по вопросам судоустройства и судопроизводства» ў Кодэкс аб судаўладкаванні і статусе суддзяў і Закон «О конституционном судопроизводстве» ўнесены шэраг змяненняў і дапаўненняў, у тым ліку звязаных з удасканаленнем працэдуры вывучэння і адбору змешчаных у ініцыятыўных зваротах грамадзян і арганізацый пытанняў, якія падлягаюць праверцы Канстытуцыйным Судом. Удакладненне прававой рэгламентацыі парадку накіравання ініцыятыўных зваротаў, іх разгляду і ўнясення ўпаўнаважанымі органамі заснаванай на ініцыятыўным звароце прапановы ў Канстытуцыйны Суд накіравана на эфектыўнае выкарыстанне ўскоснага доступу да канстытуцыйнага правасуддзя для ўзмацнення гарантый абароны канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян.

## III

Згодна з абзацам восьмым часткі трэцяй артыкула 22 Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў да кампетэнцыі Канстытуцыйнага Суда адносіцца прыняцце рашэнняў аб устараненні ў нарматыўных прававых актах прабелаў, выключэнні ў іх калізій і прававой нявызначанасці. Падставай для ўзбуджэння вядзення па такіх справах у адпаведнасці з часткай першай артыкула 158 Закона «О конституционном судопроизводстве» з'яўляюцца паступіўшыя ў Канстытуцыйны Суд звароты дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, а таксама грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, якія змяшчаюць інфармацыю аб наяўнасці ў нарматыўных прававых актах прабелаў, калізій і прававой нявызначанасці.

У 2016 годзе ў Канстытуцыйны Суд ад грамадзян і юрыдычных асоб паступіла 744 звароты, у тым ліку пісьмовых — 417, электронных — 148, вусных — 179. У зваротах пастаўлена больш як 780 пытанняў прававога характару, у прыватнасці аб праверцы канстытуцыйнасці нарматыўных прававых актаў, аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у нарматыўныя прававыя акты, аб устараненні ў нарматыўных прававых актах прабелаў, выключэнні ў іх калізій і прававой нявызначанасці, аб тлумачэнні нарматыўных прававых актаў, аб выкананні і тлумачэнні рашэнняў Канстытуцыйнага Суда.

1. З улікам канстытуцыйна-прававога значэння пастаўленых у шэрагу зваротаў пытанняў Канстытуцыйным Судом у 2016 годзе прыняты рашэнні аб неабходнасці ўстаранення заканадаўцам прабелаў у прававым рэгуляванні права на абскарджанне рашэнняў падатковых органаў, дзеянняў (бяздзейнасці) іх службовых асоб, а таксама прававой нявызначанасці ў прававым рэгуляванні прыпынення дзейнасці юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

1.1. У рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 26 красавіка 2016 г. «О праве на обжалование решений налоговых органов, действий (бездействия) их должностных лиц» звернута ўвага на тое, што асоба, указаная ў акце праверкі падатковага органа як асоба, якая дапусціла сваімі дзеяннямі (бяздзейнасцю) парушэнне падатковага заканадаўства, але спыніла працоўныя адносіны з арганізацыяй-даўжніком, у адпаведнасці з Падатковым кодэксам Рэспублікі Беларусь (далей — ПК) права на абскарджанне такога рашэння ў цяперашні час не мае.

У той жа час згодна з Канстытуцыяй дзяржава абавязана забяспечыць рэалізацыю канстытуцыйнага права на зварот у дзяржаўныя органы (артыкул 40) і доступ да правасуддзя кожнай асобе (артыкул 60), чые правы і законныя інтарэсы закранаюцца рашэннямі падатковых органаў, дзеяннямі (бяздзейнасцю) іх службовых асоб.

Па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, адсутнасць у заканадаўстве Рэспублікі Беларусь у іншых асоб, чые правы і законныя інтарэсы закранаюцца рашэннем падатковага органа, у адрозненне ад асоб, вызначаных у артыкуле 85 ПК, права на абскарджанне такога рашэння абмяжоўвае іх права на судовую абарону, не забяспечвае справядлівасць судовага рашэння, у сувязі з чым не захоўваецца баланс публічна-прававых і прыватнаправавых інтарэсаў. Нарматыўна-прававая рэгламентацыя, пры якой магчымасць ініцыіравання ацэнкі судом законнасці актаў падатковых органаў залежыць ад меркавання іншых асоб, не забяспечвае вяршэнства норм Канстытуцыі, якія гарантуюць кожнаму права на судовую абарону, не дазваляе ўсім зацікаўленым асобам належным чынам абараняць свае правы і законныя інтарэсы, не спрыяе своечасовасці і эфектыўнасці аднаўлення парушаных правоў. Канстытуцыйны Суд прызнаў, што дзеючае прававое рэгуляванне абскарджання рашэнняў падатковых органаў, дзеянняў (бяздзейнасці) іх службовых асоб не можа быць прызнана дастатковым для забеспячэння поўнай і эфектыўнай судовай абароны правоў і свабод як неабходнага элемента канстытуцыйна-прававога рэжыму, заснаванага на прынцыпах вяршэнства права і прававой дзяржавы. Зніжэнне ўзроўню гарантый судовай абароны асоб, правы і законныя інтарэсы якіх, па іх меркаванні, парушаюцца рашэннямі падатковых органаў, у параўнанні з асобамі, правы якіх на аспрэчванне такіх рашэнняў устаноўлены ў заканадаўчым парадку, нельга прызнаць справядлівым і суразмерным канстытуцыйна абараняемым інтарэсам.

У мэтах выканання канстытуцыйных прынцыпаў вяршэнства права і законнасці, рэалізацыі канстытуцыйнага права кожнага на судовую абарону Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным устараненне заканадаўцам прабелу канстытуцыйна-прававога рэгулявання права на абскарджанне рашэнняў падатковых органаў, дзеянняў (бяздзейнасці) іх службовых асоб шляхам унясення ў ПК змяненняў і дапаўненняў, якія прадугледжваюць права кожнай асобы на абскарджанне рашэнняў падатковых органаў, дзеянняў (бяздзейнасці) іх службовых асоб, калі, па меркаванні асоб, такія рашэнні, дзеянні або бяздзейнасць парушаюць яе правы і законныя інтарэсы.

1.2. У рашэнні Канстытуцыйнага Суда ад 25 мая 2016 г. «О правовом регулировании приостановления деятельности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей» адзначана, што прадугледжанае Канстытуцыяй права кожнага на судовую абарону (частка першая артыкула 60) выступае гарантыяй рэалізацыі ўсіх іншых канстытуцыйных правоў і свабод і носіць універсальны характар.

Пры ўстанаўленні прававога рэгулявання прыпынення дзейнасці юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, адміністрацыйнай адказнасці, у тым ліку пры вызначэнні саставаў адміністрацыйных правапарушэнняў і відаў адміністрацыйных спагнанняў, а таксама мер забеспячэння адміністрацыйнага працэсу, заканадавец у сілу артыкулаў 21, 23, 97 і 98 Канстытуцыі абавязаны зыходзіць з недапушчальнасці адмены або прымяншэння правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, якія прызнаюцца і гарантуюцца ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, а таксама з магчымасці іх абмежавання толькі законам суразмерна канстытуцыйна значным мэтам у інтарэсах нацыянальнай бяспекі, грамадскага парадку, абароны маралі, здароўя насельніцтва, правоў і свабод іншых асоб.

Для павышэння ўзроўню абароны правоў і свабод грамадзян у сферы праваадносін, звязаных з адміністрацыйнай адказнасцю, заканадаўчыя механізмы ў гэтай сферы павінны адпавядаць выніковаму з артыкулаў 21, 22, 23 і 60 Канстытуцыі абавязку дзяржавы ў поўнай меры забяспечваць ажыццяўленне права на судовую абарону, якая павінна быць справядлівай, кампетэнтнай і эфектыўнай. Па меркаванні Канстытуцыйнага Суда, адсутнасць у Кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях палажэнняў аб адказнасці за парушэнні заканадаўства, якая выражаецца ў адміністрацыйным прыпыненні дзейнасці як відзе адміністрацыйнага спагнання, а ў Працэсуальна-выканаўчым кодэксе аб адміністрацыйных правапарушэннях — такой меры забеспячэння адміністрацыйнага працэсу, як часовая забарона дзейнасці, сведчыць аб наяўнасці прававой нявызначанасці заканадаўчага рэгулявання адпаведных адносін. Гэта можа прыводзіць да парушэння правоў суб'ектаў гаспадарання, паколькі права на судовую абарону ўключае ў сябе не толькі права на зварот у суд, але і гарантаваную дзяржавай магчымасць атрымання рэальнай судовай абароны, а таксама канкрэтныя гарантыі ацэнкі законнасці дзеянняў (бяздзейнасці) упаўнаважаных суб'ектаў з пункта гледжання выканання імі норм законаў, абгрунтаванасці прыпынення дзейнасці, гэта значыць яго адпаведнасці канстытуцыйным патрабаванням справядлівасці і суразмернасці, а таксама прававой бяспекі.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што ўстараненне прававой нявызначанасці ў прававым рэгуляванні прыпынення дзейнасці юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў у заканадаўчых актах шляхам устанаўлення ў КаАП адміністрацыйнай адказнасці за парушэнні заканадаўства, якая выражаецца ў адміністрацыйным прыпыненні дзейнасці як відзе адміністрацыйнага спагнання, а ў ПВКабАП — такой меры забеспячэння адміністрацыйнага працэсу, як часовая забарона дзейнасці, накіравана на рэалізацыю прынцыпаў і норм Канстытуцыі.

У мэтах выканання канстытуцыйных прынцыпаў вяршэнства права і законнасці, роўнасці ўсіх перад законам Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным устараненне заканадаўцам прававой нявызначанасці ў канстытуцыйна-прававым рэгуляванні прыпынення дзейнасці юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

2. Акрамя таго, на падставе паступіўшых у 2016 годзе зваротаў Канстытуцыйным Судом унесены прапановы ў нарматворчыя органы па ўстараненні прабелаў у прававым рэгуляванні ў адпаведнасці з часткай першай артыкула 72 Закона Рэспублікі Беларусь «О нормативных правовых актах Республики Беларусь».

2.1. Так, па выніках аналізу пытання аб прававым рэгуляванні кампенсавання сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку рабочага (служачага) ва ўстановах прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, у прапанове Канстытуцыйнага Суда адзначана, што адным з важнейшых канстытуцыйных правоў, абумоўленых прыродай Рэспублікі Беларусь як сацыяльнай дзяржавы, з'яўляецца права кожнага на адукацыю. Фармулёўку «средства, затраченные государством на подготовку», замацаваную ў пункце 1 артыкула 88 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, ва ўзаемасувязі з вызначэннямі агульнай сярэдняй і прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, прадугледжанымі ў артыкулах 152 і 168 дадзенага Кодэкса, неабходна разумець як сродкі, затрачаныя дзяржавай на прафесійную падрыхтоўку грамадзяніна як спецыяліста (рабочага, служачага). Ажыццяўляемае ў адпаведнасці з Кодэксам аб адукацыі прававое рэгуляванне ў частцы вызначэння памеру кампенсавання ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку такога спецыяліста, не павінна супярэчыць канстытуцыйна значным мэтам і прынцыпам, прымяншаць або абмяжоўваць правы і законныя інтарэсы грамадзян, парушаць справядлівы баланс прыватных і публічных інтарэсаў, што можа быць забяспечана шляхам устанаўлення асаблівасцей кампенсавання сродкаў асобамі, якія атрымалі ва ўстанове прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі нароўні з кваліфікацыяй рабочага, служачага таксама агульную сярэднюю адукацыю.

З мэтай належнага гарантавання канстытуцыйнага права на бясплатнасць агульнай сярэдняй адукацыі, забеспячэння і рэалізацыі канстытуцыйнага прынцыпу роўнасці ўсіх перад законам Савету Міністраў прапанавана прыняць меры па замацаванні дыферэнцыраванага парадку кампенсавання сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку рабочага, служачага ў дзяржаўнай установе прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі з адначасовым атрыманнем ім агульнай сярэдняй адукацыі, які заключаецца ў недапушчальнасці ўключэння сродкаў, затрачаных дзяржавай на атрыманне навучэнцам агульнай сярэдняй адукацыі, у агульную суму, што падлягае кампенсаванню.

Дадзеная прапанова Канстытуцыйнага Суда рэалізавана ў пастанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 7 снежня 2016 г. № 998 «О внесении изменений и дополнений в постановление Совета Министров Республики Беларусь от 22 июня 2011 г. № 821».

2.2. У прапанове Канстытуцыйнага Суда адносна прававога рэгулявання асобных абмежаванняў у сферы барацьбы з карупцыяй звернута ўвага на тое, што згодна з часткай другой артыкула 17 Закона Рэспублікі Беларусь «О борьбе с коррупцией» кіраўнікі дзяржаўных арганізацый і арганізацый, у статутных фондах якіх 50 і больш працэнтаў долі (акцый) знаходзіцца ва ўласнасці дзяржавы і (або) яго адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, маюць права ажыццяўляць педагагічную дзейнасць толькі ў частцы рэалізацыі зместу адукацыйных праграм. Пры гэтым у дадзенай норме не ўлічваецца ажыццяўленне спецыфічнай педагагічнай дзейнасці, замацаванай у Законе Рэспублікі Беларусь «О физической культуре и спорте». Акрамя таго, у частцы першай артыкула 255 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь устаноўлена забарона на выкананне аплачваемай працы на ўмовах сумяшчальніцтва, а ў частцы другой артыкула 17 Закона «О борьбе с коррупцией» — на выкананне іншай аплачваемай працы, не звязанай з выкананнем службовых (працоўных) абавязкаў на месцы асноўнай службы (працы). З гэтага бачна, што дадзеныя заканадаўчыя акты замацоўваюць абмежаванні, розныя з пункта гледжання як выкарыстоўваемых фармулёвак, так і аб'ёму такіх абмежаванняў. Адначасова ўстаноўлена, што асобнымі дзяржаўнымі органамі па-рознаму разумеецца сутнасць названых абмежаванняў.

Зыходзячы з канстытуцыйнага прынцыпу вяршэнства права, у мэтах недапушчэння неабгрунтаванага абмежавання права грамадзян на працу Канстытуцыйны Суд прапанаваў Савету Міністраў устараніць прававую нявызначанасць у частцы другой артыкула 17 Закона «О борьбе с коррупцией» адносна сутнасці прадугледжанага ў ёй абмежавання, а таксама разгледзець пытанне аб замацаванні ва ўстаноўленым парадку ў дадзенай норме ў якасці выключэння з забароны на выкананне работ, нароўні з педагагічнай дзейнасцю, педагагічнай дзейнасці ў сферы фізічнай культуры і спорту.

2.3. Пры аналізе прававой рэгламентацыі некаторых пытанняў прадастаўлення адтэрміноўкі ад прызыву на ваенную службу Канстытуцыйны Суд устанавіў, што дзеючае прававое рэгуляванне не дазваляе грамадзянам, якія атрымалі вышэйшую адукацыю II ступені ў лютым месяцы, скарыстаць адтэрміноўку ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве для прадаўжэння адукацыі ў аспірантуры (ад'юнктуры), дактарантуры, паколькі неабходныя дакументы, якія пацвярджаюць прыём дакументаў у аспірантуру (дактарантуру), не могуць быць імі прадстаўлены ў лютым — маі ў сувязі з пачаткам іх прыёму з 1 чэрвеня. Гэта не адпавядае канстытуцыйнаму прынцыпу роўнасці, а таксама не забяспечвае рэалізацыю такіх прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі, вызначаных артыкулам 2 Кодэкса аб адукацыі, як прыярытэт правоў чалавека, гарантыі канстытуцыйнага права кожнага на адукацыю, забеспячэнне роўнага доступу да атрымання адукацыі.

Для забеспячэння канстытуцыйнага права грамадзян на адукацыю Канстытуцыйны Суд прапанаваў Савету Міністраў ва ўстаноўленым парадку прыняць меры па замацаванні ў заканадаўстве з улікам канстытуцыйнага прынцыпу роўнасці ўсіх перад законам прававога механізму рэалізацыі права на адтэрміноўку ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве для прадаўжэння адукацыі ў аспірантуры (ад'юнктуры), дактарантуры.

Такім чынам, у рамках сваёй кампетэнцыі па ўстараненні ў нарматыўных прававых актах прабелаў, выключэнні ў іх калізій і прававой нявызначанасці Канстытуцыйны Суд, зыходзячы з вяршэнства права, прыняў шэраг рашэнняў і сфармуляваў прававыя пазіцыі, адрасаваныя Парламенту, а таксама накіраваў прапановы Савету Міністраў па ўстараненні прабелаў прававога рэгулявання ў мэтах рэалізацыі і абароны канстытуцыйных правоў і свабод грамадзян.

## IV

Своечасовае і поўнае выкананне рашэнняў Канстытуцыйнага Суда ўплывае на эфектыўнасць і дзейснасць канстытуцыйнага правасуддзя. У адпаведнасці з артыкулам 24 Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў заключэнні

## СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ У 2016 ГОДЗЕ

і рашэнні Канстытуцыйнага Суда з'яўляюцца канчатковымі, абскарджанню і апратэставанню не падлягаюць, дзейнічаюць непасрэдна і не патрабуюць пацвярджэння іншымі дзяржаўнымі органамі, арганізацыямі, службовымі асобамі, уступаюць у сілу з дня іх прыняцця, калі ў гэтых актах не вызначаны іншы тэрмін. Згодна з часткай сямнаццатай артыкула 85 Закона «О конституционном судопроизводстве» рашэнні Канстытуцыйнага Суда аб устараненні ў нарматыўных прававых актах прабелаў, выключэнні ў іх калізій і прававой нявызначанасці з'яўляюцца абавязковымі для разгляду дзяржаўнымі органамі, службовымі асобамі ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй.

1. На працягу 2016 года выканаы рашэнні Канстытуцыйнага Суда аб устараненні ў нарматыўных прававых актах прабелаў, выключэнні ў іх калізій і прававой нявызначанасці, прынятыя на падставе абзаца восьмага часткі трэцяй артыкула 22 Кодэкса аб судаўладкаванні і статусе суддзяў.

1.1. Так, у рашэнні ад 23 сакавіка 2010 г. «О равных гарантиях реализации права граждан на защиту от безработицы» Канстытуцыйны Суд прыйшоў да вываду аб тым, што заканадаўчае рэгуляванне адносін па спыненні працоўнага дагавора ў частцы вызначэння падстаў, якія ўплываюць на памер стыпендый і магчымасць назначэння дапамогі па беспрацоўі, мае патрэбу ва ўдакладненні, паколькі грамадзянам, якія адносяцца да адной і той жа катэгорыі (звольненыя з работы па прычынах, не звязаных з учыненнем імі вінаватых дзеянняў, і прызнаныя беспрацоўнымі), не забяспечваецца роўная абарона ад беспрацоўя, што не адпавядае прынцыпам роўнасці і справядлівасці.

Дадзенае рашэнне выканана шляхам прыняцця Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2016 года «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О занятости населения Республики Беларусь». У адпаведнасці з гэтым Законам з ліку асоб, якім названая стыпендыя назначаецца ў зменшаным памеры, і асоб, якім можа быць адмоўлена ў назначэнні дапамогі па беспрацоўі, выключаны шэраг катэгорый грамадзян, у тым ліку спыніўшых працоўны дагавор, заключаны на нявызначаны тэрмін, па жаданні работніка пры наяўнасці акалічнасцей, якія выключаюць або значна абцяжарваюць прадаўжэнне працы, а таксама ў выпадках парушэння наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага дагавора, пагаднення, працоўнага дагавора (артыкулы 23 і 24 Закона «О занятости населения Республики Беларусь»).

1.2. У рашэнні ад 26 красавіка 2016 г. «О праве на обжалование решений налоговых органов, действий (бездействия) их должностных лиц» Канстытуцыйны Суд канстатаваў, што адсутнасць у заканадаўстве Рэспублікі Беларусь у іншых асоб, чые правы і законныя інтарэсы закранаюцца рашэннем падатковага органа, у адрозненне ад асоб, вызначаных у артыкуле 85 ПК, права на абскарджанне такога рашэння абмяжоўвае іх права на судовую абарону, не забяспечвае справядлівасць судовага рашэння, у сувязі з чым не захоўваецца баланс публічна-прававых і прыватнаправавых інтарэсаў. У мэтах выканання канстытуцыйных прынцыпаў вяршэнства права і законнасці, рэалізацыі канстытуцыйнага права кожнага на судовую абарону Канстытуцыйны Суд прызнаў неабходным устараніць выяўлены прабел канстытуцыйна-прававога рэгулявання права на абскарджанне рашэнняў падатковых органаў, дзеянняў (бяздзейнасці) іх службовых асоб шляхам унясення адпаведных змяненняў і дапаўненняў у ПК.

Законам Рэспублікі Беларусь ад 18 кастрычніка 2016 года «О внесении изменений и дополнений в Налоговый кодекс Республики Беларусь» артыкул 85 ПК выкладзены ў новай рэдакцыі, згодна з якой кожная асоба мае права абскардзіць рашэнні падатковых органаў, у тым ліку патрабаванні (прадпісанні) аб устараненні парушэнняў, дзеянні (бяздзейнасці) іх службовых асоб, калі такая асоба мяркуе, што такія рашэнні або дзеянні (бяздзейнасць) парушаюць яе правы і (або) законныя інтарэсы.

2. Заканадаўцам улічаны таксама шэраг прававых пазіцый, якія змяшчаліся ў рашэннях Канстытуцыйнага Суда, прынятых у парадку абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці законаў.

2.1. Пры разглядзе ў парадку абавязковага папярэдняга кантролю канстытуцыйнасці Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 28 красавіка 2012 г. адзначыў, што норма артыкула 53 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь», якая дапускае магчымасць прымусовага спынення права ўласнасці (права валодання) на безгаспадарча ўтрымліваемую матэрыяльную гістарычна-культурную каштоўнасць, не ў поўнай меры адпавядае артыкулу 49 гэтага Закона і артыкулу 241 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, які ўстанаўлівае, што безгаспадарча ўтрымліваемыя культурныя каштоўнасці па рашэнні суда могуць быць адабраны ва ўласніка шляхам выкупу дзяржавай або продажу з публічных таргоў.

Указаная няўзгодненасць прававых норм устаранёна заканадаўцам у Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры ад 20 ліпеня 2016 года, пунктам 4 артыкула 71 якога прадугледжана, што парадак выкупу гістарычна-культурных каштоўнасцей, якія ўтрымліваюцца безгаспадарча, вызначаецца гэтым Кодэксам і грамадзянскім заканадаўствам, а пункт 4 артыкула 75 названага Кодэкса выкладзены ў адпаведнасці з нормай артыкула 241 Грамадзянскага кодэкса.

2.2. У рашэнні ад 26 снежня 2013 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О внесении дополнений и изменений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам правового положения иностранных граждан и лиц без гражданства в Республике Беларусь» Канстытуцыйны Суд указаў на неабходнасць выканання пункта 1 артыкула 3 Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або зневажаючых годнасць відаў абыходжання і пакарання ад 10 снежня 1984 года, згодна з якім не дапускаецца высылаць, вяртаць або выдаваць якую-небудзь асобу іншай дзяржаве, калі існуюць сур'ёзныя падставы меркаваць, што ёй можа пагражаць там прымяненне катаванняў, не толькі ў прымяненні да нормы часткі першай артыкула 171 Закона Рэспублікі Беларусь «О правовом положении иностранных граждан и лиц без гражданства в Республике Беларусь», але і пры рэалізацыі часткі другой гэтага артыкула, якая ўстанавіла некаторыя выключэнні з агульнага правіла.

Прававая пазіцыя Канстытуцыйнага Суда ўлічана ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2016 года «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам вынужденной миграции». Выкладзены дадзеным Законам у новай рэдакцыі артыкул 171 Закона «О правовом положении иностранных граждан и лиц без гражданства в Республике Беларусь» не прадугледжвае выключэнняў з правіла аб тым, што замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства не могуць быць выдвараны за межы Рэспублікі Беларусь у зарубежную дзяржаву, дзе ім пагражаюць катаванні.

2.3. У рашэнні ад 16 снежня 2015 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь» Канстытуцыйны Суд звярнуў увагу на тое, што згодна з часткай другой артыкула 36 Закона Рэспублікі Беларусь «О здравоохранении» судова-псіхіятрычная экспертыза праводзіцца ў мэтах устанаўлення псіхічнага стану асобы па крымінальных і грамадзянскіх справах, справах аб адміністрацыйных правапарушэннях, справах, звязаных з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасці, матэрыялах праверак па заявах (паведамленнях) аб злачынствах, а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Разам з тым артыкулам 31 Закона Рэспублікі Беларусь «Об оказании психиатрической помощи» выключаецца магчымасць правядзення судова-псіхіятрычнай экспертызы ў рамках гаспадарчага працэсу па справах, звязаных з прадпрымальніцкай і іншай гаспадарчай (эканамічнай) дзейнасцю, у той час як нормы Гаспадарчага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь дапускаюць магчымасць назначэння судом такой экспертызы ў неабходных выпадках пры разглядзе спраў.

Узнікшая ва ўказанай сітуацыі прававая няпэўнасць у заканадаўчым вызначэнні катэгорый спраў, па якіх можа праводзіцца судова-псіхіятрычная экспертыза, і ўстанаўленні магчымасці правядзення дадзенага віду экспертызы ў іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, запатрабавала карэкціроўкі заканадаўчых палажэнняў.

Законам Рэспублікі Беларусь ад 21 кастрычніка 2016 года «О внесении дополнения и изменений в Закон Республики Беларусь «О здравоохранении» ўдакладнена, што судова-псіхіятрычная экспертыза па эканамічных справах не праводзіцца, і тым самым забяспечана ўзгодненасць палажэнняў артыкула 36 Закона «О здравоохранении» з артыкулам 31 Закона «Об оказании психиатрической помощи».

2.4. Шэраг прававых пазіцый Канстытуцыйнага Суда, выкладзеных у рашэнні ад 8 ліпеня 2013 г. «О соответствии Конституции Республики Беларусь Закона Республики Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Гражданский процессуальный и Уголовно-исполнительный кодексы Республики Беларусь», рэалізаваны ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2016 года «О внесении изменений и дополнений в Уголовно-исполнительный кодекс Республики Беларусь».

2.4.1. У названым рашэнні Канстытуцыйны Суд прыйшоў да вываду аб наяўнасці калізіі норм ГПК і КВК, якія рэгулююць працэсуальныя тэрміны абскарджання асуджанымі да арышту і пазбаўлення волі ў судовым парадку рашэння службовай асобы папраўчай установы аб прымяненні да іх мер спагнання.

Дадзеная калізія ўстаранёна шляхам унясення ў артыкулы 61 і 113 КВК дапаўненняў, у адпаведнасці з якімі абскарджанне ў суд рашэння службовай асобы аб накладанні спагнання праводзіцца ў парадку, устаноўленым ГПК.

2.4.2. Канстытуцыйны Суд указаў таксама, што норма Закона Рэспублікі Беларусь «О внесении изменений и дополнений в Гражданский процессуальный и Уголовно-исполнительный кодексы Республики Беларусь» аб ажыццяўленні патрабаванняў аб спагнанні грашовых сум, што вынікаюць з абавязку асуджаных пакрыць урон (кампенсаваць шкоду), прычынены папраўчай установе ў выніку іх проціпраўных дзеянняў, шляхам учынення выканаўчага надпісу не ў поўнай меры ўлічвае норму Канстытуцыі, якая гарантуе судовую абарону правоў і свабод кожнаму (частка першая артыкула 60), паколькі для ўстанаўлення абавязку асуджанага пакрыць такі ўрон (кампенсаваць шкоду) неабходна даказванне ў тым ліку наяўнасці шкоды і яе памеру, проціпраўнасці дзеянняў асуджанага, прычыннай сувязі паміж гэтымі дзеяннямі і наступіўшай шкодай, што магчыма толькі ў выніку судовага вырашэння адпаведнага іску.

У мэтах устаранення выяўленай калізіі ў частку 2 артыкула 97 КВК унесена змяненне, якое выключае магчымасць ажыццяўлення патрабавання аб спагнанні з асуджаных грашовых сум для пакрыцця ўрону (кампенсавання шкоды), прычыненага папраўчай установе ў выніку іх проціпраўных дзеянняў, шляхам учынення выканаўчага надпісу.

2.4.3. У рашэнні Канстытуцыйнага Суда звернута ўвага заканадаўца і на тое, што пры ўстараненні прабелу ў заканадаўстве ў частцы магчымасці затрымання асуджанага да грамадскіх работ, які скрыўся з месца жыхарства і аб'яўлены ў вышук, не вызначаны месцы і парадак утрымання такіх асоб.

У выніку выкладання ў новай рэдакцыі часткі 2 артыкула 28 КВК атрымаў прававую рэгламентацыю шэраг пытанняў, у тым ліку ўстаноўлена, што затрыманы асуджаны змяшчаецца ў ізалятар часовага ўтрымання тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў.

2.5. Аналізуючы нормы Закона «О конституционном судопроизводстве», якія рэгулююць парадак разгляду ўпаўнаважанымі органамі паступіўшых ініцыятыўных зваротаў, Канстытуцыйны Суд у рашэнні ад 30 снежня 2013 г. акцэнтаваў увагу дадзеных органаў на тое, што, прымаючы рашэнне аб унясенні адпаведнай прапановы ў Канстытуцыйны Суд ці аб адмове ў яго ўнясенні, яны не маюць права падмяняць Канстытуцыйны Суд і разглядаць канстытуцыйнасць нарматыўнага прававога акта або яго асобных палажэнняў, а павінны вырашаць пытанне аб наяўнасці падстаў для ўнясення ў Канстытуцыйны Суд прапановы, калі ёсць сумненні ў канстытуцыйнасці прававых норм, праверка якіх у сілу палажэнняў артыкула 116 Канстытуцыі адносіцца толькі да кампетэнцыі Канстытуцыйнага Суда.

Дадзеная прававая пазіцыя ўлічана ў Законе ад 22 снежня 2016 года. Згодна з новай рэдакцыяй артыкула 28 Закона «О конституционном судопроизводстве» дзяржаўны орган, які разглядае ініцыятыўны зварот, не мае права рабіць вывад аб канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта; падставай для ўнясення прапановы ў Канстытуцыйны Суд з'яўляецца наяўнасць сумненняў упаўнаважанага органа ў канстытуцыйнасці такога акта.

Канстытуцыйны Суд звяртае ўвагу ўпаўнаважаных органаў на неабходнасць своечасовага і поўнага выканання рашэнняў Канстытуцыйнага Суда. Зацягванне працэсу выканання асобных яго рашэнняў, у якіх указвалася на дэфекты прававога рэгулявання, звязана з працяглым захаваннем у прававой сістэме норм, якія маюць прававыя прабелы, калізіі, прававую нявызначанасць, што на практыцы можа прывесці да парушэння правоў, свабод і законных інтарэсаў грамадзян.

У сувязі з гэтым Канстытуцыйны Суд лічыць мэтазгодным устанавіць на заканадаўчым узроўні канкрэтныя тэрміны выканання рашэнняў Канстытуцыйнага Суда, прынятых па выніках разгляду спраў аб устараненні ў нарматыўных актах прабелаў, выключэнні ў іх калізій і прававой нявызначанасці.

## V

1. Канстытуцыйны Суд адзначае, што згодна з афіцыйна выказанай пазіцыяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, ля вытокаў стварэння якой стаяла і Беларусь, вяршэнства права — гэта паняцце, што выступае як прынцып кіравання, у адпаведнасці з якім усе асобы, установы і структуры, дзяржаўныя і прыватныя, у тым ліку сама дзяржава, функцыянуюць пад дзеяннем законаў, якія публічна прыняты, у роўнай ступені выконваюцца, незалежна рэалізуюцца судовымі органамі і сумяшчальныя з міжнароднымі нормамі і стандартамі ў галіне правоў чалавека.

Для зацвярджэння вяршэнства права неабходны меры, якія забяспечваюць выкананне прынцыпаў прымату права, роўнасці і адказнасці перад законам, раздзялення ўлад, працэсуальнай і прававой транспарэнтнасці, недапушчэння самавольства.

Рэспубліка Беларусь, па ацэнцы незалежных міжнародных арганізацый, устойліва займае годнае месца ў глабальным рэйтынгу краін свету па індэксе вяршэнства права, якое ўключае такія кантрольныя паказчыкі, як абмежаванне паўнамоцтваў інстытутаў улады, адсутнасць карупцыі, парадак і бяспека, абарона асноўных правоў, празрыстасць інстытутаў улады, выкананне законаў, грамадзянскае і крымінальнае правасуддзе, апярэджваючы па дадзеным індэксе ўсе краіны, якія ўваходзяць у Садружнасць Незалежных Дзяржаў.

2. Канстытуцыйным Судом у 2016 годзе ў парадку абавязковага папярэдняга кантролю праверана 53 законы, прынятыя Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і адобраныя Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу, да іх падпісання Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, палажэнні якіх прызнаны ў цэлым адпаведнымі Канстытуцыі.

У той жа час пры ацэнцы канстытуцыйнасці норм законаў Канстытуцыйны Суд у шэрагу выпадкаў выявіў калізіі і прававую нявызначанасць асобных палажэнняў законаў, у сувязі з чым сфармуляваў у сваіх рашэннях адрасаваныя заканадаўцу прававыя пазіцыі, накіраваныя на ўстараненне дэфектаў прававога рэгулявання ў мэтах забеспячэння вяршэнства права, рэалізацыі канстытуцыйных палажэнняў у заканатворчай дзейнасці.

Пры гэтым выпрацаваны прававыя пазіцыі Канстытуцыйнага Суда і ў адрас органаў правапрымянення, якія арыентуюць на выкананне законаў з улікам выяўленага канстытуцыйна-прававога сэнсу, указваюць на недапушчэнне падмены на практыцы адной канстытуцыйнай каштоўнасці другой або іх прымяншэння.

3. Важнейшым індыкатарам забеспячэння вяршэнства права з'яўляюцца стабільнасць і паслядоўнасць заканадаўства, пры гэтым заканадаўчыя акты павінны быць здольныя адаптавацца да пераменлівых абставін і складваемай новай сітуацыі ў сацыяльна-эканамічным развіцці, адказваць правамерным чаканням грамадзян, суб'ектаў праваадносін, адпавядаць прынцыпу прадказальнасці.

Прыняцце заканадаўчых рашэнняў павінна грунтавацца на пачатках адкрытасці, транспарэнтнасці, даступнасці для абмеркавання, на ўсебаковым аналізе рэгулюючага ўздзеяння і ацэнкі вынікаў прыняцця прававых прадпісанняў.

Канстытуцыйны Суд лічыць неабходным на дзяржаўным узроўні выпрацаваць дзейсны механізм вывучэння і ацэнкі рэгулюючага ўздзеяння заканадаўчых актаў на дасягненне мэт сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця краіны.

4. Для зацвярджэння вяршэнства права неабходна разумнае забеспячэнне сістэмнасці і комплекснасці прававога рэгулявання адносін у розных сферах жыццядзейнасці грамадства і дзяржавы. Пры гэтым на ўзроўні законаў належыць пазбягаць залішняга прававога рэгулявання, празмернай дэталізацыі асобных палажэнняў і неапраўдана частай тэрміналагічнай карэкціроўкі.

Канстытуцыйны Суд лічыць, што ў сучасных умовах у мэтах далейшага павышэння эфектыўнасці заканадаўства трэба выпрацаваць новыя падыходы да кадыфікацыі, вызначыўшы крытэрыі прававога рэгулявання на ўзроўні законаў і ўзроўні падзаконных актаў.

5. Вяршэнства права прадугледжвае, што дзейнасць дзяржаўнай улады павінна быць накіравана на абарону годнасці асобы, якая з'яўляецца прыроджанай, неад'емнай і неадчужальнай уласцівасцю чалавека. Годнасць як важнейшая сацыяльна-культурная характарыстыка сутнасці чалавека, а таксама канстытуцыйна-прававая і маральна-этычная катэгорыя выступае адным са стрыжнёвых фактараў дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы.

Для забеспячэння абароны чалавека, яго правоў і свабод і гарантый іх рэалізацыі як найвышэйшай каштоўнасці і мэты грамадства і дзяржавы Канстытуцыйны Суд лічыць неабходным далейшае ўдасканальванне прававой рэгламентацыі доступу да канстытуцыйнага правасуддзя праз прэюдыцыяльны запыт судоў агульнай юрысдыкцыі аб канстытуцыйнасці нарматыўнага прававога акта, які падлягае прымяненню ў канкрэтнай справе.

6. Канстытуцыйны Суд, зыходзячы з сутнасці вяршэнства права, канстатуе, што інтэграцыйны працэс у рамках Еўразійскага эканамічнага саюза як міждзяржаўнага ўтварэння мае складаную і неадназначную палітыка-прававую прыроду. З аднаго боку, дзяржавы-члены дэлегуюць наднацыянальным органам права прыняцця рашэнняў, абавязковых для выканання ўсімі суб'ектамі міждзяржаўнага аб'яднання зыходзячы з міжнародна-прававога прынцыпу pacta sunt servanda (дагаворы павінны выконвацца). З другога боку, дзяржавы-члены атрымліваюць магчымасць пашыраць сферу свайго знешнепалітычнага ўплыву для прасоўвання нацыянальных інтарэсаў, у тым ліку ў эканамічна выгадных мэтах, дасягненне якіх магчыма толькі сумеснымі намаганнямі.

Пры гэтым для забеспячэння вяршэнства Канстытуцыі ва ўмовах фарміравання наднацыянальнага права патрабуецца рэальны механізм гарантый выканання прынцыпу субсідыярнасці ў зносінах з наднацыянальнымі органамі. У мэтах дасягнення гарманічнага спалучэння і балансу наднацыянальных і нацыянальных інтарэсаў неабходна на дзяржаўным узроўні распрацаваць канцэпцыю ўніфікацыі заканадаўства ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза.

7. Вяршэнства права як базавы прынцып сучаснай цывілізацыі, міжнароднага правапарадку і ўніверсальная гуманістычная каштоўнасць знаходзіцца ў аснове беларускай канстытуцыйна-прававой дактрыны, практычнай дзейнасці органаў дзяржаўнай улады па ўмацаванні канстытуцыйнай законнасці.

Забеспячэнне і прытрымліванне вяршэнства права з'яўляюцца гарантыяй развіцця дэмакратыі, рэалізацыі правоў і свабод чалавека, зацвярджэння Рэспублікі Беларусь як дэмакратычнай прававой дзяржавы.

*Гэта Пасланне прынята на пасяджэнні Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь 18 студзеня 2017 г.*

**Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П.П. МІКЛАШЭВІЧ.**

*18 студзеня 2017 г.*

*г. Мінск.*

■ Агульны прырост

# НАШЫ І ВАШЫ

## Колькасць мігрантаў, якія застаюцца жыць у Беларусі, узрастае

**Замежнікі, якія вучацца ў нашых ВНУ, могуць заставацца працаваць у Беларусі. Больш таго, для прыцягнення замежных спецыялістаў на работу ў рэгіёны для іх ствараюцца льготныя ўмовы. Такім чынам на дзяржаўным узроўні вызначаюць аб'ёмы, кірункі і якасны склад міграцыйных патокаў, якія, між іншым, актыўна ўплываюць на колькасць і структуру мясцовага насельніцтва.**

У любой краіне ёсць агульны прырост насельніцтва, а ёсць — натуральны, што складваецца з розніцы паміж смяротнасцю і нараджальнасцю. Прыбыццё мігрантаў кампенсуе натуральныя страты і нават садзейнічае прырасту нацыі. У прыватнасці, за апошнія 10 гадоў чвэрць колькасці памерлых беларусаў замянілі мігранты.

— Колькасць мігрантаў, якія застаюцца жыць у Беларусі, узрастае з 2009 года, а ў 2013 годзе сальда міграцыі склала звыш 11,5 тысячы чалавек і ўпершыню перавысіла значэнне натуральных страт насельніцтва, — расказаў **Эдуард БАЛАНДЗІН, намеснік начальніка ўпраўлення па міграцыі і рабоце з замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства ДГіМ МУС Беларусі.** — Цяпер у краіне пастаянна пражывае больш за 180 тысяч мігрантаў — яны ўжо амаль такія ж грамадзяне, як і беларусы, толькі не могуць галасаваць. Сёлета за першае паўгоддзе было выдадзена 626 дазволаў на пастаяннае пражыванне.

Паняцце «працоўныя мігранты» — актуальнае для Беларусі. Людзі, якія прыехалі ў нашу краіну на працу, лічацца тут часова пражываючымі — такіх у рэспубліцы каля 60 тысяч чалавек. Як толькі тэрмін іх знаходжання тут заканчваецца, дазвол на пражыванне і працу можна працягнуць далей. Калі мігрант застаецца на другі год, ён трапляе ў лік міграцыйнага прыросту насельніцтва Беларусі.

Стратэгічны кірунак праграмы знешняй міграцыі ў Беларусі — стварэнне ўмоў для мэтавага прыцягнення мігрантаў, якія здольны павялічыць і палепшыць якасць чалавечага патэнцыялу краіны, зазначыў Эдуард Баландзін, акрэсліўшы задачы на 2016—2020 гг.

Перш за ўсё гэта прыцягненне замежных спецыялістаў у рэгіёны Беларусі з улікам патрэб у сферы дэмаграфічна-эканамічнай сітуацыі. Каб заахвоціць такіх людзей, ім і членам іх сем'яў кампенсуюцца затраты на пераезд і працаўладкаванне. За першую палову гэтага года кампенсацыю атрымаў 421 іншаземец. Найбольш актыўна прыцягваюць работнікаў на пастаяннае месца жыхарства Брэсцкая, Віцебская і Гомельская вобласці.

— Каб заахвоціць да прыезду ў краіну высокакваліфікаваных замежных спецыялістаў, ім ствараюцца льготныя ўмовы, і гэта агульнапрызнаная сусветная практыка, — падкрэсліў прадстаўнік МУС Беларусі. — Ім патрабуецца меншая колькасць папер для легалізацыі на тэрыторыі Беларусі. Часам, хапае нават аднаго хадайніцтва ад прадпрыемства, куды накіроўваецца работнік.

Сярод актуальных задач праграмы знешняй міграцыі — прыняцце мер аб замацоўванні ў краіне адукаванай моладзі, у тым ліку і замежнай. Сёлетнія папраўкі ў міграцыйнае заканадаўства дазваляюць замежным студэнтам, якія скончылі ВНУ ў Беларусі, адпрацаваць пэўны тэрмін па спецыяльнасці ў нашай рэспубліцы, пасля чаго прадоўжыць сваё знаходжанне на тэрыторыі. У сваю чаргу, плануецца скіраваць увагу на айчынных адукаваных спецыялістаў, якія пражываюць за мяжой, і ствараць ім прывабныя ўмовы для вяртання на радзіму.

**За першае паўгоддзе 2016-га на працу па кантракце ў Беларусь прыехалі 9,5 тысячы замежных грамадзян, у асноўным кітайцаў і ўкраінцаў. Большасць з іх (5,5 тысячы) — рабочых спецыяльнасцяў, 2,3 тысячы — кваліфікаваныя работнікі, крыху больш за 600 чалавек прыбылі ў сельскую гаспадарку, каля 600 — кіраўнікі і 480 плануюць працу ў сферы абслугоўвання.**

Згодна з афіцыйнай статыстыкай, у 2015 годзе ў Беларусь прыехалі амаль 32 тысячы чалавек, а крыху больш за 6 тысяч выехалі. Аднак гэта толькі тыя, хто афіцыйна пацвердзіў свой прыезд і ад'езд на працу. «Дакладную лічбу атрымаць нельга, — дадаў Эдуард Баландзін. — Паколькі айчыннае заканадаўства не забараняе беларусу самому знайсці працу за мяжой і з'ехаць на сваю рызыку».

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54. Тел. + 375 (214) 41-72-95, тел./факс 41-80-30 |

**Предмет аукциона**

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел.руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 01121 | Автомобиль VAZ 21074 (рег. знак 8653 ВА) | 205,80 | 10,29 |
| 2 | 01134 | Автомобиль ЗИЛ131В1 (рег. знак ВА 9511) | 966,00 | 48,30 |
| 3 | 01001 | Автомобиль КАМАЗ 5410 (рег.знак 6804 ВТП) | 966,00 | 48,30 |
| 4 | 01138 | Автомобиль GAZ-3302 (рег. знак АЕ 3412-2), 2006 г.в. | 2 217,60 | 110,88 |
| 5 | 01127 | Автомобиль ГАЗ 33073 (рег. знак 7886 ВТР), 1993 г.в. | 785,40 | 39,27 |
| 6 | 01067 | Автомобиль GAZ-52 (рег. знак ВА 9631) | 529,20 | 26,46 |
| 7 | 01016 | Автомобиль GAZ-5312 (рег. знак АА 9426-2) | 646,80 | 32,34 |
| 8 | 01005 | Автомобиль ЗИЛ 131 (рег. знак ВА 2045), 1977 г.в. | 1 419,60 | 70,98 |
| 9 | 01078 | Автомобиль МЗКТ 74171 (рег.знак АЕ 1057-2), 2009 г.в. | 18 089,40 | 904,47 |
| 10 | 03324 | Бульдозер Б10 М0111-1В (рег. знак 50), 2006 г.в. | 5 166,00 | 258,30 |
| 11 | 02218 | Кран башенный БМ-401П, 2010 г.в. | 83 958,00 | 4 197,90 |
| 12 | 02500 | Захват 1ПТМ 791170г/п 10т, 2008 г.в. | 504,00 | 25,20 |
| 13 | 02501 | Захват 2ПТМ 791170г/п 5т, 2008 г.в. | 630,00 | 31,50 |
| 14 | 03454 | Дизмолот сваебойный МСДШ, 2008 г.в. | 6 636,00 | 331,80 |
| 15 | 01066 | Автобетоносмеситель СМБ-372 (АВ 2642-2), 2008 г.в. | 15 463,00 | 773,15 |
| 16 | 01070 | Автобетоносмеситель СМБ-372 (АВ 7110-2), 2008 г.в. | 16 578,80 | 828,94 |
| 17 | 01158 | Автомобиль МАЗ 6422А8 (рег.знак АА 6092-2), 2008 г.в. | 7 980,00 | 399,00 |
| 18 | 01151 | Автотопливозаправщик на базе ГАЗ 33073 (рег.знак АА 9401-2), 2007 г.в. | 10 248,00 | 512,40 |
| 19 | 01156 | Автобус Неман 52012 030 (рег.знак АВ 2512-2), 2008 г.в. | 19 698,00 | 984,90 |
| 20 | 01068 | Автобетоносмеситель СМБ-372 (рег.знак AI 0955-2), 2008 г.в. | 23 485,0 | 1 174,25 |
| 21 | 02404 | Автокран КС-55727-7 МАЗ 6303А3 (рег.знак АВ 5439-2), 2008 г.в. | 39 998,5 | 1 999,93 |
| 22 | 02406 | Автокран КС-55727-7 МАЗ 6303А3 (рег.знак АВ 9479-2), 2009 г.в. | 49 345,5 | 2 467,28 |
| 23 | 01153 | Автомобиль ГАЗ 31105 (рег.знак 2224ВА-2), 2007 г.в. | 2 594,0 | 129,70 |
| 24 | 01141 | Автомобиль МАЗ 543203-220 (рег. знак АА 5802-2), 2006 г.в. | 3 180,0 | 159,00 |
| 25 | 03326 | Бульдозер Б 10М 0111 (рег.знак 8965ВМ), 2008 г.в. | 12 696,0 | 634,80 |
| 26 | 03325 | Бульдозер Б 10М 0111-1В (рег.знак ВА-2 4815), 2006 г.в. | 12 696,0 | 634,80 |
| 27 | 03327 | Бульдозер на базе трактора ДТ-75 (рег.знак ВА 3434), 2007 г.в. | 6 240,0 | 312,00 |
| 28 | 03328 | Бульдозер на базе трактора ДТ-75 (рег.знак ВА 3457), 2006 г.в. | 31 006,0 | 1 550,30 |
| 29 | 03311 | Бурильно-крановая машина БМ-205Д на базе трактора МТЗ-82 (рег. знак 8956 ВМ), 2008 г.в. | 16 347,5 | 817,38 |
| 30 | 02217 | Кран башенный КБМ-401П, 2010 г.в. | 134 940,0 | 6 747,00 |
| 31 | 01506 | Полуприцеп МАЗ 938662 (рег.знак А0634А-2), 2006 г.в. | 1 842,0 | 92,10 |
| 32 | 03534 | Установка копровая для заб.свай на базе Т-10МБ 21-21-0 ВА-2 67-46 | 89 400,0 | 4 470,00 |
| 33 | 03291 | Экскаватор ЭК-12 (рег.знак ВА 8048), 2006 г.в. | 7 689,5 | 384,48 |
| 34 | 03288 | Экскаватор ЭК-12 (рег.знак ВА-2 8015), 2005 г.в. | 7 110,0 | 355,50 |
| 35 | 04046 | Каток вибрационный ДС-1 | 17 724,00 | 886,20 |
| 36 | 04047 | Асфальтоукладчик RP 451L BX 87-05 | 38 220,00 | 1 911,00 |

**Порядок ознакомления:** ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 12-00 до 13-00. Ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон +375292121501

**Предмет аукциона**

**Оборудование, расположенное по адресу:** Витебская область, Полоцкий район, Экиманский с/с, 0,3 км к востоку от д. Ксты, в составе:

| № лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год изготовления | Начальная стоимость, бел.руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел.руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 37 | 05105 | Станок сверлильный СМ-8П, 1993 г. | 224,35 | 11,22 |
| 38 | 05106 | Станок сверлильный СМ-8П, 1993 г. | 224,35 | 11,22 |
| 39 | 05041 | Стенд профилактический «Star 12F», 1989г. | 913,85 | 45,69 |
| 40 | 04003 | Компрессор «Индия» мод. С 06010, 1989 г. | 520,10 | 26,01 |
| 41 | 05081 | Станок СУН-1 (механическая пила), 1992 г. | 586,25 | 29,31 |
| 42 | 05091 | Станок точильно-шлифовальный Т-400, 1992 г. | 402,15 | 20,11 |
| 43 | 05156 | Сварочный аппарат Jasic ARC-315, 2007г. | 236,25 | 11,81 |
| 44 | 05158 | Молот ковочный МА 4129А, 1991 г. | 1 355,90 | 67,80 |
| 45 | 00085 | Газоанализатор «Инфракар» 08.01, 2009 г. | 208,25 | 10,41 |
| 46 | 00086 | Измеритель дымности отработавших газов МЕТА-01 МП.01, 2009 г. | 207,55 | 10,38 |
| 47 | 40018 | Трансформатор ТСЗИ 380/36, 1993 г. | 45,50 | 2,28 |
| 48 | 41218 | Станок СМЖ-172 (ножницы для резки арматурной стали), 2006 г. | 694,75 | 34,74 |
| 49 | 05155 | Сварочный аппарат THMIG-200, 2007 г. | 175,35 | 8,77 |
| 50 | 42021 | Выпрямитель дуговой сварки ВДМ-1202С, 2007 г. | 477,75 | 23,89 |
| 51 | 40015 | Сварочный аппарат ВДМ-1201, 1991 г. | 323,40 | 16,17 |
| 52 | 41039 | Станок правильно-отрезной И61-22, 1991 г. | 2 872,80 | 143,64 |
| 53 | 42069 | Станок точечной сварки МТ16/18, 1991 г. | 1 184,40 | 59,22 |
| 54 | 42022 | Полуавтомат дуговой сварки ПДГ-351, 2007 г. | 655,20 | 32,76 |
| 55 | 44170 | Станок деревообрабатывающий ФСШ-1А (К), 2005 г. | 1 491,00 | 74,55 |
| 56 | 44171 | Станок деревообрабатывающий ЦТ-10/5м, 2005 г. | 1 348,20 | 67,41 |
| 57 | 44092 | Станок рейсмусовый МП-9-1695, 1998 г. | 2 864,40 | 143,22 |
| 58 | 44174 | Станок ленточнопильный «ПЛП-Астра-ЕС», 2006 г. | 6 073,20 | 303,66 |
| 59 | 41229 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 263,20 | 13,16 |
| 60 | 41230 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 263,20 | 13,16 |
| 61 | 41231 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 263,20 | 13,16 |
| 62 | 44227 | Матрица С-640 с пневмопрессом, 2009 г. | 1 016,40 | 50,82 |
| 63 | 44087 | Станок деревообрабатывающий «Лучеса» УОДМ-1, 1992 г. | 483,00 | 24,15 |
| 64 | 44088 | Станок заточной ВШ-027 РЭ, 1992 г. | 297,50 | 14,88 |
| 65 | 41222 | Станок автоматический режущий Метеор-1, 2009 г. | 1 407,00 | 70,35 |
| 66 | 41223 | Станок пневматический фрезерный GALAXU-1, 2009 г. | 1 163,40 | 58,17 |
| 67 | 41224 | Станок автоматический фрезерный POLAR-IV, 2009 г. | 814,80 | 40,74 |
| 68 | 41225 | Станок для прессовки углов APEX, 1989 г. | 3 095,40 | 154,77 |
| 69 | 41228 | Станок для зачистки углов профиля КТ-504/2, 2009г. | 2 121,00 | 106,05 |
| 70 | 41232 | Пресс пробивочный однопозиционный ПР 235, 2010 г. | 263,20 | 13,16 |
| 71 | 41226 | Двухголовочный сварочный станок DZW-500, 2009 г. | 6 669,60 | 333,48 |
| 72 | 04010 | Передвижная компрессорная станция ПКСД5-25, 2005 г.в. | 3 660,00 | 183,00 |
| 73 | 04011 | Передвижная компрессорная станция ПКСД5-25, 2007 г.в. | 4 080,00 | 204,00 |
| 74 | 31801 | Агрегат сварочный АДД 4003, 2000 г.в. | 2 280,00 | 114,00 |
| 75 | 31800 | Агрегат сварочный АДД 4002 М2, 2006 г.в. | 2 640,00 | 132,00 |
| 76 | 31799 | Агрегат сварочный АДД 4002 М2 | 3 696,00 | 184,80 |
| 77 | 41076 | Снегоуборочная машина HONDA | 2 688,00 | 134,40 |
| 78 | 40221 | Парогазогенератор ПГГ-2 | 3 024,00 | 151,20 |
| 79 | 41220 | Установка для резки (гильотина) НГ 13 | 8 233,40 | 411,67 |
| 80 | 41227 | Автоматический станок для резки штапика СКY-501 | 2 039,10 | 101,96 |
| 81 | 44175 | Станок для холодной гибки труб ТГС-5 | 3 346,70 | 167,34 |
| 82 | 41072 | Электропогрузчик Toyota 7FBE15, 2006 г.в. | 5 832,00 | 291,60 |
| 83 | 41073 | Электропогрузчик Toyota 7FBE15, 2006 г.в. | 5 832,00 | 291,60 |
| 84 | 41037 | Станок заточной М-405, 1991 г.в. | 360,00 | 18,00 |
| 85 | 41047 | Молот пневматический МА 4129А, 1988 г.в. | 2 040,00 | 102,00 |
| 86 | 41219 | Автомат проволочно-гвоздильный АВ 4116, 1996 г.в. | 1 920,00 | 96,00 |
| 87 | 43079 | Сушильный шкаф СНОЛ 3.5, 1997 г.в. | 237,00 | 11,85 |
| 88 | 43080 | Сушильный шкаф SNOL 67/350, 2010 г.в. | 470,00 | 23,50 |
| 89 | 47197 | Машина испытательная ИП-100, 1994 г.в. | 2 529,00 | 126,45 |
| 90 | 47225 | Разрывная машина Р-50, 2001 г.в. | 5 454,00 | 272,70 |
| 91 | 70223 | Шкаф металлический, 2000 г.в. | 134,00 | 6,70 |
| 92 | 00508 | Влагомер МГ 4-У, 2007 г.в. | 565,50 | 28,28 |
| 93 | 00512 | Измеритель прочности ИПС -МГ4.01, 2005 г.в. | 517,50 | 25,88 |
| 94 | 42076 | Емкость под известь V – 10, 1995 г.в. | 833,00 | 41,65 |
| 95 | 05038 | Топливораздаточная колонка «Нара 27М1С», 2009 г.в. | 926,50 | 46,33 |
| 96 | 05039 | Топливораздаточная колонка «Нара 27М1С», 2009 г.в. | 926,50 | 46,33 |
| 97 | 40024 | Установка прогрева бетона КТП ТО 80-86 У1, 1996 г.в. | 688,50 | 34,43 |
| 98 | 40025 | Установка прогрева бетона КТП ТО 80-86 У1, 1996 г.в. | 688,50 | 34,43 |
| 99 | 42019 | Выпрямитель ВД-306 М1У3, 2006 г.в. | 305,50 | 15,28 |
| 100 | 42020 | Выпрямитель V-160 S, 2006 г.в. | 170,00 | 8,50 |
| 101 | 70191 | Контейнер одноблочный, 1995 г.в. | 114,50 | 5,73 |
| 102 | 06103 | Блок-контейнер | 2 552,20 | 127,61 |
| 103 | 8907 | Блок-контейнер «Душевые кабины женские» | 5 020,40 | 251,02 |
| 104 | 8909 | Блок-контейнер «Душевые кабины мужские» | 2 552,20 | 127,61 |
| 105 | 8910 | Блок-контейнер | 2 552,20 | 127,61 |
| 106 | 8911 | Блок-контейнер | 2 552,20 | 127,61 |
| 107 | 04083 | Кран КЛ-1, 1990 г.в. | 651,00 | 32,55 |
| 108 | 04097 | Машина паркетошлифовальная СО 206М, 2008 г.в. | 613,00 | 30,65 |
| 109 | 04103 | Камнерезный станок BS-350, 2010 г.в. | 1 013,00 | 50,65 |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** WWW.CPO.BY

**Порядок ознакомления:** ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 13-00 до 14-00. **По лотам №№37-46** ответственное лицо: Абловацкий Петр Владимирович, ведущий механик, контактный телефон: +375292121501. **По лотам №№47-100** ответственное лицо: Зызников Виктор Иванович, заведующий базой, контактный телефон +375336774509. **По лотам №№101-109** ответственное лицо Тукиш Валентина Евгеньевна, завхоз, контактный телефон +3753333465090

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** при цене продажи предмета аукциона в сумме до 49 999,99 BYN – срок оплаты не более **10** (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи.
При цене продажи предмета аукциона в сумме свыше 50 000,00 BYN – срок оплаты не более **20** (двадцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 06.01.2017

**Дата и время проведения аукциона: 13.02.2017 в 13.00 по адресу: РУП «СМТ №22», Витебская обл., г. Полоцк, ул. Шенягина, д. 54, актовый зал**

**Дата и время окончания приема документов: 09.02.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.**
**Email: auction@cpo.by**

# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** Адвячорак. Ледабур. Ура. Пахвала. Табу. Жэле. Марка. Араб. Аборка. Рэестр. Аул. Адценне. Бос. Тры. Аркан. Камар. Ака.

**Па вертыкалі:** Вілка. Чадра. Ажур. Экіпаж. Бурак. Рагу. Веер. Ламбард. Трыо. Баркун. Лавец. Грыбнік. Ранетка. Алешына. Тамбур. Цясак. Рак.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.06 | 17.39 | 8.33 |
| Віцебск — | 9.01 | 17.24 | 8.23 |
| Магілёў — | 8.56 | 17.29 | 8.33 |
| Гомель — | 8.46 | 17.32 | 8.46 |
| Гродна — | 9.20 | 17.55 | 8.35 |
| Брэст — | 9.15 | 18.02 | 8.47 |

## Месяц

***Маладзік 28 студзеня. Месяц у сузор'і Казярога.***

## Імяніны

***Пр.*** *Елізара, Пятра, Якава.* ***К.*** *Ванды, Паўліны, Палікарпа, Цімафея, Ціта.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




# Даты Падзеі Людзі

## 26 СТУДЗЕНЯ

**1651** год — нарадзіўся Ілья Фёдаравіч Капіевіч, беларускі асветнік, кнігавыдавец. У 9-гадовым узросце быў вывезены ў Цвярскі край, адкуль збег у Маскву. Праз 6 гадоў вярнуўся на радзіму. Але яго радавы маёнтак трапіў ва ўласнасць касцёла, а сам Капіевіч быў абвінавачаны ў здрадзе каралю, таму быў вымушаны эмігpаваць на Захад. З сярэдзіны 1660-х жыў у Галандыі, дзе пазнаёміўся з рускім царом Пятром I і стаў яго паплечнікам. У 1698 — 1706 гадах склаў, пераклаў і выдаў каля 20 кніг (у асноўным навучальнага характару) па гісторыі, арыфметыцы, ваеннай і марской справе, лацінскай і рускай граматыцы, руска-лацінска-нямецкія слоўнікі і інш. Выдаваў кнігі ў розных друкарнях, у тым ліку ва ўласных (Амстэрдам і Капенгаген). Пераклаў і выдаў байкі Эзопа. Аўтар першай зорнай карты на рускай мове. Памёр у 1714 г.

**1907** год — дата нараджэння Ганса Селье, канадскага біёлага, псіхолага, які сфармуляваў канцэпцыю стрэсу. Селье разглядаў фізіялагічны стрэс як адказ на любыя прад'яўленыя арганізму патрабаванні і лічыў, што з якой бы цяжкасцю ні сутыкнуўся арганізм, з ёй можна справіцца двума тыпамі рэакцый: актыўнай, або барацьбой, і пасіўнай, або ўцёкамі ад цяжкасцяў ці гатоўнасцю цярпець іх.

**1947** год — нарадзілася (г. Чарнаўцы, Украіна) Святлана Арцёмаўна Акружная, актрыса, народная артыстка Беларусі. Працуе ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа. Сярод роляў: Анютка («Улада цемры» Л. Талстога), Таня



(«Развітанне ў чэрвені» А. Вампілава), Вольга («Стары дом» А. Казанцава) і іншыя. Аўтар кнігі «Жыццё пражыць — і каб сэрца не разбілася».

**1954** год — нарадзіўся Уладзімір Іванавіч Жбанаў, беларускі скульптар. Працаваў у галіне манументальнай і станковай скульптуры. Сярод твораў: помнік воінам-інтэрнацыяналістам у г. Светлагорску Гомельскай вобласці, бюсты Ю. Гагарына, М. Горкага, кампазіцыі «Жаночы эцюд», «Экзамен», «Восенські пацалунак» і іншыя. Творы скульптара знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, у музеі сучаснага мастацтва ў Мінску. Памёр у 2012 годзе.

**1990** год — Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон «Аб мовах у Беларускай ССР», у адпаведнасці з якім беларуская мова абвешчана дзяржаўнай.

## Было сказана

**Сяргей ГРАХОЎСКІ, паэт:**

*«І кожнага ў свеце дарога*
*Вядзе да апошняй вярсты,*
*Таму не шкадуй ні для кога*
*Сваёй дабраты».*

## УСМІХНЕМСЯ

Боршч — ён як кунг-фу. Ты можаш гатаваць яго ўсё жыццё, але так і не дасягнеш узроўню бабулі.

**Настаўніца пытае ў Вовачкі:**

**— Вовачка, скажы шчыра, хто зрабіў за цябе хатняе заданне?**

**— Не ведаю, Марыя Іванаўна, я ўжо спаў.**

Таксама нядрэнна... Падумала я, кінуўшы тапак у ката, а патрапіўшы мужу ў лоб.

**У загсе:**

**— Дарагі, перад вяселлем я б хацела прызнацца табе ва ўсіх грахах!**

**— Так, але ты ж тыдзень таму ўжо прызналася?!**

**— Ну-у, ёсць свежыя звесткі...**




Малюнак Пятра КОЗІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 302.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 25 студзеня 2017 года.